НАША НІВА

Беларуская газэта *№7, 1994*

ТЭМА гэтага нумару «НН» — акупацыя. Міжнароднае права вызначае статус акупацыі, які для акупаванай краіны і нацыі азначае пэўныя льготы й выгоды. Можна ня ведаць пра іх, можна не карыстацца імі, можна фанабэрыста адмаўляць той факт, што ты, твая краіна і твой народ — пад акупацыяй. Але каму ад гэтага лепей?

РАДЗІВІЛЫ. Гэты найбагацейшы ў Эўропе беларускі княскі род назапасіў у свой час вялізныя скарбы. У 1812 годзе расейская армія вывезла зь Нясьвіжа ўсё, што толькі магла забраць. Легенда кажа, што перад тым Радзівілы закапалі свой скарб, у тым ліку 12 залатых апосталаў... Пра тое, што адбылося на самой справе, — артыкул гісторыка С.Рыбчонка.

НАЦЫЯНАЛІЗМ. «Ці нацыяналізм — гэта галоўная пагроза для міру ў Эўропе? Не. Такая пагроза — недахоп усталяванага спосабу мірнага самастанаўленьня народаў».

НЯМЕЦКАЯ НАВЭЛА. Чатыры апавяданьні сучасных пісьменьнікаў з Заходняй Нямеччыны. Эрых Кэстнэр, Зыгфрыд Ленц, Макс Фрыш, Пэтэр Гандкэ.

АКУПАЦЫЯ

Здымак з архіву Міхася Раманюка

ХАМ. Спрэчка з Славамірам Мрожакам у мінулым нумары «НН»: «Патэнцыяльна мы ўсе хамы ў вачох іншых. Мы ўсе баімся неразуменьня, неадлаведнай, сьвядома варожай інтэрпрэтацыі нашых словаў і ўчынкаў. Хама не зварушвае ніводзін лад, нават камунізм — як хацеў бы Мрожак. Хам — гэта прадукт рэвалюцыі, гвалтоўных пераўтварэньняў. Памеры хама — гэта мера гвалтоўнасьці, але й мера посьпеху перамен, аднак ні ў якім выпадку — ня мера вартасьці асобных людзей, падвержаных пераменам».

КАЗКІ пра кандыдатаў. Пазашкольная чытанка па найноўшай беларускай гісторыі.

ЖЫДОЎСКІ ГУМАР. У даваеннай Беларусі, Літве й Польшчы жыды былі асноўнымі насельнікамі мястэчак і гарадоў і стварылі, між іншым, цэлую сваю тутэйшую культуру, у тым ліку і гумар, узоры якога публікуюцца ў гэтым нумары «НН».

ДЗЯДЗЬКА МІХАСЬ

Сяргей Мацёры

Чалавек заўсёды адзін. Калі ён гуртуецца ў суполкі, ён ужо ня сам па сабе чалавек. У статку ходзяць толькі маткі і дзеці. Але дзік ці зубар заўсёды адзін. Аднак, калі забіваюць адзінца, скончаецца й ягонае племя.

Так казаў дзядзька Міхась.

Пятнаццаць гадоў таму ў лесе каля Доўскай шашы працавала падпольная беларуская школа. Мы даяжджалі сюды аўтобусам, а потым ішлі праз лес па адным. Была позьняя восень, і падаў першы сьняжок. Мы йшлі не па сьцежках, а проста па жухлым імху, каб не пакідаць сьлядоў. Каля вогнішча на паляне нас чакаў настаўнік дзядзька Міхась. Ён заўсёды быў у гімнасьцёрцы й зашоханым курцяку. Ніхто ня ведаў, адкуль ён узяўся, і не пыталіся пра гэта.

— Мова свая, калі ты сам свой, — казаў дзядзька Міхась. Каб адчуваць мову, трэба адчуваць сваю кроў.

Адчуваньне прыходзіла хутка. Мы былі вучаныя па-расейску і таму цяпер паўтаралі, як малітву: адзін цень, адзін боль, адзін сабака. Гэта было выпрабаваньне мужчынскага роду.

Дзядзька Міхась загінуў першы. Нехта навёў на школу гэбістаў, і міліцыя зрабіла аблаву. А дзядзька Міхась меў паляўнічую стрэльбу. Яны абступілі яго, і ён, не прамовіўшы ані слова, стрэліў у неба. Гэтага было дастаткова, каб нехта стрэліў у яго. З таго дня перастала існаваць наша лясная школа.

— «Адзін» гучыць так толькі па-беларуску, — казаў дзядзька Міхась. — Як першы званок ці як куля аб шкло — «дзін-н-н»...



Дзёньнік прыватнага чалавека

* * *

Калі закранаеш у «Нашай Ніве» «брудныя» тэмы чужаніцы, хама, акупацыі, на руках непазьбежна застаюцца сьляды. Ужо ўсе рукі вымазаныя гэтым. І якую новую тэму ня возьмеш, пакідаеш на ёй адбіткі. Надыходзіць час, калі ўсё навокал цябе перамазана і ўсё, што ты ні прыносіш сюды, — таксама. І калі ты стомлена прысядаеш на крэсла, то бачыш, што ўсё вакол цябе замурзанае, але... Усё так і ёсьць. Гэта наш сьвет, адлюстраваны ў «НН». Гэта сьвет, які ты спасьцігаеш. Сьвет-невідзімка, які ты маляваў сабе ва ўяўленьні чыстымі фарбамі, дзякуючы брудным плямам набывае свае абрысы. Гэта твой сьвет — бачны і ўжо крыху зразумелы.

* * *

Сябра-літовец зьвярнуў увагу на тое, што 80-гадовая беларуская бабуля, да якой мы езьдзілі ў падвіленскую вёску, ажно *сьвеціцца* дабрынёю, як сонца. А вось ягоная 80-гадовая бабуля, якую ён нядаўна забраў з Коўна — злая, меркантыльная, эгаістычная. Я стаў думаць пра прыроду гэтага «сьвячэньня». Калі розьніца тут ня толькі ў чалавечых якасьцях, ня толькі ў тым, што адна — у вёсцы (хоць усё жыцьцё пры Вільні), а другая — у горадзе, — то ў чым яшчэ? Абедзьве ўсё жыцьцё пражылі пры нацыянальнай ідэі, спрычыніліся да яе, сталі яе жывымі праваднікамі. Толькі ў літоўкі была яшчэ літоўская дзяржава, а ў беларускі — гімназія, клюбы, музэй, друк, сябры... дзяржавы не было. Шчырае патрыятычнае пачуцьцё бабулі майго сябра мусіла прыняць адназначны дзяржаўны ідэал разам з тым няправедным, што ўчынялася ў маладой і маленькай (гэта як апраўданьне) сваёй дзяржаве. Адзінства нацыі — як адзіны для яе сродак выжыць сярод буйных драпежных імпэрыяў — вымагала праглынуць без камэнтароў і ўласны бюракратызм, і зайздрасьць у абмежаваным асяродку, і крыўду іншародцаў, і нават зьнішчэньне супляменьнікамі жыдоў... Магчыма, бяз гэтых «горкіх глыткоў» літоўцы ня выжылі б як нацыя. Але бабуля майго сябра пасьля такіх «пігулак» проста ня можа сьвяціцца дабрынёю, як сонца. Мне ж усё гэта патрэбнае як досьвед. Дзяржаўнасьць мацуе нацыю, але непазьбежна робіць яе цынічнай. Беларусаў таксама чакае драматычная эвалюцыя нацыянальнага патрыятызму ў патрыятызм нацыянальна-дзяржаўны. Ідэалы зьдзяйсьняюцца зусім не ідэальна, пасьля чаго як такія прападаюць. І таму я думаю: ці будуць сьвяціцца дабрынёю бабулі майго пакаленьня?

* * *

У Беларусі ўсё часьцей чуваць розныя славянскія саборы, саюзы афіцэраў, народныя рухі... Словам — інтэрфронт, людзі прышлыя, прывезеныя, засланыя, назначаныя, вылучаныя на нашу зямлю аднекуль звонку. Яны, ахвяры імпэрыі, клічуць цяпер сваю матку. Яны — зязюльчыны дзеці ў ластаўчыным гнязьдзе — буйныя, дужыя, драпежныя. Ім цесна тут, на тэрыторыі гэтай краіны, і яны імкнуцца выкінуць з гнязда ластаўчанятаў і саму невялікую ластаўку. Дні ідуць, нахабы робяцца ўсё буйнейшыя, усё далей разносяцца іхнія галасы... Няўжо менавіта гэтыя сілы будуць фармаваць палітычнае й грамадзкае жыцьцё незалежнае Беларусі? Што мы ведалі пра іх яшчэ ўчора? Але што яшчэ ўчора мы ведалі пра Лукашэнку? Хіба тое, што ўзяў і падняў адсталы саўгас, за што яго пахваліў сам генэральны сакратар Гарбачоў?..

КАЗКІ ПРА КАНДЫДАТАЎ

Занатавалі Адам Глёбус, Максім Клімковіч, Уладзімер Сьцяпан

На жаль, гэты тэкст ня быў прапанаваны Рэдакцыі да выбараў прэзыдэнта Беларусі, калі рыхтаваўся папярэдні нумар «Нашае Нівы». Але ўсяму свае час і месца. Надрукаваць «Казкі пра кандыдатаў» не згадзілася ніводная іншая газэта. І цяпер мы выпраўляем памылку аўтараў, тым больш, што іх тэкст ня страчвае актуальнасьці.

1. КЕБІЧ І ГРЫБЫ

Дзіўны чалавек Вячаслаў Францавіч Кебіч. Зусім няма ў яго вольнага часу, але як надарыцца свабодная хвілінка, бяжыць ён адразу ў лес і да самае начы блукае паміж дрэваў, угледзецца сваім арлiным вокам: а ці не схаваўся дзе над якім лістом-кустом добры крамяны грыб. А знайшоўшы таго грыба, Вячаслаў Францавіч Кебіч апускаецца на калені, хры-сьціцца па-нашаму, па-праваслаўнаму, выцягвае з кішэні навостраны сьцізорык і лоўка рэжа той грыб пад самы карэньчык.

І вось што дзіўна, ані разу ня трапіўся Вячаславу Францавічу Кебічу чарвівы грыб. Тут і думай-маракуй... Ці то чалавек ён такі ўдачлівы? Ці то чарвякі баяцца Вячаслава Францавіча?

Запісана 5.06.1994 каля станцыі мэтро «Кастрычніцкая».

2. ШУШКЕВІЧ І ГАЛУБКА

Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч вельмі любіць усё жывое, асабліва птушак і катоў. Як убачыць якога памыйнага галоднага ката, дык заўсёды падзеліцца зь ім апошнім кавалачкам мяса. Таго самага мяса, што кладзе ў ссабойку маладая жонка, каб, крый Бог, не згаладаўся, не зьнямогся на цяжкой рабоце ў Вярхоўным Савеце яе Стась.

Каты вельмі любяць Станіслава Станіслававіча, птушкі таксама ня раз адчувалі бацькоўскі клопат Шушкевіча, бо апошнія крошкі хлеба ён заўсёды аддае галубам.

Аднойчы ў лютыя маразы Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч, ідучы з паседжаньня Вярхоўнага Савету, заўважыў каля помніка Уладзіміру Ільлічу Леніну зьнясіленую белую галубку. Птушка кахала на чорным граніце. Пэўна, замерзла б, але цёплае дыханьне Станіслава Станіслававіча зрабіла цуд: галубка ажыла. Толькі вось бяда: правую лапку не ўдалося адхукаць, і яна адмерзла, учарнела і адвалілася. Тады Станіслаў Станіслававіч аж на тры дні кінуў сваю палітычную барацьбу, засеў дома, адключыў тэлефоны і зьмайстраваў для белай галубкі адмысловы срэбны пратэз.

І вось дзіва-дзіўнае: кожную раніцу і ў дождж і ў сьнёгу прылятае птушка на балькон, грукае срэбнай лапкай у шыбіну, каб не заспаў Станіслаў Станіслававіч, каб меў больш часу на добрыя справы.

Запісана 8.06.1994 каля станцыі мэтро «Няміга».

3. ПАЗЬНЯК І КАМУНІСТЫ

Прыйшоў аднаго разу Зянон Станіслававіч Пазьняк на чарговае паседжаньне Вярхоўнага Савету дый папрасіў слова, а як далі, выйшаў да мікрафону й сказаў: «Не баюся я болей вас, камуністы-крывасмокі ненажэрныя! Хопіць ссаць крывю са шматпакутнага беларускага народу! Буду я вас зараз кляйміць!» Засьмяяліся камуністы, кінуліся да Зянона, а Зянон Станіслававіч не спалохаўся, адкрыў свой чорны дыплямат, дастаў гарачае кляймо, якое прэзыдэнт Біл Клінтан падараваў яму ў Курапатах, і стаў пячаткі ставіць на камуністах: каму на лоб прылепіць вогненны знак, каму на сьпіну нязводную пячатку, а каму й на доўгі язык. Ніводнага не абмінуў. І цяпер дэпутатаў-крывасмокаў здалёк відаць.

Запісана 9.06.1994 на Пляцы Незалежнасьці.



4. ЛУКАШЭНКА І САМБРЭРА

Вельмі ўжо да твару Алесю Рыгоравічу Лукашэнку звычайнае мексіканскае самбрэра. Надта ж зручная рэч, нашмат лепшая за цюбяцейку ці генэральскую папаху. І ў сьпёку заўсёды цень знойдзеш, і ў дождж не замокнуць дэпутацкія плечы. Насіў бы і насіў Алесь Рыгоравіч сваё самбрэра, у якім так хораша гойсаць на саўгасным «козьліку» ад кароўніка да сьвінарніка, але закінуў лёс Лукашэнку ды ў сталіцу.

Змог бы і ў горадзе Алесь Рыгоравіч насіць любы сялянскаму сэрцу галаўны ўбор, каб была ў яго службовая машына з адкрытым верхам. Але не такі ён чалавек, каб перарабляць машыну пад сябе і кідаць на вецер народныя грошы. І паспрабаваў Лукашэнка езьдзіць у грамадзкім транспарце, бо хацеў захаваць імідж простага мексіканскага селяніна. Але як ты ўваб'есься-упіхнешся ў лацінаамэрыканскай шапцы ды ў менскі тралейбус?! Раз брылі пакамечылі, другі пакамечылі, і давялося Алесю Рыгоравічу Лукашэнку павесіць сваё самбрэра на цьвік. Але ня траціць надзеі Лукашэнка, што надыйдзе час, калі будзе ў яго машына з адкрытым верхам.

Запісана 16.06.1994 каля станцыі мэтро «Маскоўская».

5. НОВІКАЎ І ПЭНСІЯНЭРКА

Аднаго разу Базыль Мікалаевіч Новікаў вяртаўся пасьля партыйнай чысткі дадому. І ўбачыў ён, як у перапоўненым трамваі злодзей-кішэньнік разрэзаў навостранай манэтай клунак старэнькай бабулькі й цягне адтуль грошы — пачак за пачкам. Каб не Базыль Мікалаевіч, то праз пяць-шэсьць прыпынкаў завалодаў бы злодзей усёй сьціплай пэнсіяй, і давялося б старой, каб не памерці з голаду, сесьці на цьвінтары з працягнутай рукой. Але паглядзеў сурова Базыль Мікалаевіч Новікаў у мітусьлівыя вочы злодзея, і зрабілася кішэньніку сорамна, і пацiху запхаў ён скрадзеныя грошы назад у клунак, папрасіў у старой прабачэньня і сыйшоў на прыпынку. «Што магу зрабіць для цябе, добры чалавек?» — спыталася старая ў Новікава. «Не для мяне, а для сябе зробіш, калі на прэзыдэнцкіх выбарах аддасі свой голас за Новікава».

Вось як сумленна зьбірае галасы Базыль Мікалаевіч.

Запісана 16.06.1994 каля станцыі мэтро «Інстытут культуры».

6. ДУБКО І МЯДАЛЬ

Марозным звонкім вечарам прагульваўся Алесь Язэпавіч Дубко каля міністэрства абароны, па беразе Сьвіслачы. Глядзеў, як гойсаюць па тонкім лёдзе на каньках гарадзкія дзеці, і згадалася яму басаногае маленства. Не было тады такіх шыкоўных канькоў, не маглі дазволіць сабе бацькі купіць малому Алесю ані клюшку, ані шайбу «adidas». Ганяў Дубко па лёдзе дручком бляшанку з-пад гуталіну. Затуманіла сьляза вока лёгкаму на ўспамін Алесю Язэпавічу, і ня ўбачыў ён, як праламіўся лёд пад канькамі падлетка. Шмат людзей азірнулася на дзіцячы крык: «Тану! Тану!» Але ніхто не сьпяшаўся кідацца ратаваць дзіця ад немінучай гібелі ў сьцюдзёнай вадзе. Адзін толькі Алесь Язэпавіч Дубко не зьбаяўся, павесіў на парапет сваё паліто з дарагім каракулевым каўнярам, скінуў цяжкія чаравікі і пабег-паляцеў у адных шкарпэтках па тонкім лёдзе ратаваць небараку. А як дабег, дык выхапіў сваімі дужымі рукамі з палонкі ледзь жывога падлетка ды вынес на цьвёрды бераг.

За гэты гераічны ўчынак сабраліся былі даць Алесю Язэпавічу медаля за выратаваньне на водах, але Дубко ад медаля адмовіўся. Вось і маракуй: ці то чалавек ён такі сьціплы, ці то медалі яму ўжо няма куды вешаць.

Запісана 16.06.1994 каля станцыі мэтро «Плошча Перамогі».

Ганарар за «Казкі пра кандыдатаў» пералічаны ў Гарадзенскі заапарк для сям'і вечна галодных каётаў.

ІНАКШАЕ АБЛІЧЧА ХАМА

Публікацыя Славаміра Мрожака «Пакліканьне хама» ў папярэднім нумары «НН» атрымала на Беларусі невялікі водгук. Але, улічваючы наклад нашага выданьня й агульную скаванасьць беларускай грамадзкай думкі, гэтага дастаткова, каб меркаваць пра тое, што Мрожак патрапіў у набалелае месца цяперашняй супольнай душы — беларускай, польскай, посткамуністычнай. Дарэчы, у Польшчы публікацыя Мрожака мела шырокі водгалас, яе передрукавалі многія газэты, зь ёй згаджаліся й спрачаліся. І спрачаюцца. Найбольш цікавы працяг тэмы хамства — у палемічным артыкуле Івоны Д.Бартчак і Войцеха Радухі ў каталіцкім *Tygodniku powszechnym*. У традыцыйным расейскім разуменьні экспрэсыўнаму слову «хам» проціпастаўляецца ня менш эмацыйнае, унікальнае расейскае «інтэлігент». Тэкст, які мы перадрукоўваем ніжэй, прадстаўляе беззмацыйны, рацыянальны погляд на хама.

Бабуля сааўтаркі гэтага тэксту казала, што хам — гэта мужчына, які ня носіць насоўкі. Насоўка, зразумела, павінна быць з тканіны, а не з паперы. Бабуля не магла растлумачыць, чаму папяровая насоўка яшчэ ня робіць з мужчыны джэнтэльмэна. Выкананьне нормаў паводзінаў было для бабулі адзнакай ветлівасьці, а не канфармізмам, як гэта стала прынята ў ПНР. Ветлівасьць выказвалася іншым людзям, асобе, ведам, звычаям. Джэнтэльмэн лічыў, што трэба зьвяртацца да людзей на зразумелай для іх мове, што самае галоўнае ў дадзенай супольнасьці — каб людзі зразумелі яго, яго намеры, лёгкую дзеяньня й думкі, каб яны пачуваліся па-свойску й бясьпечна. Джэнтэльмэн ведае, што дэманстрацыя сваёй адметнасьці, шанаваньне сваёй іншасьцю, арыгінальнасьцю ці неагульнапрынятасьцю — менш істотныя.

У той самы час, калі бабуля выказвала недавер да мужчын, што ня мелі згаданых тут гігіенічных аксэсуараў, маладыя палякі — часта з вышэйшай адукацыяй і зь неблагіх сем'яў — карацілі халодныя восеньскія ночы, накрыўшыся газэтамі на лаўках Марыенпляцу, галоўнай прадстаўнічай плошчы Мюнхена. Яны псавалі эстэтычны выгляд гарадзкога цэнтру, дражнілі этычнае пачуцьцё элегантных, вызначаных у жыцьці немцаў. Яны рана ішлі на працу «па чорнаму», працу наогул простую, брудную, брыдкую, дрэнна аплатную, забароненую законам. Тыя палякі з Марыенпляцу — якіх немцы называлі хамамі — не лічылі, што іх паводзіны іх прыніжаюць. Яны дзейнічалі згодна з уласным кодэксам, паводле якога можна жыць бедна й неэстэтычна, але з глыбокім адчуваньнем уласнага лёсу й сэнсу жыцьця ўвогуле. Паводле гэтага кодэксу, калі канфлікт узьнікае паміж чужымі нормамі і ўласнай годнасьцю, можна выбраць годнасьць, нават калі іншыя асудзяць гэта як хамства.

У 15-м нумары *Polityki* Славамір Мрожак кінуў пару правакацыйных, моцных словаў пра польскага хама, і зараз паважныя газэты й тыднёвікі, а таксама вядомыя публіцысты палічылі дарэчным выказаць сваю салідарнасьць Мрожаку і спачуваньне хаму. Між радкамі яны падкрэсьлілі таксама сваю адрознасьць, зразумела, з кропляй барскай паблажлівасьці да нябогі. Мрожак пісаў так: «Камунізм зварушыў у Польшчы хама (...) Калісьці хам ня быў у модзе, пасьней ён стаў модны, цяпер ён дыктуе моду».

*

Назва «хам» была прыдуманая для людзей, якія прыходзяць у дадзенае асяродзьдзе з вонкавага — з пазыцыі гэтага, у якое выпучаюцца, — ніжэйшага. Для такіх людзей вялікі клопат растлумачыць, што яны думаюць, адчуваць, што для іх важнае, чаму яны паводзяць сябе так, а ня йнакш. Камунікатыўныя клопаты вынікаюць альбо з пачуцьця гонару выпучэнцаў, зь іх нехаці адкрывацца, тлумачыцца, даказваць свае вартасьці, альбо зь няўменьня выказацца пры дапамозе мовы й этыкету новага асяродзьдзя. А гэтае асяродзьдзе — з пачуцьцём уласнай вышэйшасьці — ня лічыць увогуле дарэчным намагацца, каб зразумець «новага прыбыша». Яно паводзіць сябе паводле нормаў і вартасьцяў, што ўсталяваныя даўно й шмат разоў спраўджаныя. А хам прыносіць новыя. Ён сам мусіць змагацца за прызнаньне хоць бы раўнапраўнасьці сваёй пазыцыі, сваіх прапановаў, свайго сьветапогляду і нормаў паводзінаў. І робіць гэта найчасьцей няўклюдна. Але праз пэўны час хам становіцца «сваім». Ён у нечым адмовіўся ад сваіх рацыяў. У нечым прызнаная ягонаая адметнасьць. Ён становіцца нормай. Як папяровыя насоўкі, непамысныя перад вайной.

Сапраўдны канфлікт паміж хамам і джэнтэльмэнам грунтуецца на пэўнай спэцыфічнай дынаміцы свойскасьці й чужасьці, пераменаў і нязьменнасьці. Ён грунтуецца на цяжкасьці выпрацоўкі такой унівэрсальнай мовы зносінаў паміж людзьмі, каб «перамены» былі зразумелыя, прыймальныя й абгрунтаваныя для традыцыяналістаў, а «нязьменнасьць» — не пагражала і была вартая пашаны для наватараў. Зразуметае такім чынам хамства мае няшмат агульнага з якімсьці знакам вартасьці. Гэта папросту брыда й цяжар тварэньня новага.

Як старэйшае, так і малодшае пакаленьні палякаў маюць досьвед так званага грамадзкага выпучэньня. Патэнцыяльна мы ўсе хамы ў вачах іншых. Мы ўсе баімся неразуменьня, неадпаведнай, сьвядома варожай інтэрпрэтацыі нашых словаў і ўчынкаў. Хама не зварушвае ніводзін лад, нават камунізм — як хацеў бы Мрожак. Хам — гэта прадукт рэвалюцыі, гвалтоўных грамадзкіх, культурных, палітычных, эканамічных пераўтварэньняў. Памеры хама — гэта мера гвалтоўнасьці, але й мера посьпеху перамен, аднак ні ў якім выпадку — ня мера вартасьці асобных людзей, падверажаных пераменам. Людзі жывуць пад пераможным прэсынгам гісторыі і ніяк ня мусяць атаясамлівацца зь ім.

*

Пасьляваеннага хама спарадзіла так званая дыктатура пралетарыяту і ідэя вядучай ролі рабоча-сялянскае клясы. Вялізныя, мільённыя масы людзей былі выпучаныя ў сэнсе палітычным, грамадзкім, глябальна цывілізацыйным. Яны былі вырваныя з сваіх асяродкаў і перанесеныя на новыя месцы. Ніхто больш ня быў у сябе і сярод сваіх. І хоць становішча й лёс цэлых грамадзкіх групаў былі падобныя, падпарадкаваныя адной, апісальнай і зразумелай лёгіцы, кожны паасобку пачуваў сябе самотным, няўпэўненым у слушнасьці й дакладнасьці сваіх меркаваньняў і паводзінаў. Ён быў і адчуваў сябе грамадзкім «набыткам». Чым больш ён працаваў на свой новы вышэйшы статус, тым бліжэй быў да мэты, чым больш яе цаніў, тым больш усьведамляў, колькі яшчэ мусіць зрабіць, навучыцца. Тым больш уражвала яго думка, кім бы ён быў, калі б не атрымаў і не рэалізаваў гэты гістарычны шанец.

Ён ніколі не прызнаваўся ў сваім расчараваньні, сполаху ці няпэўнасьці. Штодня ён бываў страшэнным хамам — чалавекам, які за нахабствам хавае свае комплексы й недахопы. У Польшчы людзі ня ўмелі — і цяпер слаба ўмеюць — разумецца паміж сабою, таму што кожны перад кожным граў таго, кім яшчэ ня быў, але спадзяваўся быць неўзабаве. Абы толькі праўда не была выказаная ўголас. А ўласна дзеля чаго? Вось жа ўсе пра сябе ведалі, што паходзяць з грамадзкага выпучэньня і ўсе былі пераканаными, што праўда іх прыніжае. Адносна каго? Не было ж нікога, з кім яны маглі б сябе параўноўваць. Было між тым адзінае пэўнае ўяўленьне пра чалавека годнага, ганаровага, паўнавартаснага, зь якім яны мераліся ў сваёй сьвядомасьці, а часам — гэта варта падкрэсьліць — і ў рэальным жыцьці. Магчыма, выпучэнцы чакалі, што зажывуць у форме сталай раўнапраўнай грамадзкай клясы, якая мае сваю мову, нормы, звычаі, традыцыі. Тады ніжэйшае паходжаньне ня мела б значэньня.

Распаўсюджваньне хамства ў сацыялістычным грамадзтве вынікала зь пераканьня ў крохкасьці й нетрывасьці здабытай пазыцыі. Насупор таму, што піша Мрожак, хам не заўсёды ўпэўнены ў сабе. Хоць ён і адчувае, што ўсё новае й добрае належыць яму проста так, як чалавеку, аднак не забывае, што чалавек жыве сярод іншых людзей, і яго гістарычная драма ў тым, што адныя лічацца лепшымі, другія горшымі. Польскі хам, які выступае як грамадзкая група, зрабіў адну падставовую памылку. Уласную «іншасьць» ён прызнаў за вялікую вартасьць, але ня ўмеў разьмяняць яе на іншыя, таксама каштоўныя, але меншыя манэты. Ён застаўся верны дэвізу: «Мы лепшыя, бо мы іншыя».

*

На жаль, сёньня гісторыя паўтараецца. Новая палітычная эліта падкрэсьлівае й паўтарае, што яна іншая за папярэднюю. Іншая як у адносінах да камуністаў, так і да той, непасрэдна папярэдняй. «Іншасьць» — як дазвол на выкананьне ўладных паўнамоцтваў. Аднак ніхто ня можа тую «іншасьць» пераўтварыць у самастойную, а не люстраную адносна камуністаў ці папярэдніхаў вартасьць. Можа толькі ламаць правілы гульні, усталяваныя раней іншымі.

Тыповая сучасная група выпучэнцаў — прадпрыймальнікі, людзі бізнэсу. Грамадзкая думка надта часта называе іх хамамі, нуварышамі. Яна не разумее іх, а яны ня хочуць, альбо ня ўмеюць вытлумачыць спэцыфіку сваёй мэнтальнасьці, пераканаць у вартасьцях, якія нясуць грамадзтву.

Існаваньне хамаў, людзей, якія руйнуюць добрае самапачуваньне вышэйшых культурных сфэраў, — гэта знак для нашае будучыні. Здаецца, што палякі занадта гладка ўвайшлі ў ролю палітыкаў, мэнэджэраў, уласьнікаў, наёмных работнікаў, кельнэраў, лёкаяў і гатэльных служак. Яны выконваюць свае ролі так, нібы яны для іх створаныя. Ніякі сумлеў, неспакой, нязгода ня мучаюць іх. Яны ня хочуць нічога болей, чым быць адкрывальнікамі раней прыдуманых роляў.

Людзі, што пачуваюцца на сваім месцы, — каштоўныя: яны ўтрымліваюць сьвет у раўнавазе. Але таксама — затрымліваюць яго на месцы. Людзі, якія ўносяць у жыцьцё стабільных групаў бунт іншасьці альбо чужасьці, цяжкія для разуменьня й прыйманьня, якія не трымаюцца этыкету й традыцыі, могуць даць нам нейкае новае творыва для канструяваньня лепшага сьвету. Кожны хам будзе калісьці цывілізаваны. Тады ён перастае быць хамам. Але адначасова зьяўляецца патрэба новага хама. Кагосьці, хто прыносіць дысгармонію й зьмяняе сьвет. Ён робіць гэта неэлегантна, але эфэктыўна. Шкада толькі, што так шмат хамаў прамінае, не пасьпеўшы выказацца.

ПАГРОЗА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

Пра небясьпеку, якую выклікаў «рэзкі ўзрост» нацыяналізму ў Эўропе, асабліва ў дзяржавах колішняга камуністычнага лягеру, мы чуем цяпер так часта, што ўжо ўспрымаем «нацыяналістычную пагрозу» як нешта відавочнае. Самыя розныя аўтарытэты пішуць пра яе, указваючы на прыклад былой Югаславіі...

Некаторыя заходнія палітыкі амаль з тугою пазіраюць назад, у тыя часы, калі Чырвоная Армія на кароткім ланцугу трымала ўсіх нерасейскіх шавіністаў. І гэтая туга па колішнім ладзе дазваляе Расеі сёньня заявіць без агаворак, што ваенныя акцыі «абароны міру» на абшары СНГ яна не павінна ўзгадняць ні зь якімі міжнароднымі інстанцыямі...

Злачынствы й выбрыкі нацыяналістычных тэрарыстаў заслугоўваюць адназначнага асуджэньня. Тым ня менш, і агульныя фразы пра «нацыяналістычную пагрозу» трэба лічыць памылковымі й шкоднымі.

Па-першае, трэба адрозьніваць нацыяналізм прыгнятальнікаў і прыгнечаных. Права на нацыянальнае самавызначэньне не апраўдвае бомбавых атак на невінаватых людзей. Але вось прыклад курдаў, айчына якіх падзеленая паміж пяцьцю дзяржавамі, ніводная зь якіх ня хоча признаць іх аўтаномію. Цяжка зьдзіўляцца, што курды ўжываюць такія жорсткія сродкі. Асуджаючы жорсткасьць, мы абавязаны ўспамінаць і пра правы курдаў. Расейская меншасьць у Эстоніі й Латвіі не павінна спадзявацца на прызнаньне яе правоў нароўні з правамі аўтахтоннага насельніцтва, бо расейцы аказаліся там у выніку масавых рэпрэсій...

Па-другое, варта заўважыць, хто найчасьцей і з найвялікшым націскам паўтарае тэзу аб пагрозе нацыяналізму. Гэта, з аднаго боку, расейскія правадыры, а з другога — амэрыканскія. Расейцы працівяцца незалежніцкім памкненьням народаў, якія доўгі час цярпелі русыфікацыю. Мала хто ў Польшчы ведае, што, напрыклад, у беларусаў ня толькі зьнішчылі інтэлігенцыю, але й зьмянілі граматыку мовы... А цяпер намаганьні дэрусыфікацыі прызнаюць за праявы... нацыяналізму.

Амэрыканцы ў сваю чаргу, па-першае, маюць увогуле слабое адчуваньне ўсёй праблематыкі нацыянальнае тоеснасьці й лічаць яе перажыткам; а па-другое, пасьля заняпаду камунізму яны хацелі б менш ускладненьняў і супрацоўніцтва з большымі дзяржавамі. Таму яны самі спрычыніліся да выбуху крывавага канфлікту ў Югаславіі. Дж.Бэйкер, дзяржаўны сакратар за прэзыдэнтам Бушам, заявіў тры гады таму, што Злучаныя Штаты не прызнаюць «распаду» Югаславіі. І гэта надзвычай асьмяліла сэрбска-камуністычных генэралаў на мілітарнае супрацьстаяньне славенцам, а потым харватам, якія імкнуліся да самастойнасьці сваіх рэспублік. Крывавая вайна ў Босьніі вынікла з тых канфліктаў амаль аўтаматычна. Можна сказаць, што віну за трагедыю краін былой Югаславіі нясуць, з аднаго боку, сэрбская прага дамінаваць над іншымі, а з другога — неразуменьне Захадам памкненьняў харватаў, славенцаў і басьнякоў. «Нацыяналізм» харватаў, славенцаў і басьняцкіх мусульман вінаваты найменей.

Адсюль вынікаюць тры пытаньні. Ці нацыяналізм — гэта галоўная пагроза для міру ў Эўропе? Не. Такая пагроза — недахоп усталяванага спосабу мірнага самастанаўленьня народаў.

Ці іншым краінам пагражае лёс Югаславіі? Не. Там сытуацыя ўнікальная з многіх прычынаў. Нездарма ўжо паўтары стагодзьдзі гавораць пра «балканскі кацёл». Чэхаславакія ўмела падзяліцца без авантураў, бо абодва бакі трымаліся падставаў дэмакратыі. Іншым краінам тым часам можа пагражаць захаваньне ці накідваньне сілай чужога дамінаваньня, перадусім расейскага.

Ці так званая міжнародная грамадзкасьць стварыла якія-небудзь мэханізмы, якія забясьпечвалі б ад канфліктаў на нацыянальнай глебе? Не. Так дзіўна складаецца, што тыя, хто найгучней разважае пра пагрозу нацыяналізму, адначасова прапануюць найменш эфэктыўны спосаб рэагаваньня на міжнацыянальныя канфлікты. Яны спасылаюцца на KBWE (альбо на Гельсінскія пагадненьні). Між тым прыклад Югаславіі паказаў поўную безвыніковасьць гэтай структуры сёньня.

Зьдзіслаў Найдэр
Tygodnik Solidarność

ЭПІТАФІЯ

Мікола Касьцюкевіч

Людзі паміраюць таму, што захлынаюцца ілюзіяй часу, памножанай на абмежаванасьць прасторы, і баяцца адвечнага супрацьстаяньня колькаснай якасьці чалавецтва якаснай колькасьці багоў.

М.К.

Калі сьмяецца тагасьвет,
рэальнасьць пачынае плакаць.

Хто можа нырцануць
у шчыльную ваду жыцьця,
што сквапна выдзяляе
адлічаныя ўдары сэрца,
і з падсьвядомых успамінаў мора
сьляпіць свой позірк
зорным бляскам?

Шчасьлівы шлях, што спалучае
рэалізуемую прагнасьць ведаў
з мастацкай здольнасьцю адчуць
схаваны сэнс і сутнасьць рэчаў:
гармонія,
якая жывіць сілы
наўмысна зьнішчаных супакаеньняў.

Працягласьць часу пільна сочыць,
як незьдзяйсьнёныя магчымасьці
перасыпаюцца пясчынкамі
ў шкляным гадзіньніку быцьця,
і на пакорную адданасьць лёсу
адказвае зьмяншэньнем плошчы,
дзе назапашваецца дасканаласьць.

Інстынкт бязмэтных існаваньняў,
не прыручоны сілай духу,
бязвольным сунецца натоўпам
і збочвае
з праспэкту самаўдасканаленьня
у цёмныя прысады,
дзе ад былога застаюцца
разьбітыя ліхтарні
здаволеных жаданьняў плоці.

Навошта назапашваць мроі,
калі ўсё роўна невядома,
што пераможа — плач ці сьмех?

Супольная пасрэднасьць люду,
стаптаная агульным тупаценьнем
па празаічнай шырыні дарог,
ня здолее адолець выпадковы,
наўмысна выпараны хворым уяўленьнем
сьвет.

Самаздаволеная ўпэўненасьць
у слушнасьці інстынктаў
крывымі пальцамі зажытых догмаў
запальвае газьніцу
асуджаных наканаваньняў,
і застаялае паветра цьмяных будняў
кладзе граху пячатку
на твары з рысамі выродзтва —
штодзень старанныя прыстасаванцы
гідліва сплёўваюць
магчымасьць разьвіцьця,
а ноч іх насычае новай злосьцю.

Упартае зьліцьцё ляноты
з працэсам пераемнасьці прымітывізму,
нявартым нават пахаваньня
ў балоце сытых безабліччаў,
бы цеста,
пашыраецца ва ўсе бакі
магчымых дэградацый.

Адны прыхільнікі
adversus зьнешняй формы,
багатыя праявамі нескарыстанага
патэнцыялу,
валодаюць раскошай і жаданьнем
шукаць забытыя прадвызначэньні
і памятаць сіроцкі радавод
уласных жыцьцяў.

І толькі тым, хто памірае
ў бясконцых пошуках сябе,
даецца самадастатковасьць
і сьцежкі-ніткі да вышынь
спрадвечнае калыскі магаў
і мудрасьці звышчалавецтва.

Натоўп сьмяецца і цкуе
адэптаў taedium
vitae,
ня ведаючы, што бясконцасьць,
якая існуе за межамі апошніх сноў,
ім дорыць супрацьлегласьць сьмерці.

У ноч,
калі зьнікае геній,
на небе сустракаюць бога.

Здымак Дзяніса Раманюка

ЗАКРЫТАЕ ПЫТАНЬНЕ

Гомель — Варонеж — Гомель

Зьміцер Бартосік

Нарэшце пільны беларускі мытнік скончыў свой нікчэмны занятак і даў дазвол пакінуць межы СНГ. Сябра-літовец, які вёў аўта, з палёгкай уздыхнуў:

— Ведаеш, зь якога боку ні ўяжджаю ў Літву, адразу зьяўляецца пачуцьцё пэўнасьці, спакою, роднага дому.

Я адрэагаваў імгненна:

— Што, і калі пастоў тут не было, таксама родную зямельку сьлязьмі акрапляў?

Ён маўчаў, і я зразумеў, што ён «надзьмуўся». А я прыкусіў свой неўтаймоўны язык і пазайздосьціў прыяцелю самай чорнаю зайздрасьцю: «Глядзі ты, летувіс! Родным домам яму, блін, запахла. Не пасьпелі кардон пераехаць...»

Між тым, прыходзілася прызнаць, што пачуцьцё Радзімы ці сустрэчы з Радзімай мне незнаёмае.

Ёсьць, ясная рэч, гарады, якія мне заўсёды будуць сваімі, а ў тых гарадох ёсьць дамы, дзе, я спадзяюся, заўсёды буду сваім. Але тут было іншае.

Я ня памятаю за сабой сэнтымэнтаў пры набліжэньні да аршанскага вакзалу. Можа, не з таго боку ехаў? Ды не, ня ў тым справа. Я, чый адрас быў калі ня дом і ня вуліца, дык Савецкі Саюз дакладна, ніколі не задаваўся пытаньнем: што для мяне Радзіма?

Самы просты адказ — месца, дзе ты зьявіўся на сьвет. Напэўна, някепска нарадзіцца ў Вільні ці Наваградку, дзе сама глеба зь першых крокаў па ёй дае зразумець, што ты ня першы ступіў на яе, і прывучвае хадзіць асьцярожна, з разуменьнем, што — не апошні. Мне, на жаль, тут не пашанцавала. Назва «Рыбінск» гучыць для мяне не радней за «Урупінск». Пазбавіў мяне лёс і першых упэўненых крокаў па сваёй зямлі і «заветной скамьи у ворот».

Можа, гэта народ? Вось толькі які? Той, што ад Берасьця і да...? Той, што заўсёды мае рацыю й адзінае, на што здольны — абраць сабе й мне прэзыдэнта ў надзеі, што той — верне!.. Што верне — невядома, але верне. Я шчыра спачуваю тым, каму ўсё цяжэй называць Петрадварэц і Байканур «нашей гордостью». Нічога годнага ўзамен яны не знайшлі й сваю страту намагаюцца кампэнсаваць, хварэючы «за наш футбол». Хвароба цяжкая, але не заразная.

Нацыя таксама не мая Радзіма. Мяне цяжка вывесьці з раўнавагі размовамі пра расейскае «дзікунства», але й Гамсахурдзія — ня мой чалавек.

А можа, мая Радзіма засталася ў дні, дакладней, часе нараджэньня. Зь якім бы хваляваньнем я зьлётаў на тую Радзіму!.. Дзе яшчэ існуе адкрыты й дабразычлівы горад Масква, які сьпявае Акуджаву й чакае «новага» Высоцкага, адкуль яшчэ не паехалі Галіч і Салжаніцын, і дзе, як у песьні, «все еще живы».

Але адзінае, што ў маіх сілах — набыць сабе старую «Волгу» — сымбаль хрушчоўскага прагрэсу — і круціць у салёне так любімую тады францускую эстраду. Ці апынуцца ў адным з гарадоў дзяцінства — у Варонежы, напрыклад, дзе бацькі пакідалі мяне на лета, таму я не магу ўявіць яго засьнежаным і задубелым.

* * *

Я прыехаў сюды на хаўтуры бабулі...

Якое дзіўнае, гістарычнае жыцьцё! Дзяцінства ў нябеднай сям'і, грамадзянская вайна, падчас якой яны ратавалі ад «белых» адвечна скрайніх у Расеі жыдоў. Затым шлюб з чырвоным камандзерам і жыцьцё ў Крамлі. Сузіраньне ранішніх шпацыраў «жывога бога» і мярзотны страх пры вітаньні з жонкамі рэпрэсаваных афіцэраў. Вайна. Эвакуацыя. І нарэшце, сустрэча з адэскім лахаміднікам, як яна яго называла, Анатолем Бартосікам, маім дзедам, які ў такі неамурны час адбіў у баявога генэрала жонку. Мая дзіцячая памяць захавала прыгожы твар чалавека, «адэсіта» паводле нацыянальнасьці. Такіх пазнаюць без зазіраньня ў пашпарт.

Перад сьмерцю бабуля пераглядала свой лёс, адбіты ў мностве старых здымкаў, і ставіла пад імі нашы імёны, разьвітваючыся з намі назаўсёды. Яна так і ня ўбачыла мяне «пуцёвым» чалавекам...

Мы йшлі па горадзе, які сваёй сталінскай манумэнтальнасьцю так нагадвае Менск. Мы йшлі маімі дзіцячымі вуліцамі паўз сквэры, дзе так добра гуляецца ў вайну, праз двары, у якіх так дарэчы гучаў бы Бэрнэс. Мы йшлі па савецкіх вуліцах, па якіх хораша шпацыраваць кампаніяй, дзе гукі тваіх струнаў нікому не замінаюць, дзе віно выключна «з гарла», а размовы выключна пра былое. Не, у Менску так не гуляецца. Той «не потерпит» бруду паміж сваімі фасадамі.

Дзіўна, я йшоў не гаспадаром, які вярнуўся нарэшце, а ўсяго толькі госьцем. Хай чаканым і жаданым, але ўсяго толькі госьцем. Праз некалькі дзён мяне апануе сьверб — шукаць беларускія радыёхвалі і хоць нейкія весткі адтуль. Адкуль? З маёй... краіны.

Так мы становімся рознымі. Хоць размаўляем (пакуль што?) на адной мове, але размовы іншыя, праблемы інакшыя. Расейцы выбралі «пэпсі» і цяпер зарабляюць, каб спатоліць смагу, не жадаючы дзяліцца з тымі, хто выбраў іхні рубель. Ня час рабіць прагнозы, дзе будзе лепей. Добра ўжо тое, што мы самі вырашаем, што для нас гэтае «лепей». А таму не чапайце «нашага правасхадзіцельства».

Надмагільныя помнікі з маім прозьвішчам. Ніколі ня бачыў, і вось нарэшце...

Якое глупства, што пра сьмерць лепш ня думаць. Што за зьнявага такой велічнай і мудрай зьявы? Пра сьмерць думаць варта. Гэтыя думкі цьвярозяць і ўздымаюць цану жыцьця. І не пазбаўляюць, а яшчэ больш надзяляюць яго сэнсам. Час, канец якога адчуваецца фізычна, пачынае ўсё больш пражывацца, а не мінаць.

Дык вось, значыць, як гэта будзе выглядаць! Цікава толькі, дзе? Ну, вядома ж, хацелася б на Радзіме. Але на якой такой Радзіме? На той зямлі, дзе не нарадзіўся ні геаграфічна, ні часава, ні нацыянальна? На той, дзе продкі як з польскага бацькавага, так і з расейскага матчынага боку, магчыма, лілі сваю кроў, а можа й клалі галовы зусім не з абарончымі мэтамі? На той, якую не выбіраюць? Якая сама цябе выбера й народзіць у табе надзею на ўласную патрэбнасьць ёй.

* * *

А ўсё ж прыемнае слова «Захад». Як прыемна й тое, што яно нейкім чынам стасуецца з нашаю мэтай. Мы на ўсіх хуткасьцях імчым у Беларусь. У тым баку, як сымбаль, — чыстае неба.

На мяжы чарга. Некалі таксама няўтульна й дзіка выглядаў беларуска-літоўскі кардон. «Амэрыканісты» расейскі мытнік ну ніяк ня можа хоць чым-небудзь не адзначыцца ў нашай памяці.

— Белорусы? И без наркотиков?

— И даже без оружия, начальник. Удивительно, не правда ли?

Ну ўсё! Нарэшце! Нейкая лёгкасьць, ад якой цягне рабіць глупствы ці жартаваць, няхай і няўдала. Тут зразумеюць. Тут яно самае. Сэрца, незалежны ад нас баромэтар, выдае хваляваньне, і я ў разьліку зь літоўцам. Ну вось і Беліца пайшла.

Ды што такое?! Суботні вечар. Цудоўнае надвор'е. І пустата. Яна асабліва адчуваецца пасьля вірлівых і агністых вуліц Варонежу. Менавіта такую карцінку я і ўяўляў сабе ў ракавым для гэтага краю красавіку 1986 году, будучы далёка ад гэтага месца. Н-н-да. Месца для сканаьня, сапраўды — што трэба. Але нічога. Ажывім.

Галоўнае — мы дома.

ПЕСЬНЯРЫ І ПАЭТЫ

Калі над лугам бусел праляцеў
і ты за ім падняцца захацеў,
было яшчэ нічога невядома.

Ці будзе край? Ці прыйдзе зноў вясна?
Ці проста да вясковага акна
сьмерць зазірне і замаўчыць знаёма?

У апошнім радку — падказка жанру.

Калі мы гаворым, што «ня пішуць паэты», гэта значыць, што ў тых масах вершаў, якія цяпер ніжуцца й запаўняюць паэтычныя рубрыкі друку, няма жывога водгаласу *гэтага* часу. Няма *гэтага* ўсеагульнага «стану душы», выказанага словам. А хто цяпер праваднік гэтага стану? Гутарка ня столькі пра паэзію, не пра эстэтыку, а пра песьняра, які простым (ня вышуканым, не загадкавым і не ўскладнёным) сказам адэкватна перадасьць сёньняшні *знаёмы* публіцы настрой.

Пясьняр і песьня ў іх першасным значэньні — зусім ня тое, што паэт і паэзія, наватар і новае слова, эстэт і эстэтыка. Тут, наадварот, — мусяць быць знаёмае слова, пазнавальны сэнс і зьведанае пачуцьцё. Тое, што «я таксама адчуваў, а ён так выказаў, нібы падслухаў». Можна нават сумлявацца, ці дапасоўныя тут крытэрыі эстэтыкі, калі мы ўжываем іх толькі паводле вонкавых прыкметаў (мэтафара, гукапіс, рыфмоўка), якія для песьняра — не самамэта. Паэт, кажа І.Бродзкі, прыўносіць навацыі ў мову. Пясьняр жа — перадае грамадзкі настрой. Таму спрадвеку пясьняр існаваў на мяжы эстэтыкі й палітыкі, пры дварах ці ў апазыцыі дварам. І менавіта палітыкі пільна ўслухоўваліся ў ягонае слова. Яны спасылаліся на Купалу, калі цытавалі Купалу, і — на лірычнага героя, калі цытавалі Багдановіча.

Паэты — людзі чыстай красы. Яны ад прыроды свае — *ненародныя*. Яны — мае, твае ці яго, а ня нацыі. Багдановіч, Жылка, Арсеньнева ні творчымі мэтамі, ні аўдыторыяй, ні жыцьцём сваім не падобныя да песьняроў — Купалы, Коласа, Генію ш...

Яшчэ зусім нядаўна нейкі час выглядала на тое, што ролю песьняра на Беларусі будзе выконваць А.Сыс. Пасьля ў падобным амплуа заявіўся С.Адамовіч («Зямля Ханаан»). У

Алесь Чобат. «Там, на стоках, дзе Гаўя і Нёман...» // ЛіМ, 22 ліпеня 1994; яго ж: «Пуста цяпер у Айчыне» // Культура, 27 ліпеня 1994.

1992-м выпусьціў кніжку «Год» А.Чобат. Але ўсе пералічаныя зьявы — як бы эпізадычныя, як бы толькі заяўкі, анонсы, авансы. Яшчэ ніхто не прыйшоў, каб застацца напэўна.

Апошнія дзьве падборкі 35-гадовага Чобата — гэта ўжо больш сталае й сур'ёзнае сьведчаньне аб намерах. Чобат не ператвараецца ў «паэта па інэрцыі», як большасьць ягоных калегаў, што *вызначыліся з прафэсіяй*, а калі перастала пісацца — адступаць ужо не было куды. Чобат не вымучвае слова, не выседжвае рыфму, здаецца, нават ня надта задумваецца над тым, што піша. Гэтага патрабуе амплуа. Ён праваднік. Празь яго мусіць прамаўляць прырода.

Прырода ў Чобата — заходнебеларуская. Гэта істотна ў тым сэнсе, што дагэтуль большасьць нашых пачаткоўцаў-песьняроў вырастала на ўсходніх узорах пясьнярства — Высоцкі, Акуджава, Візбар. Для заходняй прыроды культура характэрная ад пачатку: ня трэба кожнага разу сьцьвярджаць азы. Агульнавядомыя рэчы няма патрэбы паўтараць, вытлумачваць, даказваць (на што звычайна пакутуе ўся беларуская паэзія). Напрыклад, каб напісаць верш пра Вільню, ня трэба рабіць выгляд, што ты ў Вільні ўпершыню. Ніякай гульні, дыдактыкі й патасу. Лірычны герой — сам аўтар. Вершы для песьняра — ня фікцыя й ня сродак кар'еры ці існаваньня, а форма размовы. Было б недарэчна строіць зь сябе каго-небудзь, апрача самога сябе. Надуманаму не павераць.

* * *

У Вільні — як у Вільні. Цэлы сьвет.
Старыя брукі. Цесна ад касьцёлаў.
Аблокі нізкія над вежай Гедыміна.

За ўласнаю душой ступаю сьлед у сьлед.
За паланэзам восені мясцовай.
За пахам ванны, бітуму і дыму.

Кавярня. Сорак нацыяў кругом.
Каньяк і ром ў пустой вітрыне бара.
Скупыя кроплі зьзяюць, як чмялі.

Тут, як у сьне — далёкі родны дом.
Пад ліпаю прытуленая пара.
Ах, Вільня, Вільня... Месца на зямлі.

Іван Дамой

І ВОСЕМ ПАЛЬЦАЎ...

Гартаючы гэтае выданьне, міжволі прыгадаў «барадатую» жыдоўскую показку: «Калі ў адзін хор сабраць па адным прадстаўніку кожнай нацыянальнасьці, што насяляюць нашу плянэту, і загадаць сьпяваць кожнаму сваю нацыянальную песьню, а пасьля адыйсьціся на пэўную адлегласьць, то выразна пачуеш знакамітую «Хава Нагілу».

Мэта кожнага падобнага зборніка, каб чытач, пасьля таго, як будзе перагорнута апошняя старонка, пачуў адпаведную «Хава Нагілу».

У зборніку зьмешчаныя творы 112 (!) аўтараў (без уліку гумарыстаў і перакладчыкаў) у альфабэтным парадку. Такім чынам парушаная традыцыя адзінага, між іншым, больш-менш рэгулярнага беларускага літаратурнага альманаху. Раней як было?.. Спачатку йдуць вершы жывых клясыкаў — Максім Танк, Ніл Гілевіч, Пімен Панчанка, Генадзь Бураўкін, а пасьля — усіх астатніх. Парушана яна не таму, што складальнік В.Шніп раптам вырашыў зрабіць рэвалюцыю, выставіць усіх паэтаў паводле першага закону мовы, проста тут няма твораў згаданых вышэй аўтараў. Няма і ўсё! Няма новых вершаў М.Танка. П.Панчанкі, слаўных дэпутатаў А.Вярцінскага з Н.Гілевічам, лідэра «камсамольскага дэкадансу» У.Някляева й нават А.Сыса. Наўрад ці прызнаныя й абласканыя ў свой час крытыкай творцы пад старасьць наважыліся байкатаваць «Дзень паэзіі», або В.Шніп не зьвяртаўся да іх з просьбай даць у альманах пару-тройку новых вершаў. Усё нашмат прасьцей — жывыя клясыкі ня пішуць!

У гэтай сытуацыі шанец вырвацца наперад атрымалі тыя, хто доўгі час быў у цені сёньняшніх зьнямелых калосаў беларускай савецкай літаратуры. Атрымалі, але ня выкарысталі.

Калі раней паэты сярэдняй рукі пісалі ва ўсю вершы-палітінфармацыі пра імпэрыялізм, Афганістан, ураджай беларускай бульбы, савецкі інтэрнацыяналізм, які часам межаваў з садаміяй («І сусед мой па ложку грузін...»), то было б наіўна спадзявацца, што пасьля стольких плённых гадоў пераводу паперы на агіткі ў іх можа добра атрымлівацца што-небудзь, апроч версыфікацыі. Цяпер яны свае

Дзень паэзіі-93/94. Укладальнік В.Шніп — Мн; Мастацкая літаратура, 1 994.

творчыя сілы сканцэнтравалі на пошуку прыстойнай рыфмы да слова «Беларусь».

Вось як робіць гэта Сяргей Панізьнік: «...Адляцелі ў вырай гусі... Эмігранты з Беларусі...» І далей па тэксту рыфмуецца: «скрусе» — «Беларусяй», «бусю» — «Беларусяй», «Беларусі» — «Ганусі».

Расейскамоўны (ці хутчэй расейскі) паэт Бранiслаў Спрынчан развіў далей фармалістычныя пошукі свайго беларускага калегі й напісаў твор з назваю «Беларуси», у якім пацьвердзіў сваю лаяльнасьць да нашай краіны й нашай недабітай мовы, і, каб гэтыя заявы не выглядалі галаслоўнымі, пару разоў зарыфмаваў назву краіны. Дзякуй і на гэтым.

Не цураюцца творцы й эканомікі. Як гэта зрабіў Казімір Камейша ў вершы (?) «Камароўка». Асяродак цывілізацыі — гарадзкі рынак — паэт-шматкніжнік абвінавачвае ва ўсіх бедах нашае нацыі толькі таму, што там круцяць свае чорныя справы «каўказцы». А кажуць, беларусам не ўласьцівая ксэнафобія. Паэт мае рацыю, грошы — зло, але іх адсутнасьць у кішэні — зло ня меншае.

Увогуле, тут ёсьць «сьцяхі» пра ўсё: футбол, беларускае войска, вайну, вёску, Хрыстова Нараджэньне й пра абы-што, дзе паміж банальнымі рыфмамі напханы банальны зьмест. Уласна вершаў мала! І іх аўтары выглядаюць на старонках альманаху белымі крукамі, гасьцямі, якіх ніхто ня клікаў. Алесь Аркуш, Адам Глёбус, чые хоку нарэшце ўвайшлі ў межы паэтыкі позьняга Басё — «... цяпер я імкнуся да вершаў, якія былі б мелкаводныя, як рака Сунагава». Цёплыя мініятуры Анжаліны Дабравольскай ды моцны дэбют на старонках гэтага выданьня наваполацкай паэткі Леры Сом.

Атрымліваецца, чатыры паэты. Ну, як тут не прыгадаць яшчэ адну старую показку, на гэты раз пра слыннага Обэрэута Даніла Хармса: «Пакідаючы новым знаёмым свой тэлефон, клясык абсурду часам казаў: «Тэлефон у мяне такі — 32-08. Запамінаецца ён проста — 32 зубы й восем пальцаў».

Так што, выходзіць, і рука ў мяне нармальная.

Андранік

LIST NIEUDOLNIE SKREŚLONY DO BOGA

Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі / Пераклаў з польскай Алег Мінкін. — Вільня: Наша Ніва; Менск: Мастацкая літаратура, 1994.

Пачну са споведзі. Я ня проста чытач Лесьмяна — я была пэрсанажам ягоных вершаў. Гэта было ў 1978. Я выправілася на сход Міжнароднае Амністыі ў Уіндзар з кніжкай польскіх эсэ ў торбе, выйшла з аўтобуса за замкам — і йшла, як здалося, доўгімі гадзінамі празь цемру да месца, якое было значна далей, чым я спадзявалася: за Тэмзай, уніз па вуліцы з старымі фасадамі паміж ракою й Ітанскай школай, далей і далей ад гораду... Я знайшла месца сходу, там не было ўжо болей дзе сесьці, як толькі на падлогу, — але праз поўгадзіны я мусіла сыйсьці, каб пасьпець на апошні аўтобус дадому, а ў галаве гуло ад гэтага нячутага раней «паэта крайнасьцяў», што зваўся Лесьмян: «Bóg znika — w brzozie...» «Gdzie się podziewa ten cały świat / gdy z oczu ginie?» Праз два дні я нецярпліва чакала сябра на Монпарнасе, трымаючы ў руцэ стары, з 40-х гадоў, том у кардоннай вокладцы зь неразрэзанымі старонкамі, даступны толькі на чвэрць — мой сьцізорык застаўся ў гатэлі ў другім канцы Парыжа...

Гэта было недзе на Вялікдзень. А на Каляды я ўжо была ў Кракаве, спадзеючыся сустрэцца з жанчынаю, якая даслала мне свой (жахлівы) пераклад «Гада». Зноў аўтобус і зноў дарога ў невядомае. Але ў пазычаным кажушку. Ён быў надта патрэбны, бо тым вечарам я затрымалася на гадзіну на вакзале ў Катавіцах: тэмпэратура, што тыдзень трымалася вышэй нуля, раптам упала на 20 градусаў. Я так зь ёй і не пабачылася, хоць яна атрымала маю паштоўку й адказала, што была дома ў той вечар. У выніку гэтага я вярнулася ў цэнтар да закрыцьця крамаў і, набраўшыся адвагі, зайшла ў сапраўдную польскую кнігарню (а не такую, дзе даводзіцца разумецца на кепскай французскай мове), дзе зусім нечакана ўбачыла цэлы стос кніжак «Klechdy sezamowe» нейкага Лесьмяна. Ці гэта мог быць той самы чалавек? Дык, значыць, ён пісаў казкі? Цэлы сусьвет аддзяляў гэтую бяздонна-сінюю вокладку ад таго шэрага кардону часоў вайны... Прыемна было пабачыць, што жанчыне, зь якою мы толькі што разьмінуліся, значна лепей удалася казка пра чырвоныя боты валацугі.

Самазадаволены ўспамін, я згодная. Але ён для мяне йстотны. Ён адкрыў мне дарогу да Лесьмяна, і ён дапамагае растлумачыць: чаго я шукаю ў любым перакладзе. «Mrok na schodach. Pustka w domu. / Nie pomoże nikt nikomu. / Ślady twoje śnieg zaprószył.. // Trzeba teraz w śnieg uwierzyć... / i pomilczeć tym milczeniem», пакуль я чакала цягніка ў Сьвентахловіцы...

Тры тэмы: бясконцае падарожжа ў цемру, неадчэпная прысутнасьць выпадковай рэчы, бачанай па дарозе («Зь якой жа радасьцю заплачу ў змроку, / Калі, шукаючы да Бога шляху, / галінку бэзу ці гнязьдзечка птаха / Рукою напаткаю ненарокам!» «Блаславіў, што бліжэй: колькі пчол, два кусты...»), ды старая праблема «Хто я? — напраўдзе, унутры?» («Nikt się nigdy nie dowie, czym byłam dla siebie» у «Я не Осіян...»; «Musiał być tym, czym nie był» у «Актэоне») у сьвеце, дзе ня ведаеш, хто з кім гуляе, як Мантэнь з сваім катом («I czem kwiaty patrzą na mnie podejrzliwie? / Czy coś o mnie nocnego wbrew mej wiedzy — wiedzą?»)

Праблема пачынаецца з цытатаю з «Актэона»: дзе яна падзелася ў перакладзе? Сэнс застаўся, але працытаваць яго немагчыма. «I ciszę swą dodając do ciszy cmentarza», сустрэча вонкавага й нутранога ў «Цьвінтары» таксама непазнавальна расплываецца ў цытаце; гэтаксама ж і «Kto raz w podróż wyruszył — już się nie zatrzyma». І «Ale śmierć mnie zawiodła», «сьмерць мяне падманула» — тут зусім не пра спачын у ціхай прыстані... У іншых мясьцінах — аслабленьне, прыглушэньне Лесьмянавых мэтафізычных матываў. Дзяўчына ў «Таямніцы» «пра пяшчоту нашу знае» — гэта гучыць спакайней, чым патаемнае «wie o tym, o czym nikt nie wie». Экстаз ружаў у «Захадзе» — даволі няўдалая замена «wniebowstąpieniu», узьнясеньню (таму, што праз 40 дзён пасьля Вялікадня), да таго ж губляецца й спасылка на «Рэштку Бога ў небе!» у «Незваротным зьмяркань ні». Канец у «Засмучаным Каханьні» («Што ж забярэш у дарогу з сабою, / Як не ўсё тыя валошкі і макі?») можа да чаго й прыдатны, але ён блякне перад мэтафізычным захапленьнем арыгіналу: «Jeśli — nie wszystko, jeśli nie to samo?», дзе дрэвы й збожжа — і ёсьць тое ўсё (хоць першая страфа ўжо затуманіла гэта).

Як ілюстрацыя да Лесьмяна прыходзіць у галаву карціна Балтуса (у сапраўднасьці паляка з прозьвішчам Класоўскі), напісаная для П'ера-Жана Жува, дзе дзяўчына літаральна кахаецца з камлём дрэва.

Лесьмян і сапраўды крайні да немагчымага. «Уначы, расьсьмяяцца праз сон у твар небу / І, ламаючы гольле, упасьці ў змрок сьмерці, / Быццам яблык у пашчу, гатовую зжэрці». Гэта страсеньне асноваў успрыманьня, нерат мовы амаль не абцяжараны істотамі, злоўленымі ў ім. Ня толькі макі перакідаюцца ў (лінгвістычна прадказальных) пеўняў, а ячмень — у вожыкаў, але вось дзяўчына перад імглістым люстэркам ператвараецца ў Нарцыса праз сваё адлюстраваньне, і нашае веданьне сьвету перакульваецца мільгненьнем (цяпер агульнавядомым!) крыла пунсовага матылька паміж мною й ядлоўцавым кустом...

Філязафічная мова: не сказаць, каб Лесьмян быў канцэптуалістам. Гэта той гатунак мовы, які ўжываюць тэолягі, але Лесьмян карыстаецца ім зь іншай мэтай: дык і ня дзіва, калі тое, што я лічу найважнейшым у Лесьмяна, іншым здаецца зусім неістотным, нечым такім, чым можна ахвяраваць у перакладзе, захаваўшы нешта іншае.

Страта, якая ўразіла мяне найболей, — апошні радок у вершы «Перад сьвітанкам»: «Ня бачыць — але бачыць». Якое расчараваньне! Лесьмян часам ужывае гэтую формулу «п-і-не-п» («Miała w sadzie strój bogaty, / Malowany w różne światy, / Że gdy w nim się zapodziała, / nie wędrując — wędrowała»), але я заўсёды бачыла тут тонкае адрозьненьне, як у Сімоны Вэй — «desirer sans objet».

Гэтая думка ніяк не дае мне спакою: за апошнія пару дзён я знайшла яшчэ адно «desirer sans objet» у раньняга Камю на міжземнаморскім беразе, а таксама цэлы дыялёг на гэтую тэму ў п'есе забытага (?) пісьменьніка 30-х гадоў Чарлза Ўільямса. Называецца яна «Адамава семя», а размоўцы — Марыя й Язэп. (Выбачайце Т.С.Эліятычную мову перад Гімнам Багародзіцы!)

«Марыя, ты зьмянілася, ты закахалася». / «Так, Язэпе». «Ах, ах! А хто ён...?» «Ніхто, Язэпе. / Проста закахалася». «Дык нехта мусіць быць — ў каго». / «Мой любы, ты ня чуеш: мы кажам закахацца. / Чаму ж, скуль можа быць — ў каго?» / «Таму што гэта й значыць закахацца; / бо закаханым толькі й можна быць ў кагосьці». / «Мой любы, закахацца — гэта значыць закахацца. / Ні больш, ні менш. Каханьне — яно каханьне й ёсьць ды толькі, / паўсюль, ва ўсе часы, і да ўсяго навокал. / Мая душа ўсхваліла ўладара, мой дух / узрадаваўся ў Богу, маім збаўцы...»

Заключны прыклад, апошні радок кнігі: «калі ты сплывеш у вечнасьць...» Надзвычай дзіўны выбар апошняга верша, датаванага 1902 годам, зь Лесьмянава дзёньніка: зборнікі звычайна канчаюцца «Boże, pełen w niebie chwały, / A na krzyżu — pomarniały — Gdzieś się skrywał i gdzieś bywał, / Żem cię nigdy nie widywał? // Mów, co czynisz w tej godzinie, / Kiedy dusza moja ginie? / Czy łzę ronisz potajemną, / Czy też giniesz razem ze mną». Тым часам у іншым месцы Бог кажа Гальляшу: «Świat mój mija się ze mną...»

Я не зьбіраюся сьцьвярджаць, што Лесьмян мае пасьлядоўную сыстэму! Рэзкасьць дзёньнікавых радкоў мела б свой сэнс, калі б іх не замглілі гэты палёт у бясконцасьць: «Nie płacz — świat nie zginie, / Gdy mu zbraknie ciebie...» (сьвет не засумуе па табе!), тут зноў прыгадваецца Сімона Вэй й яе Фэдра: «Et la mort, a mes yeux ravissant la clarte / rend au jour qu'ils souillaient toute sa purete»... Што схавана за гэтым? Лесьмян-суцяшальнік??

Аднак усё гэта толькі кароткія нататкі на ўзбоччы посьпеху перакладчыка. Усе нешматлікія спробы падыходу да Лесьмяна па-ангельску былі поўным правалам: ангельцы яшчэ не знайшлі яму месца — у адной клясе зь Люісам Кэралам! (Аднак перакладаць ад гэтага будзе не лягчэй...)

Калі я пачынала, дык зьбіралася скончыць усімі тымі рэчамі, якіх я, на вялікі мой жаль, не знайшла ў «Пане Блішчынскім». Але столькі Лесьмяна па-новаму заквітнела для мяне, што я завагалася: ці не было б найбольшым кампліментам сказаць, што я чую Лесьмянаў голас і хачу зазірнуць у арыгінал?

«Зь якой жа верай буду і любоўю / Бярозе першай горача маліцца!»

«Не магу быць сабою я нават у сьмерці!»

«Гіну, ўціснуты ў цела, нібыта ў плашч зрэбны».

«Абкрывавіла вечнасьць гальлё лясной цішы!..»

Цалую

«Wierzący w Ciebie gnój»

Mева Maron

НЕ ЗАБЫЦЦА Б ПРА НАРАЗНУЮ ЗБРОЮ

Грыгор'еў Міхась. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1795-1794) / Каляровыя іл. — А.Прыбылаў; графіч. іл. — М.Лазоўскі / Менск: Выдавец З.Салошкін. — 168 с.: іл. ISBN 985-6090-01-6

Пішучы пра войска, звычайна маюць на ўвазе слаўныя бітвы (не абавязкова пераможныя). Але ў дадзенай кніжцы разьдзелу пра «Баявыя дзеяньні вайсковых частак і паўстанцкіх аддзелаў ВКЛ пад час паўстаньня 1794 г.» магло й ня быць. Уласна пра гэта апошнім часам выйшлі беларускія кніжкі. Міхась Грыгор'еў напісаў кнігу хутчэй па гісторыі тэхнікі ды гісторыі адзеньня.

Галоўнай памылкай тагачасных кіраўнікоў войска Рэчы Паспалітае была стаўка на шматлікую лёгкую кавалерыю, як на галоўны й аўтаномны род войск. Але ў XVIII ст. па ўсёй Эўропе кавалерыя адыгрывала ролю дапаможнага інструмэнта для шматлікай, узброенай стрэльбамі пяхоты. У выніку вайсковых рэформаў у другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай павялічылася колькасьць прафэсійных пешых вайскоўцаў. А набой для пяхотнай стрэльбы ўяўляў сабою трубку, якая, акрамя пораху й алавянай кулі, складалася з паперы альбо пэргамэнту. Вось чаму падчас паўстаньня 1794 г. было зьнішчана шмат старых кніг. Гэта важная для культуры інфармацыя.

Менавіта агульнакультурны падыход не ператварае кніжку ў інструкцыю па здымках гістарычных фільмаў. Хоць аўтар, бадай, імкнуўся да гэтага — усё насычана дэталямі, але дэталямі «цёплымі».

Пасьля рэформаў палкі пяхоты займелі «егераў» — трапных стралкоў, якія дзейнічалі рассыпным шыхтом. У егеры імкнуліся браць былых паляўнічых, «у Польшчы — курпаў і мазураў, а на Літве — палешукоў». Інструкцыя патрабавала ад стральцоў «скалы й горы пераадольваць, на вал ці бруствэр на бягу ўзьбірацца, як у лесе і зарасьлях, альбо ў іншых месцах патрулі чыніць, за дрэвам, плотам, фосам, пагоркам укрывацца, зь месц тых жа да заслоны сабе абраных, скрытна да іншых перасоўвацца». Для такога «вольнага» стралка й зброя патрэбная адпаведная — не звычайныя пяхотныя стрэльбы з гладкімі рулямі, а наразныя штуцары, прызначаныя для трапнай стральбы зь вялікай адлегласьці. Калі сапраўды здымаць фільм аб тым часе, дык варта героем стужкі зрабіць егера. І не забыцца пра наразную зброю.

Так раскрываецца мэханізм прафэсіяналізму: калі дасьледнік добра ведае прадмет, зусім вольна апэруе фактамі, дык ён можа стварыць і сынтэтычную карцінку.

Можна, хіба, не пагадзіцца з пэўнымі перакладамі тэрмінаў. Ужо прынята, што «нарадовы» па-беларуску будзе «нацыянальны».

Вузкае кола ведае, як выдавалася гэтая кніжка. Цэлы шэраг памылак быў зроблены на стадыі выдавецкай падрыхтоўкі: тэкст ня быў вычытаны карэктарам, таму ўзьніклі праблемы зь пераносамі ды некаторымі знакамі й літарамі; напэўна, дзеля эканоміі месца быў недаравальна выкінуты ўвесь даведачны апарат, у выніку чаго зьмест кнігі звузіўся да наяўнага тэксту, без інфармацыйнага пашырэньня праз спасылкі.

Мастакі — паўнапраўныя аўтары гэтай кнігі, што апраўдваецца самім жанрам малюнкаў — дакумэнтальныя рэканструкцыі. Адно з галоўных уражаньняў — кніжка дазваляе «пагуляцца ў салдацікі». Колеры й мундуры ствараюць прыемную сытуацыю фээрыі й карнавалу, але не выклікаюць настальгіі па крывавай драме.

Алег Дзярновіч

ПАДАРОЖЖА ТРЫТОНА

Полоцкий Летописец. Гісторыка-Літаратурны часопіс. // Полацак. №1. 1992; №1(2). 1993.

Падобныя рэгіянальныя краязнаўчыя выданьні ўжо зьявіліся ў Горадні, Магілёве, Смаленску й Гомлі. І вось яшчэ адно — Полацкае.

Дагэтуль выйшла два нумары-гадавікі ў 92-м і 93-м гадох; прайшла палова 94-га, але трэцяга нумару пакуль няма. Можа, яшчэ зьявіцца, а можа, гэты мой водгук станецца эпітафіяй намогам рэдакцыйнай калегіі разьвярэдзіць душы тром тысячам спадзяваных чытачоў ідэямі «праваслаўя, самадзяржаўнасьці і расейскай народнасьці», якія й складаюць канцэпцыю «Летапісца».

Заснавальнік і рэдактар — малодшы навуковы супрацоўнік Полацкага краязнаўчага музэю сп. Л.Данько ў слове да чытача так вызначае мэты часопіса: «Гісторыя Полацкай зямлі настолькі багатая, што, нам здаецца, насьпеў час прысьвяціць ёй ня толькі разрозьненыя публікацыі, але паспрабаваць сабраць у адно ўсе факты й сьведчаньні, дакумэнты й матэрыялы, як гэта ў свой час спрабаваў зрабіць, і не бяз посьпеху, вядомы гісторык Полаччыны й Віцебшчыны А.Сапуноў у сваей «Полацкай...» і Полацка-Віцебскай старыне».

Чым тут запярэчыш? Няхай бы ўсё сабраць і адлюстраваць. Ды каб жа ж! Як калісьці, у 1870 годзе праца «Вестника Западной Росии» ня збыт якога інтэлектуала Ксэнафонта Гаворскага «прышлася моцна па думцы і сэрцы гр. Мураўева», так і цяпер «Полоцкий Летописец» сашчапіўся душой і думкай зь інтарэсамі й палітыкай Расейскага праваслаўя ў Беларусі. Гаворскаму, як клясыку, адведзены пачэсны чырвоны куток на старонках «Летапісца». Таму самаму Гаворскаму, які паслужліва раіў праз сваё выданьне «разасласьць усіх хахламанаў (а пазьней і беларусаманаў — **А.С.**) на Салаўкі, Валаам, на Белавозера пад нагляд багамудрых старцаў...»

І ў першым, і ў другім нумарох «Полацкага летапісца» жыцьцё іншых канфэсій прадстаўлена толькі ў кантэксьце навароту іх ва ўлоньне Расейскае праваслаўнае царквы. Найбольш адыёзны з гэтай сэрыі матэрыял — «Дзеяніе Полацкага Сабору 1839 году». Друкуецца з выданьня «Пяцідзесяцігодзьдзе ўзьяднаньня з праваслаўнай царквой заходне-рускіх уніятаў» (С-Пб, 1889). Пра прысутнасьць жа ў рэгіёне іншых нацыянальных груп (балты, жыды, палякі...) і іх уплыў на фармаваньне аблічча Полаччыны — ані слова.

З 16-ці гістарычных тэкстаў першага нумару, сем — перадрукі дакумэнтаў і артыкулаў у асноўным XIX стагодзьдзя з той жа «Полацка-Віцебскай старыны» А.Сапунова, прычым пададзеныя без усялякіх камэнтараў, што можа азначаць альбо няздольнасьць апрацаваць гістарычны матэрыял, альбо згоду рэдакцыйнай калегіі «Полацкага летапісца» з поглядамі аўтараў на Беларусь як на Северо-Западный Край. Калі мець на ўвазе, што часопіс разьлічаны на навукоўцаў, дык вартасьць перадрукаў з Дабравольскага ці Сапунова невялікая, бо выданьні гэтыя дасьледнікам даступныя й вядомыя. Застаецца разьлік на больш шырокага чытача, ня надта дасьведчанага ў эвалюцыі поглядаў згаданых гісторыкаў, у крыніцах і канцэпцыях хоць бы таго ж XIX — пачатку XX стст. Пра У.Дабравольскага, напрыклад, чытач мае магчымасьць меркаваць паводле яго артыкула «Віцебская губэрня ў Айчынную вайну 1812 году», дзе Полаччына разглядаецца як расейская глухамань на подступах да Масквы, пазбаўленая ўсялякае самастойнае ролі...

Пры гэтым многія цікавыя факталягічныя, але несыстэматызаваныя матэрыялы сталіся фактычна заложнікамі падборкі доказаў пад гатовую ісьціну усходнеславянскага адзінства — маю на ўвазе артыкулы па археалёгіі й нумізматыцы С.Тарасава, Г.Ласкавага, У.Мілюціна, Ю.Зайца і Л.Дучыц.

Апроч адзінарускай, на старонкі часопіса дапушчаная й яшчэ адна канцэпцыя разьвіцьця Полаччыны — рэгіянальная. Найбольш яскрава прасочваецца яна ў публікацыі Д.Валадзіхіна і Д.Аляксандрава «Змаганьне за Полацак паміж Літвой і Маскоўскай дзяржавай у XV-XVI ст.». Трагедыя Полацкай зямлі, паводле гісторыкаў, была ў тым, што: «з 15 стагодзьдзя ўжо не магло быць гаворкі пра самастойнае дзяржаўнае існаваньне беларускіх (Полаччына-Віцебшчына — **А.С.**) земляў». І далей: «значыць найлепшым варыянтам у кантэксьце пастаянных маскоўска-літоўскіх сутыкненьняў было бязбольнае й негвалтоўнае, але трывалае замацаваньне гэтага рэгіёну за Літвой ці Маскоўскай дзяржавай. І толькі недальнабачнасьць як Івана IV, так і польскіх каралёў пазбаўляе іх у змаганьні за Полацак падтрымкі мясцовага насельніцтва». Канцоўка сыграная амаль з клясавых пазыцыяў, а папярэднія падводкі выдаюць сындром Міколы Шаляговіча, калі Полаччына разглядаецца як этнічна й культурна асобны ад усяе астатняе Беларусі рэгіён, памежны (!) з Масковіяй, якому й заходні, і ўсходні сусед — у аднолькавай ступені злая мачаха, але зь якой на пэўных кампрамісных умовах можна ўжыцца. І толькі бадай два артыкулы, — Уладзімера Арлова «Хто выкраў крыж Еўфрасіньні» (дзе толькі не друкаваны за апошнія пару гадоў!) і Людмілы Хмяльніцкай «Сапуноў — апошнія гады жыцьця», — дысануюць усёй гэтай рассыпаванай праваслаўна-расейскай катавасіі. Л.Хмяльніцкая прасочвае эвалюцыю ў паглядах Сапунова на гістарычны шлях Беларусі ад заходня-русізму й этнаграфізму да нацыянальна-дзяржаўнага падыходу. «Я быў такі шчасьлівы, што на старасьці дажыў да адраджэньня Беларусі, калі ні «сэпаратызм», ні сымпатыі да Беларусі ня сталі ўжо лічыцца крамольнымі», — цытуе Л.Хмяльніцкая словы Сапунова, праўда, чамусьці не падае крыніцу. Ледзь не стагодзьдзе аддзяляе нас ад гэтых словаў сталага гісторыка, а выдаўцы сёньняшняга гістарычнага часопіса ўсё яшчэ блукаюць па сьцежках ягонае маладосьці.

Гаворачы ўсё пра зьмест, варта не забыцца і на форму. Вызнаючы полікультурнасьць Полаччыны, рэдакцыя дэкляруе прынцыпы білінгвізму. А каб чытач ужо з самое вокладкі адчуў акцэнты, у другім нумары адразу пад назваю красуецца герб: у ніжняй палове — Пагоня, у верхняй — абсечаны па пуп сымболь Расейскай Імпэрыі, двухгаловы арол. З арлом зразумела, а чым жа Пагоня заслужылася на такую шаноўлю? Адказ тут жа. На старонцы 90-ай спадар А.Трафімаў тлумачыць: Пагоня сягае да Аляксандра Неўскага, зяця Полацкага князя...

«Полацкі Летапісец» — часопіс гістарычна-літаратурны. Таму добрая трацiна ўсяе плошчы аддадзена музам — сябрам літаратурнага аб'яднаньня «Полоцкая ветвь» і проста незалежным паэтам Полаччыны. Тэматычна вершы абодвух нумароў дапасаваныя да патрыятычнага ключа гістарычных частак. Прадставіць іх (не рызыкуючы быць абвінавачанай у тэндэнцыйнасьці) можна было б чатырохрадкоўем з паэмы «Сказание о Полоцке» Ядзьвігі Дзьвінскай:

О Полоцкая Мать-Земля!
Ты подарила нам преданья
О том, как русские поля
Навзрыд от недугов рыдали.

Альбо такім аптымістычным ямбам:

Но верю — это будет, будет!
Восстанет вновь святая твердь,
И православия оплотом
София Полоцка грядет,
и камни драгоценным потом
Омоет полоцкий народ.

Графаманства Я.Дзьвінскай ня робіць дысанансу астатнім аўтарам. Зірнем адным вокам на творчыя набыткі прадстаўнікоў «Полоцкой ветви». Некалькі месяцаў таму ў камуністычным друку яны назвалі сябе аб'яднаньнем, альтэрнатыўным Саюзу Пісьменьнікаў Беларусі. На чым жа разышліся іх сьцежкі? Прычыны яўна не ў таленавітасьці ці бяздарнасьці, бо ў Саюз пісьменьнікаў і не такіх прымалі. Што ж тады? Бадай, адказ можна знайсьці ўсё ў тым жа «Полоцком летописце»:

И в нас не кровь, а безнадежность,
на теле — фиговый листок.
Скажи, зачем Руси безбрежность
имеет вектор на Восток?

Не магу ўтрымацца ад спакусы яшчэ пацешыць вас паэзіяй цяпер ужо бунтарства і пратэсту. Аляксандар Раткевіч:

Меня никто не избирал поэтом,
я на поэта не учился никогда.
Я в поле вырвался, за мною следом
понесся конь взъерошенный туда.

Здагадваюся пра вашае жаданьне яшчэ й яшчэ раз акунацца ў полацкую паэтычную хвалю, шкада, што межы друкаваных аркушаў ва ўсе часы дамінавалі над песьнярамі. Адное магу вас запэўніць, што і астатнія аўтары на паэтаў не вучыліся ніколі, але пішуць ня менш даравіта. Што да гаспадароў часопіса, дазволю параду: заглядаючыся на «ветвь», не спатыкнецеся на каранёх!

Алеся Сёмуха

ЛЕКЦЫЯ МЁРТВАЙ МОВЫ

Zofia Kurzowa. Język polski Wileńszczyzny i kresów północno-wschodnich XVI-XX w. — Warszawa-Kraków: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1993.

Адкуль паходзіць польская літаратурная мова: зь Вялікапольшчы ці з Малапольшчы? Гэтае пытаньне займала ўвагу некалькіх пакаленьняў філёлягаў. Але сёньня наш досьвед ужо нашмат багацейшы: у гісторыі польскай мовы амаль гэткі ж важны аказаўся так званы «крэсовы дыялект».

Народжаны па-за этнаграфічным польскім абшарам, трансплянтаваны на землі рускіх і балтыйскіх плямёнаў, ён вярнуўся ў цэнтральную Польшчу ў творах нашых найбуйнейшых пісьменьнікаў. Крэсовая пальшчызна — гэта мова, якой некалі ў хатнім ужытку карысталіся Міцкевіч і Славацкі, Фрэдра й Мілаш, Сыракомля, Ажэшка й Івашкевіч, Касьцюшка й Пілсудзкі, Рушчыц, Манюшка й Кароль Шыманоўскі. Тады казалі, што Польшча — як абаранак: геаграфічны цэнтар Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў у сапраўднасьці разьмяшчаўся дзесьці ў ваколіцах Палесься й Навагрудчыны... Мова шляхты й інтэлігенцыі гэтага «цэнтру пальшчызны» — які з-за недахопу лепшага імя названы «крэсовай пальшчызнай», — вырашыла аблічча нашае роднае мовы. Гэта ацанілі толькі тады, калі крэсовай пальшчызны забракавала. Пасьля І сусьветнай вайны па-за абсягам агульнай польскай мовы апынулася мова жыхароў Кіеўшчыны, Жытоміршчыны, Меншчыны й Ковеншчыны. У наступную чаргу пасьля апошняй вайны мова Львова й Вільні на «Вернутых Землях» уваходзіла ў новыя залежнасьці, пераўтваралася, страчвала свае характэрныя рысы, зьнікала. На сваіх родных абшарах яна трывала пад прэсам савецкае «навамовы», што пашыралася праз афіцыёз і школу... Ці стала крэсовая пальшчызна ў XX ст. мёртваю мовай?

Манаграфія Зоф'і Кужовай адказвае на гэтае пытаньне адмоўна. Гэта ўжо другая кніжка аўтаркі, прысьвечаная падобным праблемам, — пасьля «Пальшчызны Львова і крэсаў паўднёва-ўсходніх». Над усімі яе папярэднімі працамі яна ўзвышаецца ня толькі памерамі (500 старонак), але й тэматычным дыяпазонам. Бо хоць аб прызнаньні ролі крэсовай пальшчызны ў гісторыі польскай літаратурнай мовы згадваў ужо ў 1913 г. Казімер Нітш — ранейшыя працы датычылі амаль выключна мовы асобных пісьменьнікаў, што паходзілі з шырока зразуметага ўсходу — у прыватнасьці, мовы Міцкевіча, якому, як вядома, прысьвечаны шматтомны слоўнік. Толькі Зоф'я Кужова ахапіла сваёй працай усе чатыры стагодзьдзі пальшчызны ў Вялікім Княстве Літоўскім — ад часоў люблінскай вуніі (і нават раней) да ялцінскай канфэрэнцыі і яе «рэпатрыяцыйных» наступстваў. Апісаная Кужовай мова — для нас, «галіцыян» і «крулявякаў» — бывае ўжо часам незразумелая (згадваю Міцкевічавы «świerzop» і «dzięcielinę») альбо гучыць гумарыстычна (згадваю незьлічоныя крэсовыя фразы, тыя «mileńkie dzieweńki», ад якіх аж роіцца ў «Хатнім сьпеўніку» Манюшкі). Набліжэньне й аддаленьне крэсовай мовы ад агульнапольскай нормы, насычэньне яе элемэнтамі беларускімі, ці — у выпадку Львова — украінскімі, кансэрватызм гэтай мовы, што захоўвае часта розныя архаічныя старапольскія формы — усё гэта ў кніжцы Кужовай можна ў такім аб'ёме прасачыць упершыню.

Уварваньне пальшчызны на землі Вялікага Княства Літоўскага працягвалася ад польска-літоўскай уніі, асабліва ад люблінскай уніі, а скончылася ў 1696 г. выгнаньнем ранейшай афіцыйнай мовы — беларускай. Але кантакт паміж абедзьвюма гэтымі мовамі працягваўся і пазьней: пра гэта сьведчаць аповесьці Ажэшкі, у якіх двор і наднёманскі засьценак размаўляюць крэсовай пальшчызнай, а селянін у «Дзюрдзях» і «Нізінах» гаворыць «па-тутэйшаму», значыць, па-беларуску. Не існавала — аж да XIX ст. — непасрэднага кантакту паміж мовамі польскай і літоўскай, якая яшчэ раней абмежавалася да дыялекту сялян Жмудзі. Толькі пасьля распрыгону ў 1861 г. вяскоўцы — гэтаксама літоўскія, як і беларускія — падпалі пад чарговую хвалю паланізацыі. І такім вось чынам моўны польска-беларускі кантакт у перадпадзельнай Рэчы Паспалітай вытварыў паўночна-ўсходні крэсовы дыялект, што быў узьняты да рангу грамадзянства найперш Багамольцам, які паходзіў зь Віцебшчыны, а потым Міцкевічам. Паланізацыйныя працэсы сярод літоўскіх і беларускіх сялян прынесьлі тыя польскія гаворкі ў постсавецкіх рэспубліках, якія існуюць да сёньня.

Гэтыя самыя гаворкі найлепшым чынам сьведчаць, што крэсовая пальшчызна жыве. І можа найбольш цікавым прадстаўляецца разьдзел кнігі «Моўная і нацыянальная сытуацыя палякаў у Літве і Беларусі пасьля II сусьветнай вайны». Я спрабую ўявіць сабе, як магла зьявіцца кніга, матэрыял для якой трэба было зьбіраць, выяжджаючы ў заняпалыя літоўскія й беларускія вёскі, у савецкія калгасы з маляўнічымі назвамі накшталт «Запаветы Ільліча» — на зусім недаступныя для іншаземцаў абшары. Неацэнннай дапамогай тут былі відавочна працы беларускага вучонага Вячаслава Вярэніча, які нястомна вывучае гэтыя «польскія гаворкі» на тэрыторыі СССР... Так ці інакш, матэрыял, сабраны й апісаны ў кнізе, бясцэнны. Да таго ж ён разьвейвае некаторыя міты, сьведчачы, напрыклад, якую вялікую ролю мела для крэсовай пальшчызны расейская мова — ужо ад пачатку XVIII ст...

Зоф'я Кужова праводзіць сваё дасьледаваньне ўжо амаль сорак гадоў — ігнаруючы моды й каньюнктуры. На пачатку ёй даводзілася пераадольваць бар'еры непаразуменьня й абыякавасьці. Калі ў часе ваеннага становішча зьявілася кніга «Пальшчызна Львова», цэнзура забараняла выходзіць за рамкі 1939 г.; не было таксама магчымасьці ахапіць дасьледаваньнем польскае вясковае жыхарства Ўкраіны... Сёньня цэнзурныя забароны зьніклі, гісторыкі нанова асэнсоўваюць трагічныя лёсы польскага насельніцтва ў савецкай Украіне і савецкай Беларусі. Манаграфія Кужовай выходзіць за межы прафэсійных інтарэсаў і становіцца чарговым крокам у нашым «шуканьні айчыны», так моцна падарванай у гэтым стагодзьдзі войнаў, дэпартацый і рэвалюцый.

Андрэй Раманоўскі
Tygodnik Powszechny

Пацярпелы ў суд не зьявіўся...

Сяргей Паўлоўскі

Усё пачынаецца зь першага госьця. Ты слаба пярэчыш, а ён ужо радасна крычыць табе ў вочы: «Братуха! Ці гэта ты! Мы ня бачыліся сто гадоў! Давай, накрывай хутчэй на стол... я буду спаць вунь там... дзе твой халат?.. я прыму душ...» Ён то шчасьліва рагоча, то раптам уважліва прыглядзецца да цябе: «Халера, ды ты не зьмяніўся зусім! А гэта твая жонка?.. А помніш Людку? А Кацьку? А помніш, як... А памятаеш... Ну, ты малайчына. Я страшэнна рады за цябе. Дай, я цябе пацалую...»

Ты сьціпла ўсьміхаесься, адступаючы на кухню. Ты не пасьпяваеш сабрацца з думкамі, а ён ужо прыняў душ, ён павесіў свае трусы («дык памытыя ж!») над тваім сталом, ён нажраўся, напіўся і дрыхне цяпер у тваім ложку. А ты, седзячы пад ягонымі трусамі, слухаеш даверальны й ціхі голас другога госьця: «Ведаеце, мне будзе не зусім камфортна ў адным пакоі з гэтым чалавекам. Вы ж паглядзіце, што за манэры! Таму будзе лепш, калі я займу ваш пакой, праўда? Гэта ж не павінна вас абцяжарыць, мы ж з вамі... вы памятаеце. І нетактоўна было б нагадваць, як шмат вы мне абавязаны. Наша даўняя дружба ўсяляе надзею...» Ён папросіць да бульбы пару масьлінаў, толькі пару, і крыху кетчупу, зусім трошкі, на кончык нажа. Ён натоліць свой лёгкі голад, вып'е кубачак кавы і адправіцца ў твой пакой, пакінуўшы сваю замазаную кетчупам талерачку на стале, акурат пад трусамі першага госьця.

А тады ўваліцца цэлая кампанія. «Дзядзька, не хвалюйся, мы тут на кухні, на падлозе. Старая любоў не ржавее! Уся ўласьць саветам! Жыве Беларусь! Ня хочаш жа ты сказаць, што мы стварылі табе нязручнасьці. Ды ты, брат, зажраўся зусім, закабанеў. Ладна-ладна, жартуем!» І сапраўды — братэрства, гасьціннасьць, калектывізм... Толькі б хутчэй яны ўсе пад'елі, наспаліся ды валілі к чортавай матары... Не, ім ты гэтага ня кажаш. Гэта ты так унутрана нэрвуесься...

А цяпер уяві сабе, што яны нікуды ня «зваляць». Ні заўтра, ні праз месяц, ніколі. Ужо вельмі хутка ты сам вывесіш свае трусы побач з трусамі першага госьця, з другім будзеш тайна й грэбліва абмяркоўваць усіх астатніх, а з трэцімі — гудзець ноч напралёт. Яны будуць так рабіць, бо гэта ўсё ў іхняй чалавечай прыродзе, а ты будзеш падыгрываць ім зь гідлівасьцю, бо ў тваёй прыродзе нічога такога няма...

* * *

Тэма акупацыі дзіўным чынам сплятаецца з тэмаю хама, прычым — ня столькі таго нахрапістага хамуйлы, колькі хама як чужога, як чалавека зь іншага асяродзьдзя, зь іншымі рэгуламі паводзінаў (гл. старонку 3). Калі ты дазваляеш яму дыктаваць свае правілы, ня ўказваючы на тое, што тут, куды ён прыйшоў, правілы іншыя, то ты сам і робіш зь яго хама. Хам — не зьява і не прырода, не паталёгія. Хам — гэта сытуацыя. Ускосна яе стварае сваёй падатлівасьцю той, адносна каго нехта хам.

Як падатлівы чалавек непазьбежна ператвараецца ў марыянэтку, так і нацыя, якая не сьцьвярджае ўвесь час сваю незалежнасьць і годнасьць, — падпадае пад акупацыю: адну, другую, трэцюю... Прыкметы захопу, нападу, анэксіі як бы забываюцца, і ўжо здаецца, што ніякай акупацыі няма. Галоўнае не ўспамінаць, і будзе здавацца, што гвалт скончаны ці, калі заўгодна, пераможаны, а яшчэ лепш — што яго не было.

Вось адкуль усе гэтыя разважаньні пра братэрства і крэўнасьць расейцаў і беларусаў — дзьвюх адрозных паводле мэнтальнасьці нацыяў. Гэта імкненьне беларуса «не будзіць праблематыку», бо такія пытаньні паўстануць, што ня дай Бог! Хай яны ўсе тут жаруць ды начуюць, хай я сам буду падыгрываць ім і крыўляцца на іхні манэр, абы ўсё неяк улеглася. Абы ціха. Скажы, хіба ня гэтаму кожная беларуская матка навучае сваё дзіцё? Ня лезь, не высоўвайся.

* * *

Для таго, каб адказаць на пытаньне — ці ёсьць акупацыя, ці яе няма, трэба мець дадзеныя з двух бакоў: з боку захопніка і з боку захопленага. І калі прыкметы агрэсіі заўсёды тыповыя (гвалт над мірным жыхарствам), то паводзіны акупаванага могуць як падкрэсьліць агрэсію, так і зьнівэляваць яе. Нават пры самых жорсткіх і цынічных злачынствах агрэсара ўсё гэта можа й не выглядаць на акупацыю. Як у нашым выпадку, калі нам намякнулі, і мы забралі сваю заяву з суда...

Акупацыя Беларусі праз доўгія гады стала ўсенароднай «фігурай замоўчваньня». Гавораць толькі пра некаторыя з тых акупацыяў, якія нібыта скончыліся: францускую, нямецкую... (Я пішу «нібыта», таму што ніхто толкам ня ведае іх рэальных наступстваў для Беларусі.) Але вось незадача: паняцьце «акупацыя Беларусі» не адрозьнівае, француская яна ці расейская, бо ёсьць толькі «акупацыя Беларусі» з шэрагам тыпалягічных прыкметаў, характэрных для ўсіх без выключэньня агрэсій. Пры ўсіх расейскіх царах, пры французах, пры паляках, пры немцах, пры татарах і пры бальшавіках акупанты цынічна забівалі мірнае жыхарства. На любую з агрэсій, у тым ліку расейскіх і савецкіх, прыпадаюць вёскі, спаленыя разам зь людзямі, канавы з трупамі й гвалт над сьведчаньнямі нацыянальнай тоеснасьці.

Крывавая, трупная, «нецікавая» гісторыя. Гісторыя акупацыі. Не напісаўшы яе, мы не напішам і гісторыю суб'екта. Мы проста ня станем ім.

ПРОСІМ, ПАН ГЕНЭРАЛ

Як зьявілася канцэпцыя аб «дабраахвотным узьяднаньні Беларусі з Расеяй»

Яўген Анішчанка

Гэта было на схіле існаваньня Рэчы Паспалітай «народаў польскага і Вялікага Княства Літоўскага». У 1788 г. у Варшаве пачаўся Вялікі сойм, які намерваўся вывесьці спарахнелую дзяржаву з палітычнай агоніі і ціскоў замежнай, пераважна расейскай, залежнасьці. Рэфарматары ўвянчалі шэраг рэформаў славутай Канстытуцыяй 3 траўня 1791 году.

У прыватнасьці, былі скасаваныя канфэдэрацыі, наёмную шляхту пазбавілі права ўдзелу ў сойміках. Канстытуцыя дэкляравала ўвядзеньне прававой апекі над прыгонным сялянствам. Гэта быў недазволены замах на неабмежаваную ўладу прыгоньнікаў, хоць ініцыятары рэформаў рабілі ўсё, каб прысяга новаму канстытуцыйнаму рэжыму мела ўсеагульную і шумную падтрымку.

Той жа сойм скасаваў царскі пратэктарат, ухвалены соймамі 1768 і 1775 гадоў, паводле якога Кацярына II сачыла за непарушнасьцю важнейшых правоў шляхецкага стану. У адказ на гэта Кацярына II сьпешна завяршыла пераможную вайну з Турцыяй, каб скіраваць войскі на вяртаньне *сваіх* канстытуцыйных правоў. Аднак, пісала яна, войскі трэба ўвесьці так, «чтобы не от нас был первой выстрел». Яна ўпэўнена разьлічвала на абыякавасьць і падтрымку беларускіх сялян, якія «поляков господ своих ненавидят».

27 красавіка 1792 г. пяць магнатаў падпісалі ў Пецярбургу акт так званай Таргавіцкай канфэдэрацыі, абвешчаны ў Таргавіцах толькі 14 траўня — у дзень уварваньня царскага войска. Акт назваў соймавыя рашэньні дзяржаўным пераваротам: пятая частка паслоў сойму ўзурпавала волю «народу». Дзеля вяртаньня страчаных шляхецкіх правоў таргавічане прасілі ўзброенае падтрымкі ў царыцы. І тая не прымусіла чакаць.

Кацярына II загадала падрыхтаваць да паходу на Беларусь больш чым 60-тысячную армію



на чале з генэрал-аншэфам М.Крачэтнікавым. Але пры двары ваганіся — калі ствараць саюзныя канфэдэрацыі: да, ці пасьля ўварваньня царскіх войскаў? Вырашылі — да таго, каб прадэманстраваць, што канфэдэрацыі «составляются добровольно шляхетством, угнетенным и лишенным прав своих и вольностей беззаконною и насильственною конституциею 3 мая», і каб інтэрвэнцыю «можно было объяснить просьбою о помощи со стороны народа». Ужо 19 красавіка пад Гомлем Крачэтнікаў атрымаў 200 тысяч рублёў на сакрэтныя выдаткі «к продовольствию прилепляющихся к конфедерации».

24 красавіка Крачэтнікаў прыбыў у Полацак, дзе ўзначаліў 6 конных, 10 пяхотных, 5 казачых палкоў і Эстляндзкі чатырохбатальённы корпус. Гэтую моц забясьпечылі 10-дзённым запасам харчу і 2 тысячамі фурманак. Так рыхтавалася «дабраахвотнае ўзьяднаньне братніх народаў».

Кіраўніцтва Генэральнай канфэдэрацыяй у Вялікім Княстве Літоўскім даверылі літоўскаму канцлеру Казіміру Сапегу. Той спрабаваў адкруціцца, патрабуючы, каб царскія войскі засланілі ягоныя маёнткі ад магчымае помсты патрыётаў. На месцах, у ваяводствах і паветах, канфэдэрацыі даверылі ствараць генэралу Шыману Касакоўскаму. У дапамогу яму далі шэфаў або дарадцаў: Я.Рудніцкага, А.Снарскага, Б.Лакіса, Я.Корсака, Т.Прысецкага. Сьпісы шляхты, што падпісала антысоймавыя ўхвалы і запрашэньне Кацярыне II, Крачэтнікаў трымаў пры сабе, каб «по вступлении моем с войсками в Польшу объявить их в городских канцеляриях с утверждением печати согласно их узаконениям». Усё павінна было выглядаць *законна*.

Але як ні высільваўся Касакоўскі, напачатку вольны народ ня надта ляпіўся вакол гэтае справы. Так 7 траўня Касакоўскі меў копію акту Браслаўскай канфэдэрацыі, падпісаную толькі 59 ураднікамі і палкім рыцарствам павету. Тым ня менш, ён запэўніваў, што шляхта павету «столь оказывает горячности, усердия и привязанности к России, что ныне уже готовы сесть на лошадей и начать дело». Акт канфэдэрацыі Полацкага ваяводзтва падпісалі толькі 70 ахвотнікаў, Аршанскага павету — 65. Але пачатак быў пакладзены.

11 траўня Крачэтнікаў выступіў з авангардам на левы бераг Дзьвіны і тут сустрэў 200 чалавек шляхты. Генэрал растумачыў, што царскія войскі ўвайшлі не «для разорения и угнетения поселян», а наадварот — каб быць «защитниками их вольности и охранителями от всяких угнетений». Як пісаў сам Крачэтнікаў, пасьля ягонай прамовы «жители с совершенным спокойствием вышли и на другой день охотно» прынесьлі прысягу. Затым генэрал разаслаў перад сабою маршалкаў намечаных канфэдэрацый іншых месцаў. Яны меліся абвяшчаць, што царскія войскі выконваюць вызваленчую місію. Выбіраць на адказныя пасады загадвалася толькі пазначаных у сьпісе асобаў.

Тымчасам войска ВКЛ проста панічна адступала і ўцякала. Калёна расейцаў графа Д.Мэліна пасьпяхова перапраўлілася цераз Друць, некалькімі стрэламі распужаўшы памежны пост. Сутычкі адбыліся пад вёскай Ласьніца і пад Барысавам, дзе казакі пабілі 21 жаўнера. Мэлін з трыумфам паведамляў, што жыхары «тамошних селений оказывают ласку и доброохотство». 13 траўня ў Чашніках сабралі навакольную шляхту. Тая падпісала прысягу, што граф вітаў некалькімі гарматнымі стрэламі. У той жа дзень у Халопенічах абвясьцілі акт Аршанскай канфэдэрацыі, а 17 траўня «польское дворянство с живейшим участием приняло покровительство России» ў Браславе. Праўда, дзеля гэтага з Рыгі тэрмінова прыбыў граф Плятар, які меў прамову пасьля літургіі. За ім слова ўзяў граф Мануцы. Нарэшце, усе прысутныя, 125 чалавек, як даносіў Плятар, «принеся благодарение богу, утвердили подпискою со всевозможной тишиною и с привеличайшей радостью и удовольствием» прысяжныя лісты.

20 траўня Крачэтнікаў выступіў з Ушачаў і тэрмінова разаслаў дробныя атрады, каб бараніць уладаньні новых саюзьнікаў, каб не дапусьціць скліканьня паспалітага рушэньня і абвяшчэньня соймавай ухвалы аб апецы сялян — каб пазьбегнуць «неустройств, могущих последовать между чернию от помянутого разглашения».

13 чэрвеня пасьля некалькіх стрэлаў быў захоплены Нясьвіскі замак. У здабычу трапіла 500 гармат, 1569 стрэльбаў, 277 цесакоў, 266 шабель, 26 бочак пораху. 29 афіцэраў і 803 жаўнеры каронных і радзівілаўскіх войскаў былі прыведзеныя да прысягі і адпушчаныя на ўсе чатыры бакі.

Трывожныя весткі паступалі з Горадні, дзе на выпадак абароны папраўлялі старыя швэдзкія акопы. Пад Зэльвай Мэлін разьбіў атрад з 22 чалавек, яшчэ 24 чалавекі ўзяў у палон. У Шчучыне Крачэтнікаў выдае загад, што за супраціў Генэральнай канфэдэрацыі ВКЛ ён «употреблять будет войска», а палонных накіруе ў Цьвер.

Хуткасьць і грошы зрабілі сваю справу. За месяц пераможнага наступу на Беларусі Крачэтнікаў раздаў 117486 рублёў. 25 чэрвеня 317 чалавек стварылі Менскую канфэдэрацыю. 30 чэрвеня 500 чалавек падпісалі акт Гарадзенскай канфэдэрацыі. 8 ліпеня ў Берасьці прысягнула 1400 чалавек — пасьля палону 300 супраціўленцаў з 5 гарматамі. 14 ліпеня трыумфатары занялі Берасьце, дзе дарэмна стараўся над фартэцыямі Я.Ясінскі, будучы кіраўнік паўстаньня 1794 году.

Паводле справаздачы Крачэтнікава, за час кампаніі ягоныя страты — усяго 23 забітых і 106 параненых. Свае войскі генэрал разьмясьціў так: 3 палкі па лініі Берасьце-Нараў, 3 палкі паміж Пінскам і Горадняй, 5 палкоў сталі па лініі Слуцак-Навагрудак-Ліда-Вільня. Пасьля гэтага ён паведаміў царыцы, што цяпер «в целой Литве не найдется таких, кои бы способны были предпринять что либо против покровительствуемой конфедерации». Заставалася толькі злучыць генэральныя канфэдэрацыі ВКЛ і Польшчы.

Апошні акт гэтага дзейства адбыўся 31 жніўня ў касьцёле езуітаў у Берасьці. На чале працэсіі ішоў біскуп І.Касакоўскі, за ім — маршалкі аб'яднанай канфэдэрацыі: ад Кароны — граф С.Патоцкі, ад ВКЛ — А.Сапега. Пасьля імшы маршалкі выказвалі прачулыя падзякі, затым падпісалі акт аб'яднанай канфэдэрацыі Рэчы Паспалітай. Калі яны выйшлі з касьцёлу, іх віталі 51 гарматным стрэлам. Пачаліся абдымкі, пацалункі. Расчулены граф Патоцкі пачаставаў трыумфатараў абедам. Пілі за здароўе Кацярыны II, за караля і канфэдэрацыю, за расейскую і польскую арміі. Для ўзнагароды знаці з Масквы было выпісана 15 выяваў царыцы.

Апошні супраціў, трэці літоўскі пяхотны полк, быў разброены 2 красавіка 1793 г. 550 палонных разаслалі на ўкамплектаваньне царскіх палкоў. Пачалося дызэртырства са зьнясlаўленага войска літоўскага. У Горадні склікаўся новы сойм, які меўся ўзаконіць акупаваныя тэрыторыі за Расейскай імпэрыяй.

Так выглядае далучэньне беларускіх земляў ВКЛ да імпэрыі ў справаздачах Крачэтнікава царыцы. Расейскі царызм, які вінаваціў у дэспатызме, гвалтаваньні шляхецкіх соймікаў і свабод, выступіў дзейсным абаронцам бастыёнаў шляхецкай дэмакратыі. Кацярына II выкарыстала запрашэньне з выгадай для абодвух бакоў: імпэрыя павялічылася на 250 тысяч $км^2$, а шляхецкае саслоўе захавала свае правы і прыгонную залежнасьць сялянства. З гэтага часу і паўстала канцэпцыя аб «дабраахвотным узьяднаньні Беларусі з Расеяй», а таксама — аб устойлівасьці грамадзкага ладу толькі ва ўмовах унітарнай дзяржавы на чале з абсалютным манарх[illegible]

БУДНІ АКУПАЦЫІ

Алег Дзярновіч

Тут усё пачынаецца з крыўды, якая шмат для нас значыць. Нас ахоплівае прага помсты, альбо мы робімся абыякавыя. Гэта падкоркавыя пачуцьці, і таму ад сябе мы не заўжды патрабуем тлумачэньняў: «Што канкрэтна здарылася?»

Статус акупацыі набываецца пасьля часовага захопу ўзброенымі сіламі адной дзяржавы тэрыторыі іншай дзяржавы (краіны). XX стагодзьдзе фіксуе такі факт: *захоп тэрыторыі БНР*. Стварэньне БНР — той юрыдычны факт, адносна якога ўсе іншыя падзеі другасныя. Абвяшчэньне БССР — усяго толькі канстатацыя рэжыму акупацыі. Наступныя падзеі — 1939 год, другая сусьветная вайна, — толькі разьвіцьцё дадзенага сюжэту.

Дзеля таго, каб юрыдычна спыніць акупацыйны рэжым і зафіксаваць гэта, трэба: 1. каб улады Беларусі абвясьцілі факт заканчэньня акупацыі й прызналі легітымнасьць органаў БНР; 2. каб урад БНР прызнаў факт заканчэньня акупацыі.

Пасьля гэтага адбываецца самароспуск ураду БНР у выгнаньні пры адначасовай перадачы ўсіх ягоных паўнамоцтваў ураду Рэспублікі Беларусі... Але сюжэт не атрымаў свайго завяршэньня. З тэксту Прэамбулы Канстытуцыі РБ былі выключаныя словы пра пераемнасьць дзяржаўнасьці ад БНР. Такім чынам, акупацыя БНР — дзейная рэалія.

Рэжым, умовы і наступствы акупацыі вызначаны ў Гаагскіх (1899, 1907) і Жэнэўскіх (1949) канвэнцыях аб *Законах і звычаях вайны*. Жэнэўская канвэнцыя «Аб абароне цывільнага насельніцтва» дае нам, як ураджэнцам і жыхарам Беларусі, права захоўваць вернасьць сваёй дзяржаве. Таму мы можам ухіляцца ад уплаты падаткаў, мытных пошлінаў (якія сёньня ўжо й намінальна сталі расейскімі)... Гэта нашы законныя санкцыі супраць рэжыму. Мы можам праводзіць іх з улікам міжнародных гарантый уласнае бясьпекі. Нас ахоўвае Жэнэўская канвэнцыя, якая забараняе калектыўныя пакараньні і ўгон насельніцтва.

Міжнароднае права вылучае дзьве формы акупацыі: 1. часовае знаходжаньне войскаў чужой дзяржавы на нашай тэрыторыі ва ўмовах ваеннага становішча; 2. пасьляваенная акупацыя.

Пры акупацыі ўлада акупаванай дзяржавы практычна спыняецца. Падчас ваеннай акупацыі адміністратыўнае кіраваньне тэрыторыі ажыцьцяўляецца камандаваньнем акупацыйных войскаў. У паваенны час фармуюцца таксама органы цывільнага кіраваньня, у якіх могуць браць удзел прадстаўнікі тутэйшага насельніцтва. Акупацыйная дзяржава павінна прымаць меры дзеля ўпарадкаваньня цывільнага й гаспадарчага жыцьця на захопленай тэрыторыі ў інтарэсах цывільнага насельніцтва. Акупацыя — зьява часовая паводле вызначэньня, таму ўключаць акупаваныя тэрыторыі ў склад дзяржавы-акупанткі забараняецца.

Акупацыя — гэта працэс, які закранае найменей два бакі. Статус акупацыі прадугледжвае таксама пэўную бясьпеку акупацыйных войскаў, іхняй маёмасьці ды камунікацыяў. Звычайна вайсковыя ўлады на акупаванай тэрыторыі прымаюць аднабаковыя акты ў дачыненьні да насельнікаў ды мясцовых органаў улады і забясьпечваюць іх выкананьне. А мы ўжо ведаем, што выкананьне забясьпечваецца таксама прымусам.

Пасьля таго, як выкананыя фармальнасьці спыненьня акупацыйнага рэжыму, узьнікае новае пытаньне — пра адказнасьць агрэсара. Расея парушае *Законы й звычаі вайны*. Грубае парушэньне — прымус служыць у войску агрэсара. Цалкам парушана яшчэ адно палажэньне — аб забароне зьнішчаць помнікі мастацтва й рэлігіі, а таксама гвалтам вывозіць іх на чужую тэрыторыю. Асобная Гаагская канвэнцыя 1954 г. прысьвечана абароне культурных каштоўнасьцяў. 4-я Гаагская канвэнцыя 1907 г. фармулюе неабходнасьць кампэнсацыі стратаў, якія вынікаюць з парушэньняў акупацыйнымі ўладамі *Законаў і звычаяў вайны*. Асобы, вінаватыя ў парушэньнях законаў, павіны несьці адказнасьць перад судом (ён можа адбыцца й пасьля спыненьня акупацыйнага рэжыму).

Акупацыйныя ўлады ня могуць усіх насельнікаў захопленай імі краіны разглядаць у аднолькавым рэпрэсіўным статусе. Тыя з нас, хто рызыкне ўзяць у рукі зброю, могуць патрапіць у катэгорыю камбатантаў, гэта значыць тых, хто ваюе. Камбатанты — ня толькі асобы, якія знаходзяцца ў дзейнай арміі, але і ўдзельнікі вайсковага апалчэньня, аддзелаў дабраахвотнікаў, насельніцтва, якое стыхійна ўзялося за зброю, у тым ліку, удзельнікі цывільных ды нацыянальна-вызвольных войнаў. Прычым апошнія могуць лічыцца камбатантамі, калі маюць камандзераў, адкрыта носяць зброю ды выконваюць *Законы й звычаі вайны*. Менавіта камбатанты, калі яны захопленыя ў палон, падлягаюць пазбаўленьню шмат якіх грамадзянскіх правоў, трапляюць пад значныя абмежаваньні. Затое на іх распаўсюджваюцца безумоўныя гарантыі захаваньня асабістага жыцьця. Іншыя ўдзельнікі супраціву — вайсковыя журналісты, інтэнданты, мэдычны пэрсанал, — зьяўляюцца некамбатантамі, чые грамадзянскія правы асобна ахоўваюцца міжнароднымі канвэнцыямі. Акрамя таго, каб назваць нейкіх людзей некамбатантамі (значыць, усё ж удзельнікамі супраціву), акупацыйныя ўлады мусяць давесьці, што гэтыя людзі маюць пэўныя пасьведчаньні ці іншую дакументаваную фіксацыю статуса. Астатнія людзі зьяўляюцца цывільным насельніцтвам.

Мы мусім сачыць за лёгікай міжнароднага права й таксама разьмяжоўваць прадстаўнікоў грамадзтва акупаванай краіны. Калябарантамі будуць тыя, хто йдзе на актыўнае супрацоўніцтва з рэжымам, беручы ўдзел у карных акцыях, якія забараняюцца міжнародным правам. Што да ўдзелу асобаў карэннай нацыянальнасьці ў цывільнай адміністрацыі, у асобных выпадках — служба ў паліцыі (крымінальны вышук, да прыкладу), то ён разглядаецца як удзел у забесьпячэньні цывільнага жыцьця пад кантролем акупантаў у паваенны акупацыйны пэрыяд.

Забараняецца незаконна выкарыстоўваць парляманцёрскія й нацыянальныя сьцягі, вайсковыя знакі й форменныя мундуры непрыяцеля. Але вядомыя выпадкі, калі пад акупацыяй выкарыстоўваецца нацыянальная сымболіка (цывільная адміністрацыя ўраду Францыі ў Вішы пад нямецкім кантролем часоў другой сусьветнай вайны; Беларусь у канцы XX ст.).

Усе згаданыя міжнародныя канвэнцыі XX ст. (у сваю чаргу яны грунтуюцца на больш раньніх дакумэнтах) ратыфікаваныя СССР. У іх распрацоўцы фармальна брала ўдзел БССР. Значыць, усе дадзеныя канвэнцыі прызнаюцца акупацыйным рэжымам. Для нас вельмі важна й тое, што Жэнэўская канвэнцыя 1949 г. «Аб абароне цывільнага насельніцтва пад час вайны» дзейнічае ня толькі ў выпадках афіцыйнага аб'яўленьня вайны, але нават тады, калі адзін з варагуючых бакоў не прызнае стану вайны. Такім чынам — у Маскве могуць не прызнаваць факту акупацыі, пад якой мы жывем. Міжнароднае права ідзе яшчэ далей — акупацыяй прызнаецца захоп тэрыторыі, калі нават гэты захоп не сустрэў узброенага супраціву. Але ў выпадку з БНР рэальна зафіксаваныя факты ўзброенага супраціву беларускага войска.

Жэнэўскія канвэнцыі тычацца й войнаў так званага неміжнароднага характару — цывільных, нацыянальна-вызвольных... Гэта значыць, што факты супраціву беларусаў у сярэдзіне ды другой палове XX ст. таксама фіксуюць статус акупацыі.



Будызм не прайшоў

Сяргей Шыдлоўскі

Маё дзяцінства прайшло пад акупацыяй, — гучыць крыху эпатажна. Мо праз якіх дваццаць гадоў Незалежнасьці такія словы й будуць успрымацца як належнае, але тады, у 70-ыя, чытаючы «Никогда не забудем» — жахлівае сьведчаньне аб той, яшчэ адной акупацыі (колькі іх тамака), — я нават і ўявіць сабе ня мог, што таксама калісьці скажу: «Маё дзяцінства прайшло пад акупацыяй...»

Апавядаць аб расейскай акупацыі — значыць, спавядацца ва ўсім сваім жыцьці, — што пасьпеў зрабіць, адчуць, убачыць і чаго не пасьпеў... Беларусы дастаткова ўжо спавядаліся ў гэтым





стагодзьдзі — таленавіта, з задавальненьнем — і зноў казаць нешта адмысловае на гэтую тэму залішне, — азірніся, паглядзі ў вочы свайму суседу — і ты ўбачыш аблічча акупацыі.

Амбіцыі маскоўскіх валадароў і брацкі сьверб іхняга народу выконвалі ва ўсім гэтым другасную ролю, бо тут гісторыя больш падобная на няўдалую спробу нацыянальнага суіцыду, чымся на кроніку заваёвы.

... Хто першы нясьцерпна захацеў пазбыцца турботаў зямных, зрабіцца трысьнёгам моўкным — вой, зьнясілены буднямі вайны, ці селянін, што зьняверыўся дачакацца наступнай вясны... Калі нірвана зрабілася звыклай формай існаваньня беларускай нацыі? Двухсотгадовая акупацыя Беларусі Расеяй — гэта такі мэтафізычны гушчар, што нават Маркес наўрад ці даў бы тут рады.

... Чаму ж не атрымалася гэтае самазабойства, калі беларус сам ішоў у рукі кату, толькі што матуз ды мыла свае не прынес... Вось акурат на гэтым матузе ашчадны кат і даў маху, — калі б на Беларусь прыехала некалькі дзясяткаў дабрадзеяў кшталту графа Румянцава, беларусаў болей не існавала б у прыродзе, але сюды ехалі збольшага зусім іншыя графы, не патрэбныя і самой Расеі. Ды за ўсё трэба плаціць, гаспада, нават за матуз і мыла для ахвяры...

Адкуль у зўрапейскага народу гэткая амаль будысцкая прага адмаўленьня дзейснага чыннага жыцьця. Нават няўрымсьлівая, амбітная інтэлігенцыя... Далібог, але найталенавіцейшага інтэрпрэтатара беларускасьці Ігната Канчэўскага я ўспрыймаю менавіта як найшчырага папулярызатара будызму. Хіба што я памыляюся, хіба... нораў нашага народу апошнім часам значна паздаравеў, — правалілася ж перадвыбарная казань рахманасьці, згоды ды талерацыі *a la* Ганьдзі. Народ выбраў апантанага Лукашэнку.

Пасьля двух стагодзьдзяў нірванічнага сну шэры колер абрыдзеў, і вока прагне зыркіх, кантрасных фарбаў. Хоць нязвыклае сонечнае сьвятло свабоды й сьлепіць, але гэта добра, — зрэнкі нармалёва рэагуюць на сьвятло. Беларус жывы.

КАЛЯНІЯЛЬНЫ СТЫЛЬ

Антон Сіюль

Гаворачы пра архітэктуру барока ў Лацінскай Амэрыцы, дасьледнікі звычайна адзначаюць уплыў мясцовых традыцыяў. Цяжкаватая фальклёрная пластыка ў бясконцых варыяцыях дойлідства XVII-XVIII ст. сапраўды часам выпадае з эўрапейскага кшталту. Але невыпадкова мастацтва таго часу мае дакладнае вызначэньне «каляніяльны стыль». Перад архітэктурай у калёніях стаялі іншыя задачы, чым у Эўропе. Найперш яна павінна была сьцьвердзіць безумоўную перавагу новага парадку, адсюль і яе гіпэрбарочнасьць і гіпэрхрысьціянскасьць. Эўрапейская хрысьціянская сэмантыка фармавала і плянавую структуру, і архітэктанічную лёгіку бажніцаў. Гэтаксама, як і густы канкістадораў-трыумфатараў вызначылі стыль палацаў. Эўрапейскасьць тут дамінуе бясспрэчна. Амэрыканскасьць вызяўляецца хіба што ў апрацоўцы матэрыялаў, у саміх матэрыялах ды ў апаведнасьці кліматычным умовам.

Сымбіёз з формамі індзейскіх цывілізацыяў стаў магчымы толькі ў адным варыянце — на цыклапічных падмурках Тэўаціўакана і Куска паўсталі касьцёлы й палацы захопнікаў. Гэтыя падмуркі й ёсьць найбольшы ўплыў на каляніяльны стыль. Дзе тубыльцаў было меней, там іх уплыў быў роўны нулю. Ніякі захопнік ня йдзе па культурныя ўплывы. Захопнік сам нясе свае меркаваньне пра ўсё. Адваротная сувязь не патрабуецца... Веракрус, Картахена, Маракайба — гэта аскепкі Ібэрыі, закінутыя праз акіян. Зрэшты, і ў Афрыцы, і ў Азіі калянізатары клапаціліся пра ўласны камфорт. Кожны хоча жыць у сваім доме, альбо — як у сваім. Экзыль хай будзе за дзьвярыма... Там, дзе нешта супрацьстаіць лёгіцы акупанта, пачынаецца двубой. Двубой тым больш жорсткі, чым менш падобныя цывілізацыі, тым больш верагодны, калі ёсьць чаму супраціўстаяць.

У XVI ст. Расеі давялося зьнішчыць цывілізацыю на Волзе, якая была прапрагам спадчыны Вялікай Булгарыі, мела глыбінныя традыцыі ўрбанізму, іслам з IX ст. і захавалася пасьля мангольскае навалы. Пасьля захопу Казані ў 1552 г. маскалі паклапаціліся пра поўнае вынішчэньне памятак яе мінуўшчыны, адных мячэтаў было спляжана звыш сотні. Адчынілася брама ў Азію.

У выніку Расея непасрэдна дакранулася да ўсходняга мастацтва й архітэктуры, якія прыйшліся да густу заваёўнікам. Поспехі на Ўсходзе былі адзначаныя пабудовай у Маскве Пакроўскага сабору (Васіля Бажавольнага), ў якім ад яснасьці візантыйскіх першаўзораў не засталося й знаку. Сам сабор, як мэмарыял, дзе нутраная сакральная частка мае ўскоснае значэньне, аналягічны паводле функцыі маўзалеям Азіі. Такі акцэнт на вонкавае ўзьдзеяньне ў адрыве ад непасрэднай функцыі бажніцы стаў традыцыйным. Невыпадкова сабор Спаса-на-Крыві ў Пецярбурзе, як манумэнт на месцы забойства цара, нават праз тры стагодзьдзі будаваўся з «аглядкаю» на сабор Васіля Бажавольнага. Мэмарыяльны маўзалей. Яшчэ да маскоўскага сабору, ў 1532 г. у гонар нараджэньня Івана IV (Жахлівага) на загад ягонага бацькі, вялікага князя Васіля III была ўзьведзена царква ў Каломенскім. Упершыню ва ўсходнім хрысьціянстве замест крыжовакупальнай бажніцы паўстала калёнападобная, цэнтрам яе стаў гіганцкі васьмерыковы барабан з шатром замест купала. Усходняя, абсідная частка наогул нявызначаная, насуперак абавязковай традыцыі Візантыі з VI ст. А ў гонар шлюбу Івана Жахлівага ў 1547 г. была пастаўлена царква Іаана Прадцечы ў вёсцы Дзякава, і зноў безадносна да патрабаваньняў культу.

Эвалюцыя расейскага дойлідства ў XVI ст. амаль канчаткова замяніла сакральны зьмест бажніцаў на мэмарыяльны. Прынесеныя з Волгі «цыбуліны» купалоў і шатры, што імітуюць ісламскія мінарэты, канчаткова склалі адметны кшталт расейскае архітэктуры. Самі ж бажніцы (менавіта мураваныя), выйшлі збольшага манумэнтамі ўлады. Прыгадаем Іосіфаўскі сабор у Магілёве, узьведзены ў гонар спатканьня Кацярыны II зь Іосіфам II! Каб тутэйшыя памяталі...

Ад пачатку XVIII ст. для культавай архітэктуры ў Расеі сталі неабавязковыя і ўласныя традыцыі. Петрапаўлаўскі сабор (1712-1733) Дамэніка Трэзіні цалкам ігнаруе ўсходнія каноны. Зрэшты, у яго не было сакральных мэтаў. Мэтаю пабудовы сабору стаў максымальна высокі залаты шпіц (на зайздрасьць «надменному соседу») і гадзіньнік на званіцы. Невыпадкова ў XIX ст. мураваныя бажніцы не ўважаліся расейцамі за «свае». Дэмакрат В.Стасаў безапэляцыйна сьцьвярджаў: «...расейскі народ — гэта паводле натуры сваёй, паводле ўсіх звычак сваіх — народ цесьляроў, а не муляраў». Складанаю для Расеі стала праблема стылістычнай, вобразнай неадпаведнасьці яе дойлідства вялікім стылям Эўропы, дзе агульнасьць веры й лёгікі палітычнае эвалюцыі абумовілі трансэўрапейскае «перацяканьне» формаў — ужо з XIII ст. Спробы заходніх архітэктараў працаваць у Расеі дапятроўскае пары сканчаліся зазвычай драматычна... Адзінкі зь іх (А.Ф'яраванцьі, Б.Фразін) нават не памыкаліся перайначваць усходніх густаў. Той жа Бон Фразін пры першай нагодзе, калі яму было даручана пабудаваць у Себежы крэпасьць, уцёк ад ваяводы Бутурліна ў Беларусь...

На працягу XVIII ст. гэтая праблема «нясумяшчальнасьці» была вырашана праз канфлікт, за кошт фарсіраванай «эўрапеізацыі» сталіцы, праз якую Пецярбург стаў «заапаркам» эўрапейскіх стыляў, выключэньнем на астатняй расейскай тэрыторыі Эўразіі. Цынізм «обрусителей» на Беларусі выявіўся і праз тое, што ў Пецярбургу нікога не бянтэжыла «нярускасьць» сталіцы. Там сьмяяліся са старанасьці полацкага япіскапа Савы (колішняга шараговага вікарыя ў Маскве), які загадаў расьпілоўваць на ўніяцкіх укрыжаваньнях ногі Хрыста, якія, у адрозьненьне ад праваслаўнага канону, былі прыбітыя адным, а не двума цьвікамі. Пра гэта нават надрукавалі показку ў пецярбурскім «Церковно-общественном вестнике»!

Пасьля ўключэньня Беларусі ў склад Расеі сытуацыя для расейцаў зусім зьмянілася. Часткай імпэрыі стаў край, які йснаваў да таго як частка іншай цывілізацыі, памежнай з Захадам. Адсюль у Расею імпартаваліся дасягненьні культуры й навукі, павевы палітычных і тэалягічных пераменаў. Іншыя ўрбаністычныя, рэлігійныя, мастацкія традыцыі не маглі не калоцца ў вочы акупантаў, занадта відавочная была мяжа «инородства».

Перад расейцамі паўстала задача вынішчэньня ўрбаністычнага асяродьдзя, як апірышча выключных правоў, поліканфэсійнасьці й поўнай талеранцыі, незалежнасьці ад пэрсаніфікаванае манархіі. Першым этапам гэтага вынішчэньня напрыканцы XVII ст. сталі: канфіскацыя маёмасьці землеўладальнікаў-апазыцыянэраў і раздача яе імпэратарскім фаварытам, пераплянiроўка старажытных местаў і мястэчак па тыповых для ўсёй імпэрыі праектах, абмежаваньне заходнехрысьціянскіх абрадаў, «выцісканьне» іншавернцаў за межы гарадзкіх цэнтраў.

Дзеля рэалізацыі апошняй задачы каталіцкаму сьвятарству было забаронена пашыраць сваю веру ў новай дзяржаве. У 1795 г. была праведзена сэкулярызацыя лішніх (!?) базыльянскіх манастыроў на карысьць расейскае праваслаўнае царквы, а іхнія фундушы былі накіраваныя на арганізацыю епархіяльных сэмінарыяў у Беларусі. «Лішнімі» сталі базыльянскія манастыры ў Віцебску, Менску, Мсьціславе і г.д., буйнейшыя й найбольш заможныя цэнтры ўніяцтва.

З 1778 г. пачалася рэалізацыя праектаў перабудовы беларускіх усходніх гарадоў, тых, якія трапілі ў Расею па выніках першага падзелу, г. зн., што праекты былі тыпавыя й створаныя адмыслова для акупаванае тэрыторыі. У адрозьненьне ад тыпавых праектаў для Расеі, у Беларусі цалкам ігнараваліся традыцыі ўрбанізму й маёмасныя правы тутэйшых уласьнікаў. Так пачынаўся ўрбіцыд — мэтанакіраванае й плянавае вынішчэньне асяродкаў ранейшае цывілізацыі.

Новыя адміністрацыйныя падзелы, якія пры Паўлу I дасягнулі мяжы валюнтарызму, непазнавальна зьмянілі ўрбаністычную сытуацыю.

Праўда, за Паўлам I становішча каталікоў і ўніятаў на нейкі час стабілізавалася. Цар, занепакоены рэвалюцыяй у Францыі, бачыў у каталіцкай царкве свайго саюзьніка. У 1800 г. палякі навіцыят атрымлівае правы закладаць духоўныя асяродкі там, дзе было каталіцкае насельніцтва. Ордэны пазбавіліся залежнасьці ад мясцовых касьцельных уладаў. У рукі езуітаў, піяраў, базыльянаў пакрысе патрапіла і школьная справа. Але самы эўрапейскі манарх Расеі кепска скончыў свае жыцьцё.

Тымчасам «махавік», які быў запушчаны пры Кацярыне II, не спыняўся. Па старых праектах пачалася рэканструкцыя населеных пунктаў ужо ў межах другога падзелу. Складзеныя ў Пецярбурзе, многія праекты ня ўлічвалі рэаліяў рэльефу ды натуральных патрэбаў гарадоў і мястэчак. Зрываліся старыя замчышчы, валы, горы. Зьнішчаліся запусьцелыя ратушы, у якіх не было патрэбы, палацы й замкі, гаспадары якіх разьехаліся, старасьвецкія бажніцы, якія належалі ўжо немавдома каму...

Для перабудовы вельмі надаўся клясыцызм. Яго ўнівэрсальнасьць дазваляла зьнівэляваць любыя адрозьненьні тутэйшага дойлідства ад архітэктуры іншых куткоў імпэрыі. Між тым у Беларусі на мяжы XVII-XIX ст. працавалі лепшыя дойліды Расеі: Стасаў, Львоў, Мельнікаў, Кларк... Дзякуючы іх таленту, ужо ў XIX ст. гарады Беларусі былі набліжаныя сваім духам да Расеі.

Працяг на старонцы 10

Якуб і яго пан. Ухвала Дэні Дыдро

Мілан Кундэра

У чацьвертым сёлетнім нумары «НН» надрукаваныя ўрыўкі з апошняй кнігі Мілана Кундэры «Здраджаныя тэстамэнты». Чэскі пісьменьнік пакінуў бацькаўшчыну ў 1968 годзе і жыве цяпер у Парыжы. Ніжэй публікуюцца фрагмэнты ягонага эсэ, якое датуецца 1981-м годам. Уласна літаратуразнаўчую частку тэксту, дзе Кундэра разважае над прыродай і лёсам рамана, Рэдакцыя палічыла магчымым у абраным кантэксьце апусьціць.

1.

Калі расейцы захапілі ў 1968 годзе маю малую краіну, усе мае кнігі разам былі забароненыя, а сам я ня меў ніякай легальнай магчымасьці зарабляць на жыцьцё. Многія людзі хацелі дапамагчы мне, і адзін тэатральны рэжысэр аднойчы прыйшоў і прапанаваў, каб я напісаў пад ягоным імем тэатральную адаптацыю «Ідыёта» Дастаеўскага.

Так я зноў прачытаў «Ідыёта» і зразумеў, што нават калі б паміраў з голаду, не змог бы ўзяцца за гэткую працу. Той сьвет перабольшаных жэстаў, цёмных глыбіняў, агрэсыўнай сэнтымэнтальнасьці адпалохваў мяне. Я раптам адчуў невытлумачальную тугу па «Якубу-фаталісту».

«Аддаваў перавагу Дыдро перад Дастаеўскім?» Я не хацеў бы аддаваць перавагу Дыдро, але ўжо ня мог пазбавіцца той дзіўнай тугі, і каб надалей застацца ў таварыстве Якуба й ягонага пана, пачаў уяўляць іх як пэрсанажаў сваёй уласнай тэатральнай гульні.

2.

Адкуль тая раптоўная няпрыязь да Дастаеўскага? Антырасейскі рэфлекс чэха, траўмаванага акупацыяй сваёй зямлі?

Думаю, што не, бо я не перастаў захапляцца Чэхавым. Сумлевы адносна эстэтычнай вартасьці ягоных твораў? Таксама не, бо мая антыпатыя не прэтэндавала ні на якую аб'ектыўнасьць.

Тое, што раздражняла мяне ў Дастаеўскім, гэта *паветра* ягоных кніг. Сьвет, дзе ўсё ператвараецца ў пачуцьці, або: дзе пачуцьцё ўзьведзена на ўзровень вартасьцяў і праўдаў.

Быў трэці дзень акупацыі. Я сядзеў за рулём аўта недзе паміж Прагай і Чэскімі Будзёвіцамі (месца, дзе Камю зьмясьціў свае «Непаразуменьне»). На дарогах, на палях, у лясах — паўсюль табарыліся расейскія жаўнеры. Потым маё аўта спынілі. Тры ваякі пачалі аглядаць яго. Калі агляд скончыўся, афіцэр, што кіраваў апэрацыяй, спытаў у мяне: «Как чувствуетесь?» і тады: «Як чуецеся?» Пытаньне не было ані зламысным, ані іранічным. Наадварот — афіцэр працягваў: «Гэта ўсё — вялікае непаразуменьне. Але тут неабходна навесьці парадак! Вы павінны ведаць, што мы любім чэхаў. Мы, русские, вас любим!»

Краіна спустошаная тысячаю танкаў, будучыня яе абгаджаная на стагодзьдзі, чэскія ўрадоўцы арыштаваныя ды інтэрнаваныя, а тут афіцэр акупацыйнай арміі выказвае вам любоў. Зразумейце мяне добра, ён не хацеў гэтым выказаць сваю нязгоду з акупацыяй, зусім не. Усе казалі тады прыблізна так, як ён. Іхняя пазыцыя грунтавалася не на садысцкай асалодзе гвалтаўнікоў, але на іншым архетыпе: на *зраненай ласцы*. Чаму тыя чэхі (якіх мы так любім) ня хочуць жыць з намі і так, як мы? Як шкада, што мы

Працяг на старонцы 10

КАЛЯНІЯЛЬНЫ СТЫЛЬ

Працяг са старонкі 9

Пачатак XIX ст. — ужо зусім іншы разьдзел у беларускім горадабудаўніцтве. Ён адзначаны буйным экспэрымэнтам — поўнай ліквідацыя тутэйшасьці ў Бабруйску. На працягу 1807-1812 гг. старажытны горад з рэнэсанснымі й барочнымі ансамблямі, старой фарай Пятра й Паўла, езуіцкім кляштарам, зь некалькімі старасьвецкімі цэрквамі быў перетвораны ў друз. Акупацыйныя ўлады не спыніліся перад вялізнымі па тым часе людзкімі й фінансавымі затратамі... Замест горада паўстала крэпасьць (праект генэрала К.Апэрмана, 1810-1812). Крэпасьць расла й пашыралася пасьля вайны 1812 г. На яе будаўніцтве працавалі тысячы прыгонных сялянаў і жаўнераў. З самых далёкіх куткоў Расеі звозіліся розныя будаўнічыя матэрыялы. У 1827 г. паводле праекту А.Штаўбэрта быў пастаўлены сабор А.Неўскага (на месцы фарнага касьцёлу), які стаў кампазыцыйным ядром вялікай вайсковай машыны...

Цікава, што адчувалі тубыльцы, калі сваімі рукамі нішчылі плён працы некалькіх пакаленьняў сваіх продкаў пад камандаю расейскіх афіцэраў зь нямецкімі прозьвішчамі?

Ад пачатку XIX ст. усе найважнейшыя ў кампазыцыях гарадоў манумэнтальныя бажніцы былі ў руках дзяржаўнай праваслаўнай царквы. Іх масавая перабудова вялася на казённы клясыцыстычны манэр, што часам да непазнавальнасьці зьмяняла аблічча колішніх барочных і ракальных касьцёлаў і цэркваў. Такой радыкальнай перабудове падпаў сабор базыльянскага манастыра ў Віцебску (з 1799 г. — Усьпенскі сабор), пасьля чаго ў ім ужо цяжка было ўгледзець сакавітую першаснову барока маэстра Я.Фантана III. У галоўным саборы Жыровіцкага манастыра (перабудова 1828 г.) былі разабраныя магутныя барочныя вежы, заменены купал і ўведзены суворы дарычны ордэр, у выніку чаго бажніца непапраўна згубіла сваю мастацкую адметнасьць. У такой самай манэры йшла рэканструкцыя і колішніх езуіцкіх сабораў Сьв.Ксавэрыя ў Віцебску, Сьв.Стафана ў Полацку, Дзевы Марыі ў Пінску, нават Фары Вітаўта ў Горадні ды шмат іншых. Ляпідарны клясыцызм дазволіў мінімальнымі сродкамі сьцерці драматычны дынамізм барокавых урбаністычных комплексаў.

Гэта не заўсёды атрымлівалася цалкам. Часьцяком клясыцыстычныя налепкі выглядалі зусім недарэчы, утвараючы месіва неспалучальных формаў. Да прыкладу, колішні касьцёл Дзевы Марыі, які ўжо ад уніятаў перайшоў да расейскае праваслаўнае царквы ў 1800 г., атрымаў клясыцыстычны галоўны фасад, якім замуравалі папярэдні фасад ракальны. Але глыбокая раскрапоўка, велізарная непадзеленая плошча шчыта й франтонаў пры вельмі плястычных, рытмічна падзеленых вежах, стварылі зусім алягічны вобраз. Больш дапасоўны апынуўся клясыцыстычны ўбор да гарадзенскае Фары Вітаўта, якая пасьля грунтоўнай рапарацыі 1804-1807 гг. была высьвечана на царкву Сьв.Сафіі. Буйнейшая гатычная базыліка Беларусі не магла перарабіцца часткова, таму збольшага ацалела да пазьнейшых расейскіх перабудоваў канца XIX ст., калі яе выгляд быў скалечаны радыкальна...

У выніку горадабудаўнічай дзейнасьці расейцаў у першай трэці XIX ст. бальшыня беларускіх урбаністычных цэнтраў (у першую чаргу на Ўсходзе) набыла і іншую структуру (выпрастаны й пашыраны вуліцы, пераплянаваны на рэгулярнай аснове кварталы), і іншае мастацкае аблічча (казённая забудова, адміністрацыйныя ансамблі ў стылі імпэрскага клясыцызму).

Але маштабны замах на горад у Бабруйску стаў знакам татальнае агрэсіі. Апроч ліквідацыі ўніяцтва, выкараненьня «пальшчызны» й сэгрэгацыі жыдоўства, расейцы ў Беларусі вынішчалі наогул усе праявы эўрапейскасьці. Паўстаньне 1831 г. разьвязала рукі і імпэратару Мікалаю І, і праваслаўнаму клеру, і ўсяму ўвогуле хаўрусу акупантаў. Усьлед за карнымі мілітарнымі акцыямі быў ліквідаваны Віленскі ўнівэрсытэт, дзе рыхтаваліся ўласныя тутэйшыя сілы архітэктараў і мастакоў. Касаваньне уніі, спыненьне дзеяньня «Статуту...», выгнаньне з краю каталіцкіх законьнікаў і захоп касьцельнае маёмасьці... азначалі канчатковы злом усіх інстытутаў, якія маглі захоўваць даакупацыйную сыстэму каштоўнасьцяў.

Буйнейшая апэрацыя расейскага ўрбіцыду ў мікалаеўскія часы — гэта зьнішчэньне старога Берасьця дзеля пабудовы гіганцкай крэпасьці, якая, паводле задумы стваральнікаў, павінна была абараніць Расею ад Эўропы. Стварыць тут фартэцыю прапанаваў яшчэ ў 1797 г. інжынэр Дэлаван. Але прыгадалі пра гэтую ідэю пры Мікалаі І. У 1830 г. праект быў складзены тым жа генэралам Апэрманам, а таксама Малецкім і Фельдманам. Працы па разбурэньні доўжыліся тры гады (1833-1836), пасьля чаго толькі пачалі будаўніцтва.

Адным ударам зьнішчалася старэйшае магдэбурскае места, дзе ў Мікалаеўскім саборы была падпісаная шматпакутная унія й дзеяла паўтузіну каталіцкіх кляштараў з касьцёламі выключна дасканалай архітэктуры, дзе была старэйшая ў краі сынагога й спрадвечнае апірышча кніжнай культуры, асьветы й духоўнасьці. Гэтая апэрацыя паводле сваіх маштабаў ня мае аналягаў у гісторыі новага часу.

Пасьля выгнаньня манаскіх законаў у спусьцелых кляштарах у 30-я гг. XIX ст. размяшчаліся турмы (кляштар бэрнардынак у Менску), вайсковыя кашары (бенэдыктынак у Нясьвіжы), казармы (езуітаў у Горадні, бэрнардынаў у Менску), склады (дамініканаў у Менску) і г.д. Зазвычай на высокіх франтонах і вежах касьцёлаў уладкоўвалі каланчы (дамініканаў у Слоніме й Менску, бэрнардынаў у Нясьвіжы і г. д.) З 1850-х гг. была праведзена кампанія па зьнішчэньню альбо пераабсталяваньню пад гандаль старых ратушаў (пераважна ўжо на Захадзе Беларусі). У 1851 г. рашэньне пра знос менскай ратушы прыняў сам імпэратар Мікалай І.

Ня слушна было б лічыць, што вынішчэньне традыцыйнага ўрбаністычнага асяродзьдзя, прадуманае й мэтанакіраванае, не сустракала супраціву з боку беларускай грамадзкасьці. Менская ратуша ўсё ж прастаяла да 1857 году... Супрацьстаялі, хто чым мог. Вваяры браліся за зброю, мастакі безупынна натавалі дарагія ўспаміны пра старасьвеччыну, публіцысты не забывалі адцеміць прыкметы зьдзічэньня. Міхал Леапольд фон Даманскі Гаўсман, родам з Брагіншчыны, сакратар Менскага дваранскага дэпутацкага сходу, пісаў: «...одному из распорядителей пришла блажь срыть ратушное здание, потому что своим существованием оно напоминало жителям об обычаях минувшего времени, о магдебургском праве, Литовском статуте и о прочем. Другому же понадобилось приказать срубить вековые тополя, потому что они будут мешать войску свободно маршировать и упражняться по бульвару, и вдруг не стало ни ратуши ни тополей...» Уладзіслаў Сыракомля заўважаў яшчэ больш лякано̆чна: «Касьцёл бенэдыктынак... імпануе сваёй старажытнасьцю сярод пераважна сучаснай забудовы Менску, дзе як бы наўмысна сьціраліся рысы мінулага». Гэта было напісана ўжо ў 1854 г.

На дзіва трывалыя былі нэрвы ў літаратараў-патрыётаў. У тыя часы на панадворках колішніх уніяцкіх цэркваў палалі вогнішчы з старых кніг, старасьвецкага царкоўнага ўбраньня. Рэч ня толькі ў тым, што бажніцы траплялі з адных рук у другія. Акупанты па сутнасьці зьнішчалі іх. Поўнаму зьнішчэньню падлягала разнастайная плястыка (яна адсутнічае ў праваслаўных цэрквах), выбіваліся бакавыя алтары, нават падлогі (!) перакладаліся ў адпаведнасьці з праваслаўным канонам. Тое ж тычылася і каталіцкіх касьцёлаў. Колькасьць зьнішчаных рухомых здабыткаў мастацтва не падлягае ніякім ацэнкам. Такія акцыі фіксаваліся рэдка, як, напрыклад, зьнішчэньне абраза Сальватора Розы «Пабіцьцё каменьнем першапакутніка Сьв.Стафана» з полацкага касьцёлу Сьв.Стафана падчас яго перарobкі на царкву.

Да паўстаньня 1863 г. беларускі ўрбаністычны асяродак па-сутнасьці перастаў

Якуб і яго пан. Ухвала Дэні Дыдро

Працяг са старонкі 9

мусілі ўвесьці танкі, каб навучыць іх, што такое любоў!

3.

Пачуцьцёвасьць неаддзельная ад чалавека, але робіцца небясьпечнай ад той хвіліны, як яе прыймаюць за вартасьць, за крытэрый праўды, за апраўданьне. Нацыянальныя пачуцьці, нават самыя ўзвышаныя, могуць такім чынам апраўдваць найгоршыя жахі, а чалавек, надзьмуты лірычнымі пачуцьцямі, можа нарабіць гнюсотаў у сьвятое імя любові.

Пачуцьцёвасьць, якая пагражае рацыянальнаму мысьленьню, робіцца грунтам непаразуменьняў і нецярпімасьці, як вызначыў Карл Густаў Юнг, — «супэрструктурай брутальнасьці».

Узьнясеньне пачуцьця на ўзровень вартасьці сягае далёка ў мінулае, хіба туды, дзе хрысьціянства аддзялілася ад юдаізму. «Любі Бога й рабі, што любіш», — казаў сьвяты Аўгустын. Славуты сказ — вельмі красамоўны, і крытэрый праўды гэткім чынам быў перанесены звонку ўсярэдзіну, да суб'ектыўнай сваволі.

Нявызначанасьць поўнага ласкі пачуцьця (любі Бога — хрысьціянскі імпэратыў) пагражае яснасьці Закону (імпэратыў юдаізму) і робіцца няпэўным крытэрыем маралі.

Гісторыя хрысьціянскай супольнасьці — гэта тысячагадовая школа пачуцьцёвасьці: Хрыстос на крыжы навучыў нас абагаўляць боль; рыцарская паэзія ле-

існаваць. І паўстаньне выходзіла ўжо з засьценкаў, хутароў, фальваркаў. Пасьля яго задушэньня ўсталявалася новая, цалкам імпартаваная форма гарадзкое культуры. Сярод дойлідаў, інжынэраў ды мастакоў, сотні якіх працавалі ў краіне, ужо фактычна не было тутэйшых.

Калі раней стала правілам усталяваньне нягеглых цюрбаноў-купалоў на кожнай забранай бажніцы, як на Мікалаеўскім касьцёле ў Міры, то цяпер тубыльцы бачылі перабудову ўжо старажытных праваслаўных цэркваў Беларусі. Акупацыйныя ўлады імкнуліся зрабіць тутэйшае праваслаўе больш праваслаўным. Перабудоўваюцца Прачысьценскі сабор у Вільні (праект 1864 г.), Барысаглебская царква ў Навагрудку (праект 1866 г.), Петрапаўлаўская царква ў Менску (перабудова з 1870 г.), ды шмат іншых. Мэтаю гэтых перабудоваў была поўная зьмена аблічча, наданьне цэрквам расейска-візантыйскага выгляду. Што такое «расейскі» выгляд, самі расейцы сабе тады не ўяўлялі. У «Трудах I археологического съезда» за 1871 г. слынны дасьледнік архітэктуры А.Увараў так пачынае свой артыкул: «Нашы архітэктурныя помнікі так мала падлягалі навуковай і грунтоўнай крытыцы, што не маглі дагэтуль дасягнуць прамога свайго прызначэньня — крыніцаў для вызначэньня характару расейскае архітэктуры». Беларусь стала палігонам выпрабаваньня «характару» расейскае архітэктуры, пошукаў яе «крыніцаў». Інтуітыўны мэтад, кампіляцыя ледзь не ва ўсіх усходніх стылях прыводзілі да трывіяльнае безгустоўшчыны, тым больш дзікае, што зьдзяйсьнялася яна на месцы зьнішчаных сапраўдных помнікаў. Новыя цэрквы, так званыя «мураўёўкі», клясыцыстычна-візантыйскага выгляду, па тыпавых праектах паўставалі цэлымі сэрыямі па ўсіх кутках Беларусі, нашмат больш інтэнсіўна, чым дзе ў Расеі. Цікава, што імёны архітэктараў, якія мелі такую магчымасьць для экспэрымэнтаў, зусім малавядомыя, а «мураўёўкі» — творы наогул ананімныя.

Пасьля надыйшлі часы ўжо поўнага трыумфу разбуральнікаў. Нарэшце пачалі эканоміць на перабудовах, проста ў рабочым парадку дабівалі тое, што было не даспадобы. Напрыклад, у чэрвені 1888 г. «...віцебскаму мешчаніну Нямёнаву прададзена на знос Барысаглебаўская царква за 175 р., з тым, каб ён пасьля зносу царквы сабраў сьмецьце й засыпаў яму...» Віцебская царква Сьвятых Барыса і Глеба — адна з самых старажытных бажніцаў Беларусі — дайшла да нас толькі ў выявах на дзьвюх акварэлях. Спэцыяльная камісія, прызначаная для агляду Мікалаеўскай царквы ў Магілёве, давала «кампэтэнтнае» заключэньне ў акце 1901 г.: «... сьцены прасьвечваюць цёмнымі плямамі контураў былога сьцяннога росьпісу... царкву ўнутры неабходна сашкрэбсьці... перафарбаваць... у розныя таны...» Цудам ацалелы сьценапіс XVII-XVIII ст. у Мікалаеўскай царкве сёньня — адзін зь нешматлікіх неацэнных здабыткаў беларускага барока.

На мяжы XIX-XX ст. былі расстаўленыя апошнія кропкі дасавецкага расейскага ўрбіцыду — гіганцкія саборы ў цэнтрах губэрнскіх і буйнейшых павятовых цэнтраў у клясычным нэарускім стылі (Горадня, Барысаў, Менск і г.д.). Супраць празьмернай амбіцыйнасьці й фармальнага рэтраспэктывізму ўжо змагалася культурная грамадзкасьць у самой Расеі. Мінімальная мастацкая якасьць сабораў была прадметам агульнага ганьбаваньня. М.Шчакаціхін заўважаў пра адзін з такіх «манумэнтаў», сабор Пятра й Паўла ў Менску, — «...самае нязграбнае збудаваньне ў горадзе...» А калісь гэтую бажніцу, царкву Сьв.Духа манастыра базыльянаў, падарожнікі ўважалі за адзін з найлепшых помнікаў краіны. Стольнік П.Талстой, едучы як дыплямат у 1697 г. праз Менск, адзначаў, што такіх бажніцаў «...мало в Польше обретается в каменном строении».

«Не люблю я места, па расейску горад...» — з прыкрасьцю выгукнуў у канцы мінулага стагодзьдзя паэт, які азваўся беларусам...

Здымак Анатоля Клешчука

галізавала каханьне, буржуазная сям'я дала нам адчуць тугу па дому, палітычнай дэмагогіі ўдалося сэнтымэнталізаваць прагу да ўлады. Усё багацьце, моц і прыгажосьць нашай пачуцьцёвасьці былі сфармаваныя гэтай доўгай гісторыяй.

Але з пачаткам Рэнэсансу заходняя пачуцьцёвасьць была выраўненая дадатковым духам — духам розуму й сумненьня, духам гульні і ўсьведамленьнем адноснасьці чалавечых справаў. У тую хвіліну Захад увайшоў у фазу сваёй паўнаты.

У сваёй славутай лекцыі ў Гарвардзе Салжаніцын зьмясьціў пачатак крызысу Захаду якраз у фазу Рэнэсансу. Ён разглядае Расею як самастойную цывілізацыю. Яе гісторыю ён адасабляе ад гісторыі Захаду якраз праз адсутнасьць эры Рэнэсансу й яе наступстваў. І гэта довад, чаму расейскі мэнталітэт ведае іншую раўнавагу паміж розумам і пачуцьцёвасьцю. І ў гэтай вось раўнавазе (ці нераўнавазе) хаваецца славутая таямнічасьць расейскае душы (яе і глыбіні, і брутальнасьці).

Калі ж цяжкая расейская ірацыянальнасьць звалілася на маю зямлю, я адчуў інстынктыўную патрэбу надыхацца з глыбіняў духам заходняга Новага часу. І мне здалося, што ён нідзе не сканцэнтраваны так, як у тым карнавале інтэлекту, гумару й фантазіі, якім ёсьць «Якуб фаталіст».

4.

Калі б я мусіў сам сябе вызначыць, то я сказаў бы, што я геданіст, кінуты ў пашчу страшна спалітызаванага сьвету. Гэта сытуацыя, пра якую распавядаюць мае «Сьмешныя ласкі», якія, дарэчы, падабаюцца мне больш, чым усе мае кнігі за тое, што ў іх адбітыя найшчасныя часы майго жыцьця. Дзіўнае супадзеньне: я дапісаў апошнюю навэлу (кніга пісалася на працягу ўсіх 1960-х гадоў) за тры дні перад уварваньнем расейцаў.

Калі ж у 1970 г. выйшла францускае выданьне гэтай кнігі, крытыка казала аб традыцыі стагодзьдзя Асьветы. Узрушаны такім параўнаньнем, я зь дзіцячай непасрэднасьцю паведамляў, што люблю Васемнаццатае стагодзьдзе. Калі казаць праўду, люблю я не так стагодзьдзе, як Дыдро. Калі быць больш шчырым: люблю ягоныя раманы. А калі быць больш дакладным — люблю ягонага «Якуба фаталіста».

Гэткае бачаньне твора Дыдро занадта асабістае, але, можа, не зусім беспадстаўнае, а менавіта: можна абыйсьціся без Дыдро — аўтара тэатральных твораў; можна спасьцігнуць гісторыю філязофіі, ня ведаючы твораў вялікага энцыкляпэдыста, але я настойваю на тым, што гісторыя рамана будзе зусім няпоўная й незразумелая без «Якуба фаталіста». Гэты твор церпіць ад таго, што ён дасьледаваны больш у кантэксьце твораў Дыдро, але ніколі — у кантэксьце сусьветнага раману. Ягоная сапраўдная веліч навідавоку нават побач з «Дон Кіхотам» альбо «Томам Джонсам», «Улісам» або «Фэрдыдуркам»(...)

9.

Чэскаму аўтару ў 70-я гады было дзіўна думаць пра тое, што «Якуб-фаталіст» (напісаны таксама ў 70-я гады) ніколі пры жыцьці аўтара ня быў надрукаваны й што толькі рукапісныя копіі маглі распаўсюджвацца сярод абмежаванай і даверанай публікі. Тое, што было выключэньнем у эпоху Дыдро, праз дзьвесьце гадоў стала ў Празе агульным лёсам усіх знакамітых чэскіх аўтараў. Друкарні былі для іх забароненыя, і яны маглі пабачыць свае кнігі толькі ў машынапісу. Гэта пачалося з расейскім уварваньнем, працягваецца цяпер і, праўдападобна, будзе працягвацца яшчэ.

Я напісаў «Якуба й яго пана» для сваёй асабістай уцехі і, магчыма, зь імглістай думкай, што ён можа быць пастаўлены калісьці ў адным з чэскіх тэатраў пад фальшывым імем. Замест подпісу расьцярушыў у тэксьце... некалькі ўспамінак пра мае папярэднія кніжкі... Пра «Вальс на разьвітаньне», які я напісаў прыкладна ў той самы час і быў перакананы, што гэта мой апошні раман. А ўсё ж я не перажываў таго разьвітаньня з горкім смакам асабістага крушэньня. Асабістае расстаньне мяшалася зь іншым, якое перапаўняла мяне: твар у твар зь вечнасьцю расейскай ночы я пражываў у Празе гвалтоўнае згасаньне заходняй культуры, такой, якой яна была пачатая на сьвітаньні Новага часу, заснаваная на індывідууме й ягоным розуме, на плюралізьме мысьленьня й талеранцыі. У маленькай заходняй краіне я пражываў заняпад Захаду. І гэта й было тое вялікае расстаньне.

10.

Разам зь непісьменным вяскоўцам-слугою пакінуў аднаго дня свой дом Дон Кіхот, каб змагацца з ворагамі. Сто пяцьдзесят гадоў пасьля яго засадзіў Тобі Шэнды сад на полі бітвы, аддаючыся ўспамінам аб змагарнай маладосьці разам з слугой Цімам. Той кульгаў дакладна як Якуб, што дзесяць гадоў пасьля таго забаўляў свайго пана на доўгім шляху. І быў такі ж упарты й балбатлівы, як сто пяцьдзесят гадоў пазьней жаўнер аўстра-вугорскай імпэрыі Швэйк, які весяліў і страшыў свайго пана обэрлейтэнанта Лукаша. Трыццаць гадоў пазьней пан і слуга «Канца гульні» Бекета трапляюць на цалкам спусьцелую сцэну сьвету. Шлях скончыўся.

Слуга й ягоны пан прайшлі праз усю сучасную заходнюю гісторыю. У Празе, месьце вялікага расстаньня, я чуў іх аддалены сьмех. Я ўслухваўся ў гэты сьмех зь любоўю й страхам, зь якім глядзяць на рэчы крохкія і хуткабежныя, якія асуджаны лёсам.

Пераклаў з францускай Віталь Зайка

СЬПІСЫ СУСЬВЕТНАЙ СПАДЧЫНЫ

Гэта тэма наступнага нумару «НН». Часам значнасьць помніка перарастае і нацыю, якая была яго стваральнікам, і дзяржаву, якая магла ім распараджацца. Пірамiды Эгіпту, Баальбэк, Барабадур — гэта тое, што належыць ужо ўсяму людзтву — каардынаты, адносна якіх вымяраюць вяршыні чалавечага генію. Але наша спадчына: ці то архітэктурны помнік, ці ўрбаністычны ансамбаль, унікальны краявід, некрануты закутак прыроды — увесь час адчувае на сабе наступ разбуральнага часу. Як захаваць? Адна з буйнейшых ініцыятываў у гэтым напрамку — прынятая ЮНЭСКО Канвэнцыя па ахове культурнай і прыроднай спадчыны. Пасьля ўхвалы Канвэнцыі ў 1972 г. быў створаны Камітэт з прадстаўнікоў 21 дзяржавы. Яго задача — паводле пэўных крытэрыяў ацэньваць унікальныя культурныя і прыродныя аб'екты і ўключаць іх у Сьпіс сусьветнай спадчыны. Кожная дзяржава, якая падпісала Канвэнцыю, прапануе Камітэту пералік прыродных і культурных каштоўнасьцяў, што існуюць на яе тэрыторыі. Калі нейкія з гэтых аб'ектаў Камітэт уключае ў свой Сьпіс, тады дзяржава мусіць атрымаць дапамогу ад міжнароднага Фонду сусьветнай спадчыны.

Такое прызнаньне дапамагае кожнай нацыі аб'ектыўна вызначыць вартасьць сваіх скарбаў, пазнаёміць зь імі людзтва ва ўсім сьвеце. У Сьпіс трапляюць толькі тыя аб'екты, што адпавядаюць фармулёўцы «выдатная ўнівэрсальная каштоўнасьць», крытэрыі якой увесь час удакладняюцца. Беларусь яшчэ не падала свайго сьпісу нацыянальных скарбаў. Што можна ў нас параўнаць з Эвэрэстам альбо саборам у Шартры? Пра гэта й пойдзе гутарка ў матэрыялах наступнага нумару «НН».

ВІЛЕНСКІ КЛЮБ

26 кастрычніка споўніцца 50 гадоў з дня далучэньня Вільні й часткі Віленшчыны да Літвы. Гэты юбілей ужо стаў нагодаю для ажыўленьня вядомай польска-літоўскай спрэчкі, у якой палітыкі зазвычай імкнуцца ўдаваць гісторыкаў, а гісторыкі зьбіваюцца на палітыку. Літоўцы гавораць пра міжваенную акупацыю краю, палякі, маючы на ўвазе наступны пэрыяд гісторыі, намякаюць на тое ж. Эпізод з далучэньнем краю да БССР, калі НКВД зьнішчала інтэлігенцыю й вывозіла ў Менск каштоўнасьці, і палякамі, і літоўцамі падаецца як савецкая акупацыя, з чым нельга не пагадзіцца. Праўда, на гэтым беларускі аспэкт праблемы абодва бакі лічаць вычарпаным, з чым пагадзіцца ўжо нельга. Бо з поля зроку выпадаюць беларусы-некамуністы, а таксама апалітычнае беларускае насельніцтва краю. Беларус — значыць, бальшавік, агент Масквы, — такую формулу, вымысьленую польскімі ўладамі ў міжваенны час, ахвотна пераняў наступныя гаспадары Вільні, у тым ліку й літоўскія гісторыкі. Калі ж які беларус паспрабуе ўклініцца ў спрэчку з сваімі аргумэнтамі пра беларускую мову краю, пра гімназію, музэй, мноства далёкіх ад камунізму беларускіх арганізацый і пэрыядычных выданьняў у міжваеннай Вільні, — яму адразу ўкажуць на дзьверы. Належала Вільня да Польшчы, стала належаць да Літвы. Ніякай Беларусі не было. А пра прэтэнзіі з боку БССР няхай клапоціцца БССР. Вільня ня зьведала ўласна «беларускай акупацыі» — на тым прававым узроўні, на якім зьведала расейскую, польскую і літоўскую. Што да Літвы, то яна атрымала горад яшчэ як Літоўская Рэспубліка, а не як ЛССР. І юрыдычна тут усё ў парадку. Іншая рэч — маральны й культурны аспэкты праблемы. У гэтым сэнсе бакі ніяк не прадстаўляюць інтарэсы гораду й краю, а толькі кожны свае нацыянальныя інтарэсы. І ў кожнага дастаткова зацятасьці, каб спрэчка цягнулася вечна. Магчыма, праз нейкі час, напакаваўшы свой юрыдычны партфэль, у спрэчку ўшчэмяцца-ткі й беларусы. І тады ўжо тры ваўкі будуць выць на самотны месяц, імя якому Вільня. Пабачыўшы на сваім вяку ўладароў усякіх вераў і моваў, горад, які стаў супольным творам розных нацый і культураў, маўкліва працівіцца ролі праваднiка якой-небудзь адной нацыянальна-дзяржаўнай ідэалёгіі... Мы мяркуем пазнаёміць Вас зь літоўскім поглядам на падзеі 50-гадовай даўніны.

А ТАКСАМА:

АНКЕТА «НН». Пяць лепшых беларускіх гістарычных кніг пасьляваеннага часу. На анкету адказваюць спэцыялісты і ўвогуле дасьведчаныя людзі. Асаблівасьць анкеты — трэба ўказаць крытэрыі, паводле якіх тая ці іншая кніга — лепшая сярод іншых.

ТОМАС ПІНЧАН. «Вясёлка гравітацыі» у перакладзе Яна Максімюка.

«НЕ ПАКІДАЙЦЕ ж мовы нашай беларускай». Інтэрвію Чэслава Мілаша, якое ён даў спэцыяльнаму карэспандэнту «НН» у Варшаве.

АДАМ ГЛЁБУС. Кароткі раман пра каханьне. «... Клянуся сваімі прашчурамі, у мяне была толькі адна жанчына — мая стрыечная прапрабабка. Ёй споўнілася якраз сто адзінаццаць гадоў, найкруглейшы юбілей — 111. А ў якасьці падарунку яна запатрабавала мяне. Між намі была роўна стагадовая адлегласьць. Адмовіцца я ня змог, бо ў беларусаў такі звычай — любіцца з прапрабабкамі і прапрадзядамі. У нас найвялікшае сьвята так і называецца — Дзяды. А калі б я і адмовіўся, дык мяне зарэзаў бы родны стрыечны брат. Спачатку, пасьля адмаўленьня, я выпіў бы шклянку настоенай на дубовай кары гарэлкі і заснуў, а брат перарэзаў бы маё дзіцячае горла сьвяшчэнным нажом. Што можа быць лепей за ціхую сьмерць у сьне?..»

ДВАНАЦЦАЦЬ АПОСТАЛАЎ

Сяргей Рыбчонак

Тэма гэтага артыкула — славутыя скарбы Радзівілаў, іх ахутаны таямніцамі лёс, а таксама разрабаваньне Нясьвіскага замка ў 1812 годзе.

Крыху гістарыяграфіі

Спэцыяльнага дасьледаваньня гэтай праблемы не было наогул: у друкаваных крыніцах маюцца толькі згадкі, пра якія трэба сказаць больш падрабязна.

Спачатку пра апосталаў. Толькі нямногія сьведкі пакінулі іх апісаньне. А.Чартарыйскі, які на пачатку XIX ст. быў міністрам замежных спраў Расейскай імпэрыі, згадваў «Багаты замак у Нясьвіжы. У 18 залях адных толькі упрыгожваньняў сабралася на 5 альбо 10 мільёнаў дукатаў. Каштоўныя калекцыі зброі, кніг, брыльянтаў. Але няма нічога больш дарога за калекцыю «12 апосталаў», 5 зь іх чыстага золата і ўсыпаныя каштоўнымі камянямі». Падобнае апісаньне даў і расейскі пасол у Польшчы Рапнін, які разам з каралём гасьцяваў у Нясьвіжы ў 1784 г. Пазьнейшыя дасьледнікі скульптураў ня бачылі, таму іх сьведчаньні розьняцца ў велічыні, матэрыяле й іншых дэталях.

Шмат хто з гісторыкаў спрабаваў адказаць на другое пытаньне: куды й калі апосталы разам зь іншымі скарбамі зьніклі? Арыенцірам тут павінны былі стаць словы Мірковіча пра тое, што «Яны (гарматы. — **С.Р.**) і цяпер ляжаць у склепе, дзе ў таямніцы хаваліся скарбы, разрабаваныя атрадам Тучкова».[1]

Першым сур'ёзным дасьледнікам стаў Ул.Сыракомля. Спачатку ён напісаў разьдзел пра гісторыю Нясьвіжа ў «Старажытнай Польшчы», дзе згадаў калекцыю апосталаў, а пазьней, папрацаваўшы ў нясьвіскім архіве Радзівілаў, выдаў «Вандроўкі па маіх былых аколіцах», дзе, на жаль, не адзначыў, хто і як разрабаваў замак.

У 1855 г. П.Шпілеўскі таксама запісаў нясьвіскія паданьні, але зрабіў гэта некрытычна: скульптуры ў яго набылі натуральную велічыню, а зьвесткі пра разрабаваньне замка наогул зьніклі.

Адам Кіркор, аўтар артыкула ў «Живописной России», якую выдаў П.М.Сямёнаў-Цяньшаньскі, нагадаў пра ўдзел расейскіх войскаў у разрабаваньні Нясьвіжа. Але В.П.Сямёнаў-малодшы, адмовіўшыся ад крытычнасьці Кіркора і амаль дакладна перапісаўшы Шпілеўскага, стаў наступным мітатворцам.

Пасьля рэвалюцыі гэты міт працягваў разьвівацца. Пакуль В.Чантурыя нарэшце не паведаміў цывілізаванаму сьвету, што Нясьвіж разрабавалі фашысты. Польскія навукоўцы (Б.Таўрагінскі) тымчасам, не ўдакладняючы дэталяў, пісалі аб разрабаваньні скарбаў у 1812 г. расейскімі войскамі.

Сёньняшнюю інтэрпрэтацыю старога міту ў сваёй папулярнай, хоць і ня вельмі дакладнай рабоце «Скарбы Нясьвіжа» дае К.Шышыгіна. Напэўна, ёсьць сэнс нагадаць яго зьмест.

Апошні нясьвіскі ардынат князь Дамінік Радзівіл прыняў удзел у паходзе Напалеона на Маскву. На зваротным шляху ён заехаў у замак і дамовіўся з дазорцам, дзе схаваць скарбніцу. Усё астатняе багацьце Дамінік загадаў пагрузіць на фурманкі й адправіць за ім усьлед. Але тут у Нясьвіж уступілі расейскія войскі пад кіраўніцтвам адмірала Чычагава, і... фурманкі адправілі на Маскву. Дазорца Бургельскі паслаў да князя ганца, якога злавілі каля Міра й расстралялі. Зь ліста быццам бы даведаліся, што скарбніца схаваная, як дамоўлена. Дазорца не адкрыў схову й быў павешаны на браме. Сам Дамінік, сьмяротна паранены, у хуткім часе памёр. Але скарб да сёньня так і не знайшлі.

Навошта Радзівіл прадаў аднаго Апостала?

Склад радавой скарбніцы Радзівілаў на працягу часу мяняўся, таму найбольш поўны рэестар мог быць створаны толькі ў самым пачатку XIX ст. І такія дакумэнты знайшліся ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусі.

На загад князя Дамініка 1 сьнежня 1808 г. была распачатая рэвізія скарбніцы, якую скончылі ў красавіку 1809 г. Гэтая праца праводзілася для перазахаваньня калекцыі, а таксама для праверкі наяўнасьці й азнаямленьня ўладальніка з каштоўнасьцямі. Рэвізоры перагледзелі кожную рэч з дванаццаці пакаў і старанна занатавалі ўсё, што лічылі патрэбным: зброя, напрыклад, патрабавала чысткі ад іржы, мінэралы й іншыя прыродазнаўчыя прадметы перадаваліся ў бібліятэку і г.д.

Найбольшую цікавасьць для нас мае частка калекцыі пад назвай «Цы(м)борыюм Сьвятога Міхала». Цыборыюм (у праваслаўнай традыцыі ківор) — асобнае збудаваньне ў храме для ахвяраваньняў, у нашым выпадку, напэўна, надбудова над алтаром ці сам алтар. Як сьведчыць дакумэнт, у калекцыі меліся срэбныя дзьверцы да гэтага цыборыюму, а таксама «фігуры для дэкарацый тых жа дзьвярэй належныя срэбныя пазалочаныя, а менавіта Хрыстос з Сьв. Янам, на плячы яго заснулым, у палову фігуры, Частка Шаты таго ж сьвятога Яна, два апосталы, што сядзяць у поўных фігурах у шатах пазалочаных, два апосталы па грудзі з шатамі пазалочанымі, тры галавы апосталаў з часткай шаты пазалочанай і галоўка срэбная Юды — усіх адзінаццаць штук».

Выходзіць, так званыя апосталы не былі асобнымі скульптурамі, як меркавалі дасьледнікі, а скаладаліся ў кампазыцыю на дзьвярах, якія, у сваю чаргу, упрыгожвалі цыборыюм. Таксама адназначна вырашаецца пытаньне выкарыстанага матэрыялу — срэбра й пазалота для адзеньня. Праблема велічыні апосталаў застаецца пакуль адкрытай, але можна дапусьціць, што найбольшыя зь іх былі даўжынёй у адзін-два локці. Дарэчы, У.Сыракомля таксама згадваў такія памеры.

Найбольш спрэчная праблема часу й месца паходжаньня апосталаў. Невядома, адкуль К.Шышыгіна ўзяла фантастычныя зьвесткі пра іх зьяўленьне ў пачатку XVII ст. з Канстанцінопаля. Сам разьдзел калекцыі, ў які запісаныя фігуры, сьведчыць, што раней іх гаспадаром мог быць толькі касьцёл Сьв. Міхала ў Нясьвіжы, або навіцыят езуітаў пры ім. Трапіць да Радзівілаў яны маглі не раней, чым пасьля скасаваньня езуіцкага ордэну ў Рэчы Паспалітай, г.зн. у 1773 г., або наогул у 1786 г., калі, як сьведчыць Б.Таўрагінскі, касьцёл і кляштар былі зачыненыя й пераўтвораныя ў шпіталь. Сам касьцёл Сьв. Міхала быў збудаваны ў 1584-93 гг., навіцыят езуітаў пры ім адкрыўся ў пач. 17 ст., а ў 1736-38 гг. Міхал-Казімер Радзівіл «(Рыбанька) нанова збудаваў і ўпрыгожыў храм. Менавіта тады, на нашу думку, і быў зроблены ўвесь цыборыюм, у тым ліку скульптуры апосталаў.

Гэтую вэрсію, як і мясцовае паходжаньне скульптураў, падмацоўвае аналіз калекцыі, бо ня толькі цыборыюм трапіў да Радзівілаў, але й іншыя касьцельныя рэчы. Напрыклад, «Абраз (у арыгінале *Votum*) чвартковы з выявай Сьв. Міхала ад Калегіюма Нясьвіскага Калегіюму Сьв. Міхала даны ў 1706 г.» Сустракаюцца яшчэ падарункі ад Радзівілаў, Сакалінскага, Абуховіча, Гансеўскага і іншых у 1596-1761 гг. Таму лягічна дапусьціць, што цыборыюм, які складаўся больш чым з 40 асобных прадметаў, пераважна з срэбра, ня можа ўваходзіць у іх лік. А гэта пацьвярджае, што калекцыя славутых апосталаў была зробленая ў 1720-30-я гг. у Нясьвіжы.

Прабачце, — скажа ўважлівы чытач, — усе дасьледнікі пішуць пра 12 фігур, а ў сьпісе іх пазначана толькі 11. У сувязі з гэтым можна выказаць два меркаваньні. У крыніцах ёсьць згадкі, што Пане Каханку вазіў калекцыю за сабой і пры патрэбе грошаў раз-пораз закладваў Сьв. Мацея ці Луку. Але цяжка паверыць, што ён забыўся калісьці выкупіць. Хутчэй за ўсё, адна фігура (пашкоджаная) была пераплаўленая на срэбра: у дакумэнтах, напрыклад, ёсьць падобны загад князя Дамініка ад 17 лютага 1809 г. Невядома таксама, куды падзеліся і 4 евангелісты, пра якіх пісаў У.Сыракомля, бо знайсьці іх у рэестры нам не пашанцавала.

Як Бургельскі стаў нягоднікам, а генэрал Тучкоў — злодзеем?

Цяжка паверыць, што амаль усе дасьледнікі XIX і XX ст., якія працавалі з архівам Радзівілаў, не глядзелі дакумэнтаў пра разрабаваньне замка ў 1812 г. Але вельмі падобна на тое. Апроч хіба У.Сыракомлі, які, напэўна, спадзяваўся вярнуцца да гісторыі Нясьвіжа больш грунтоўна, ды Адама Кіркора, які згадаў адным сказам: «...Скарбы разрабаваныя войскамі Чычагава ў 1812 г.»

Пачатак XIX ст. стаў для Беларусі чарговым выпрабаваньнем. Паверыўшы генію Напалеона й ідэям францускай рэвалюцыі, шляхцюкі кінуліся аднаўляць незалежнасьць Бацькаўшчыны. Малады й гарачы ўладальнік Нясьвіжа князь Дамінік таксама пайшоў на Маскву, нават сфармаваў на ўласныя грошы асобны ўланскі полк. На зваротным шляху ён, напэўна, заехаў у Нясьвіж, але наўрад ці зьбіраўся узяць радавыя багацьці з сабой. А ўжо 30 кастрычніка ў горад увайшоў корпус Тучкова з малдаўскай арміі Чычагава. Далейшыя падзеі лепш за ўсё пераказаць паводле рапарту тагачаснага дазорцы замку Альбэрта Бургельскага, якога расейцы, на жаль, не павесілі на браме.

Пачуўшы ад мясцовых жыдоў, што Радзівілы хаваюць вялікія скарбы, уланскі палкоўнік Кнорынг заявіўся ў замак, адабраў у дазорцы ключы й пасадзіў Бургельскага за краты. Праз некалькі дзён прыехаў Тучкоў і ўчыніў дазорцу допыт. Спачатку ўгаворвалі словамі, а пасьля зьбілі на яго вачох бізунамі й палкамі некалькіх служкаў, пагражаючы зрабіць тое самае з Бургельскім. Той спалохаўся (але не забыўся выпатрабаваць у Тучкова паперу аб прымусе адкрыць сховішча) і паказаў, дзе знаходзіцца лёх. Тучкоў загадаў разламаць мураваную сьцяну, убачыў велізарнае багацьце й хацеў ўсё прысвоіць. Тым часам навіна дайшла да Чычагава. Адмірал адабраў у Тучкова ключы, стварыў з вышэйшых афіцэраў камісію й загадаў забіраць скарбы. Забіралі ўсё, у тым ліку, як піша Бургельскі, «серебро и золото в разных особенных штуках...» Каштоўнасьці былі складзены на некалькі дзясяткаў брычак, якія Чычагаў забраў з сабою. Тое, што пакінулі, яшчэ тры дні разьбіралі войска й мясцовыя жыды.

3 сьнежня сквапны Тучкоў са сваім корпусам зноў завярнуў да Нясьвіжа, зноў пасадзіў Бургельскага за краты й загадаў не даваць яму есьці, пакуль апошні не пакажа яшчэ сховішчы. Дзякуй Богу, што ў генэрала хапіла розуму не замарыць голадам адзінага сьведку! Затое ён забраў апошняе, што заставалася. У цэлым, паводле падлікаў дазорцы, шкоды ў адным замку было нанесена мінімум на 10 мільёнаў польскіх злотых[2].

Вось як скончылася наша скарбашукальніцтва. Адзіны, напэўна, станоўчы вынік — гэта спадзяваньне, што нясьвіжцы больш ня будуць перакопваць свой горад, зьнішчаючы рэшткі культурных пластоў.

Пасьляслоўе

Бургельскі пражыў яшчэ 13 гадоў. Паводле яго рапарту ад 5 студзеня 1813 г., над рабаўнікамі пачалася крымінальная справа. Загадам фэльдмаршала Кутузава Тучкоў быў вызвалены ад пасады й апынуўся пад сьледзтвам. Разбор зацягнуўся аж да 1826 г., пакуль Аўдытарыяцкі Дэпартамэнт ня вынес канчатковую канфірмацыю: «... генерал-майор Тучков ни в каких злоупотреблениях или покорыствованиях не доказан...»[3]

Тым часам у 1822 г. улады сканфіскавалі ў Бургельскага куфар срэбра (напэўна, з рэшткаў скарбніцы), які пералічылі на ўплату радзівілаўскіх даўгоў. Спадчыньніца роду княжна Стэфанія Вітгенштэйн таксама выклікала былога дазорцу ў суд, але справа цягнулася больш за 10 гадоў і скончылася безвынікова.

Што да скарбаў, дык іх лёс склаўся, напэўна, так. Адмірал Чычагаў перадаў скарб імпэратару Аляксандру I[4]. Каштоўнасьці захоўваліся ў Расеі да пачатку XX ст., пакуль Марыя дэ Кастэляні, удава князя Антона Радзівіла, не папрасіла ў 1905 г. аб іх звароце імпэратара Мікалая II.[5] У некаторых крыніцах нават адзначаецца, што ёй нешта вярнулі, але сёньня толькі адныя Радзівілы ведаюць, што менавіта. Лягічна таксама дапусьціць, што нешта скраў Чычагаў, які пасьля адстаўкі хуценька зьбег у Францыю і да сваёй сьмерці ў 1849 г. так і не зьявіўся на радзіме.

Нам жа застаецца толькі верыць, што прыйдзе некалі час, і скарбы вернуцца, як вяртаюцца ў нашу гісторыю князі Радзівілы.

[1] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 257.

[2] НА РБ. Ф. 694, воп. 4, сп. 5230, арк. 2-6.
[3] Александров Г.Н. Черты из жизни Сергея Александровича Тучкова // Русский архив, кн. I. СПб., 1874. С. 1143-1145.
[4] Попов А.Н. Отечественная война // Русская старина, 1877, №9, С. 70.
[5] НА РБ. Ф. 694, воп. 4, сп. 5230, арк. 2-6.

АЛЬБАТРОС

Шарль Бадлер

Здараецца, што ловяць для забавы
Вялізных птушак-альбатросаў маракі,
Тых самых, што падчас марской выправы
За караблём усьлед вандруюць напрасткі.

Кладуць на дошкі іх — і гэты князь блакіту,
Адважны й спрытны ў час палёту птах,
Няўклюдна цягне крылы, што, нібыта
Два цяжкія вяслы, зьвісаюць па баках.

Імклівы ў небе, надзвычайнай прыгажосьці —
На палубе такі нязграбны й сьмешны ён!
Пад рогат яму ў дзюбу пхае люльку хтосьці,
А нехта дражніць, сьвішча наўздагон...

Паэт падобны рыхт у рыхт да князя хмараў,
Які сьмяецца зь Перуна й праз шторм ляціць;
Ды, зрынуты на дол з падвоблачных абшараў,
Праз крылы доўгія ня можа ён хадзіць.

Пераклад А.М.



НЯМЕЦКАЕ АПАВЯДАНЬНЕ

Эрых Кэстнэр

КАЗКА ПРА ШЧАСЬЦЕ

Гадоў семдзесят было яму, старому чалавеку, які сядзеў насупраць мяне ў пракураным шынку. На валасы ягоныя, здавалася, выпаў сьнег, а вочы блішчэлі, як вычышчаныя да бляску мэталёвыя гузікі.

— О, людзі дурныя, — сказаў ён і патрос галавою так, што я падумаў: зараз мусілі б паляцець сьняжынкі. — Шчасьце, у рэшце рэшт, — гэта ня вэнджаная кілбаса, ад якой кожны дзень можна дазволіць сабе кавалак.

— Слушна, — згадзіўся я, — шчасьце ня мае ў сабе нічога вэнджанага. Хоць...

— Хоць?

— Хоць якраз вы выглядаеце так, быццам у вас дома ў вяндлярні вісіць кумпяк шчасьця.

— Я выключэньне, — сказаў ён і зрабіў глыток. — Я акурат той чалавек, які мае яшчэ адно жаданьне.

Ён дапытліва паглядзеў мне ў твар, а пасьля распавёў сваю гісторыю.

— Гэта было даўно, — пачаў ён і абапёр галаву на абедзьве рукі, — вельмі даўно. Я быў яшчэ малады й мучыўся з жыцьцём, як з апухлай пашчэнкай. І вось, калі я, сярдзіты, сядзеў аднойчы апоўдні на лаўцы ў парку, падсеў да мяне стары чалавек і сказаў як бы паміж іншым: «Добра. Мы тугака ўсё прыдумалі. У цябе ёсьць тры жаданьні». Я ўнурыўся ў газэту й зрабіў выгляд, што нічога не пачуў. «Загадвай сабе, што хочаш, — працягваў ён, — пекную кабету, шмат грошай або найвялікшую бараду, — гэта твая справа. Але стань нарэшце шчасьлівы! Твая незадаволенасьць нэрвуе нас». У яго быў выгляд Дзеда Мароза ў цывільным уборы. Белая пышная барада, шчокі чырвоныя, як яблыкі, бровы быццам з ваты, якой упрыгожваюць каляднае дрэўца. Нічога ненармальнага. Можа хіба занадта дабрадушны. Разгледзеўшы яго добра, я зноў утаропіўся ў газэту. «Хоць нас і ня тычыцца, што ты зробіш з сваімі трыма жаданьнямі, — сказаў ён, — але было б добра, каб перад тым ты дакладна ўсё абдумаў. Бо тры жаданьні — гэта не чатыры жаданьні й не пяць, а тры. І калі б ты пасьля гэтага застаўся па-ранейшаму зайздросны й нешчасьлівы, дык мы не змаглі б больш дапамагчы ні табе, ні сабе». Ня ведаю, ці можаце вы зразумець мой стан. Я сядзеў на лаўцы й наракаў на Бога й на сьвет. Удалечыні званілі трамваі. Дзесьці ганарова ішоў да замка парад варты. А побач сядзеў гэты стары балбатун.

— Выззлаваліся?

— Я злаваўся. Я быў нібы той кацёл, што вось-вось трэсьне. А калі ён сабраўся зноў адкрыць свой дзядоўскі бела-ватны рот, я, трасучыся ад гневу, выпаліў: «Каб вы, стары казёл, мне больш ня тыкалі, я дазволю сабе выказаць сваё першае й запаветнае жаданьне — ідзіце да д'ябла!» Гэта было нядобра й нявегліва, але йнакш я ня мог. Мяне б папросту разарвала.

— І?

— Што «і»?

— Ён зьнік?

— А-а! Безумоўна, ён зьнік. Як садзьмула. У той жа момант. Растварыўся. Я нават паглядзеў пад лаўку. Але й там яго не было. Мне зрабілася страшна. Справа з жаданьнямі была, відаць, сапраўдная! І першае жаданьне ўжо зьдзейсьнілася! Божа мой! А калі яно зьдзейсьнілася, то добры, любы, вясёлы дзядуля ня проста прапаў, ня проста зьнік з маёй лаўкі, не, ён быў у д'ябла! Ён быў у пекле! «Ня строй дурня, — сказаў я сам сабе, — пекла ж няма й д'ябла таксама». А тры жаданьні? Стары чалавек, як толькі я пажадаў, зьнік... Мне было то горача, то халодна. Затрэсьліся калені. Што рабіць? Старога чалавека трэба вярнуць назад, што б там ні было. Гэта мой доўг перад ім. Я мусіў скарыстаць маё другое жаданьне, другое з трох, о, я асёл! А можа мне трэба было пакінуць яго там, дзе ён быў? Зь ягонымі прыгожымі чырвонымі шчокамі-яблыкамі? «Печанымі яблыкамі», — падумаў я ў жаху. Я заплюшчыў вочы й прашаптаў: «Я хачу, каб стары чалавек зноў сядзеў побач са мной». Вы ведаеце, я пасьля нават у сьне папракаў сябе, што такім вось чынам прафукаў другое жаданьне, але тады я ня бачыў выйсьця. Яго не было....

— І?

— Што «і»?

— Ён зьявіўся?

— А-а! Безумоўна, ён зноўку быў тут! У той самы момант. Ён зноў сядзеў побач, быццам ніколі й не зьнікаў. Але было відаць, што ён... што ён дзесьці быў, там, дзе д'яблы, я маю на ўвазе там, дзе павінна быць вельмі горача. О, так. Густыя белыя бровы крыху абгарэлі. Нязначна пацярпела й цудоўная пышная барада. Асабліва па баках. Акрамя гэтага, пахла ад яго, як ад абсмаленага гусака. Ён паглядзеў на мяне з папрокам. Пасьля дастаў з нагруднай кішэні шчотачку для барады, пачысьціў яе й бровы й сказаў пакрыўджана: «Паслухайце, малады чалавек, з вашага боку гэта было нядобра». Я прамямліў словы прабачэньня. Маўляў, мне вельмі шкада. Я ж не паверыў у тры жаданьні. І што ўсё ж такі я спрабаваў заплаціць дабром. «Слушна, — сказаў ён, — самы час». І засьмяяўся. Ён засьмяяўся так дружалюбна, што ў мяне ледзь ня выступілі сьлёзы. «Ну, вось, у вас засталося толькі адно жаданьне, — сказаў ён, — трэцяе. Зь ім вы будзеце, спадзяюся, крыху больш абачлівы. Вы абяцаеце?» Я кіўнуў і праглынуў сьліну. «Так, — сказаў я пасьля, — але толькі тады, калі вы ня будзеце мне зноў тыкаць». Ён засьмяяўся. «Добра, мой хлопча, — сказаў ён і падаў мне руку. — Будзь здаровы. І ня будзь вельмі нешчасьлівы, пільнуй сваё апошняе жаданьне.» «Я абяцаю вам гэта», — адказаў я ўзьнёсла. Аднак яго ўжо не было. Як садзьмула.

— І?

— Што «і»?

— З таго часу вы шчасьлівы чалавек?

— А-а! Ці шчасьлівы? — мой сусед устаў, узяў зь вешака капялюш і паліто, паглядзеў на мяне сваімі бліскучымі вачыма й сказаў:

— Да апошняга жаданьня я не дакранаўся цэлых сорак гадоў. Калі-нікалі я быў блізкі да гэтага. Але не. Жаданьні добрыя толькі тады, калі яны яшчэ перад табой. Бывайце здаровы.

Я ўбачыў праз вакно, як ён перашоў на другі бок вуліцы. Сьняжынкі скакалі вакол яго. Ён так і не сказаў мне, ці шчасьлівы хоць крыху. А можа, ён не адказаў наўмысна? Магчыма, і так.

Макс Фрыш

ГІСТОРЫЯ ПРА ІЗІДОРА

Я раскажу вам невялічкую гісторыю пра Ізідора. Праўдзівую гісторыю! Ізідор быў аптэкарам, а гэта значыць, дабрасумленным чалавекам, які прытым няблага зарабляў; ён быў бацькам некалькіх дзяцей і мужам у найлепшым узросьце мужчыны, і няма патрэбы падкрэсьліваць, што Ізідор быў верным мужам. Нягледзячы на гэта, ён не выносіў пастаянных роспытаў пра тое, дзе ён быў. У выніку ён мог стаць разьюшаны, унутрана разьюшаны, зьнешне нічога нельга было заўважыць. Бо ў прынцыпе, як ужо сказана, гэта было шчасьлівае сямейнае жыцьцё. Аднойчы цудоўным летам яны, як гэта тады было ў модзе, выправіліся ў падарожжа на Маёрку, і, нягледзячы на яе пастаянныя роспыты, якія крыху злавалі яго, усё йшло як найлепей. Пекны Авіньён зачараваў іх абодвух, яны хадзілі пад руку. Ізідор і ягоная жонка, якую трэба ўяўляць сабе надзвычай сымпатычнай жанчынай, былі мужам і жонкай ўжо дзевяць гадоў, калі яны прыехалі ў Марсэль. Міжземнае мора блішчэла, як на плякаце. На злосьць сваёй палавіне, якая ўжо стаяла на параходзе, што адплываў на Маёрку, Ізідор у апошні момант павінен быў купіць нейкую газэту. Магчыма, ён рабіў гэта з чыстай упартасьці ў адказ на яе пытаньні, куды гэта ён ідзе. Бог сьведка, ён ня ведаў; ён вырашыў крыху прайсьціся, як гэта робяць усе мужчыны, пакуль іх параход яшчэ не адчальвае. З чыстай упартасьці, як ужо сказана, ён паглыбіўся ў францускую газэту, і ў той час, калі ягоная жонка сапраўды плыла на маляўнічую Маёрку, Ізідор, пачуўшы грозныя гудкі й адарваўшы нарэшце вочы ад газэты, апынуўся не каля жонкі, а на даволі брудным грузавым судне, якое, перапоўненае гаманлівымі мужчынамі ў жоўтай форме, таксама было пад парай. Якраз адвязвалі тоўстыя канаты. Ізідор убачыў толькі, як адцаляецца пірс. Ці то неймаверная сьпякота, ці то ўдар у сківіцу францускага сяржанта адабраў у яго памяць, — я не магу сказаць; аднак магу сьцьвердзіць, што Ізідор, аптэкар, меў у Замежным Легіёне нашмат больш цяжкае жыцьцё, чым дагэтуль. Пра ўцёкі не было што й думаць. Жоўты форт, дзе Ізідор быў выхаваны на мужчыну, адзінока стаяў у пустэльні, у якой Ізідор навучыўся цаніць захад сонца. Безумоўна, ён думаў часам пра сваю жонку, калі ня быў вельмі стомлены, і пэўна, напісаў бы ёй, аднак пісаць было забаронена. Францыя ўсё яшчэ змагалася, каб утрымаць свае калёніі; такім чынам, Ізідор шмат павандраваў па сьвеце, аб чым ніколі раней ня мог і падумаць. Ён забыў сваю аптэку, гэта ясна, як іншыя забываюць сваё крымінальнае мінулае. З часам Ізідор нават не адчуваў тугі па краіне, якая была яго айчынай. Прамінула шмат гадоў, і вось аднойчы пекнай раніцай Ізідор увайшоў праз садовыя весьнічкі, барадаты, худы — такі ён цяпер быў, трапічны шалом пад пахаю — каб суседзі яго ўласнага дому, якія ўжо даўно залічылі аптэкара да мёртвых, не спалохаліся ягонага незвычайнага ўбранства; безумоўна, меў ён і дзягу з пісталетам. Быў нядзельны ранак, дзень нараджэньня ягонае жонкі, якую ён, як ужо сказана, кахаў, хоць за ўсе гэтыя гады ніколі не напісаў нават паштоўкі. На нейкі момант — перад вачыма той самы ягоны дом, рука яшчэ на садовых весьнічках, якія былі не змазаныя й рыпелі, як і калісьці — ён завагаўся. Пяцёра дзяцей, усе не без падабенства да яго й як адзін падрослыя на сем гадоў, крычалі ўжо здалёк: татка. Назад дарогі не было. І Ізідор памаршаваў далей, як мужчына, якім ён стаў у жорсткіх баях, і з надзеяй, што ягоная каханая жонка, калі яна дома, не паставіць яго перад неабходнасьцю гаварыць. Ён прайшоў па траўніку, нібы вяртаўся, як звычайна, са сваёй аптэкі, а не з Афрыкі й Індакітаю. Жонка сядзела анямеўшы, пад новым сонечным парасонам. Цудоўнага пэнюару, які быў на ёй, Ізідор ніколі ня бачыў. Служанка — таксама новая — адразу прынесла

Працяг на старонцы 14

Жыдоўскія жарты

АД ПЕРАКЛАДЧЫКА

Будучы паводле сваіх прафэсійных заняткаў чалавекам далёкім ад літаратуры, тым больш ад перакладной, рызыкну-ткі прапанаваць шаноўным чытачам нізку жыдоўскіх показак у сваім тлумачэньні. І вось чаму.

Аднаго разу ў пошуках добрага настрою натрапіў я на цудоўную кніжку жыдоўскага гумару, апрацаванага Гарацыем Сафрынам. Было гэта колькі гадоў таму й настрой тады, як і цяпер, штораз псаваўся разам з праглядам сэсіі беларускага парлямэнту. Душа прагнула «кантэксту» іншага, але каб і ня надта далёкага ад Бацькаўшчыны. А што магло быць далей ад беларушчыны па сутнасьці й бліжэй да яе ў гістарычнай прасторы, як не жыдоўскі гумар з кніжкі Сафрына? І я пачаў перакладаць.

Колькі дзён таму я адшукаў свае тагачасныя крэмзалі, прагледзеў вечаровы «Дзёньнік сэсіі» й вырашыў завяршыць пачатае. А нараніцу, завіхаючыся з рамонтам кватэры, у якую нядаўна ўлез прымаком, пад ліштваю на кухні знайшоў клад — срэбную манэту XVI стагодзьдзя. Падзея, пагадзіцеся, досыць незвычайная для панэльнага дому. Калі ж высьветлілася, што да нас у кватэры жыла вялікая жыдоўская сям'я, зразумеў, што гэтая манэта — мой ганарар за завершаны напярэдадні пераклад, які я й прапаную чытачам.

Вадзім Гліньнік

* * *

Размова двух жыдоў:

— Чуеш, Бэраль, як надыйшоў крызыс, перастала мне тут падабацца. Хачу ехаць у Амэрыку.

— А ангельскую мову ведаеш?

— Ой!

— Дык гэта ж па-француску!

— Што ты кажаш? Дык я ведаю яшчэ й францускую мову?

* * *

Двое жыдоў сядзяць у купэ ў цягніку.

Пасьля хвілі маўчаньня й асьцярожлівага назіраньня адзін зьвяртаецца да другога:

— Перапрашаю, скуль вы паходзіце?

На гэта запытаньне:

— Паходжу з Горадні, жыву ў Вільні й еду ў Лодзь. Заробкі чэрпаю з малое крамкі нюрэнбэрскіх тавараў. Завуць мяне Абрагам, прозьвішча маё Кац, але ў нашым горадзе называюць мяне Аўрэймэл. Я ня бедны, ні багаты. Маю двух сыноў, абодва жанатыя. Маю тры дачкі: адна ўжо замужняя, другой нядаўна выправілі заручыны, а трэцюю акурат сватаю... Да цадзіка ня ежджу, кніжак не чытаю, новых інтарэсаў не шукаю, табакі не ўжываю, гарэлкі ня п'ю, у карты не гуляю, палітыкай не займаюся. Калі вы паліце — калі ласка, вось запалкі. Во там на паліцы мой капялюш — вы можаце яго прымераць. Гэта нібыта ўсё... Калі, крый Божа, пра што-небудзь забыўся, дык пасьпяшайцеся з пытаньнямі, бо я хацеў бы трошкі падрамаць.

* * *

У купэ ідзе размова пра вядомых людзей: ля вакна сядзіць жыдоўскі інтэлігент і штохвіліны робіць кароткія заўвагі адносна паходжаньня асобаў.

— Замэнгоф...

— Жыд.

— Сьпіноза...

— Жыд.

— Калюмб...

— Маран, выхрышчаны гішпанскі жыд.

— Міцкевіч...

— Меў матку нэафітку.

Дама, што сядзіць побач, ускрыквае з абурэньнем:

— Езус, Марыя!

— Таксама жыды!..

* * *

У сінагозе літоўскага мястэчка аднаго вечара йдзе жвавы дыспут на тэму змрочных пэрспэктываў зямнога існаваньня...

— Ат, ведаеце такога віленскага міліянэра як Апатаў. Мае прыгожы дом, экіпаж, службы й пекную дачку Эстэр. Ай, якая яна пекная! Ну й што з таго? Мусіць памерці, як кожны з нас... Раней ці пазьней усе спаткаемся на могілках.

— Я, — паведамляе рэзьнік, — я хацеў бы пасьля сьмерці ляжаць каля вялікага талмудыста, рэб Эзэхіэля.

— А я, — мовіць урачыста кантар, — хацеў бы, каб я быў пахаваны побач з труной Гаона.

— А я, — уздыхае Моткэ, — хацеў бы ляжаць абок Эстэры Апатаў...

— Ты што, ашалеў? — абарвалі яго жыды. — Яна ж яшчэ зусім жывая!

— Вось менавіта.

НЯМЕЦКАЕ АПАВЯДАНЬНЕ

Працяг са старонкі 13

яшчэ адну філіжанку для барадатага пана, якога яна без сумненьня й без недаверу палічыла за новага сябра дому. Халадновата тут, падумаў Ізідор, адкасваючы рукавы. Дзеці ўпіваліся радасьцю, атрымаўшы дазвол пагуляць з трапічным шаломам, што, вядома, не адбывалася бяз сваркі; а калі падалі каву, наступіла поўная ідылія: нядзельны ранак са званамі й торт з нагоды дня нараджэньня. Што яшчэ трэба было Ізідору! Не зьвяртаючы ўвагі на новую служанку, якая паклала яшчэ адзін прыбор, Ізідор пацягнуўся да жонкі. «Ізідор!» — сказала яна й не змагла наліць каву, таму гэта мусіў зрабіць сам барадаты госьць. «Што?» — спытаў ён пяшчотна, напаўняючы ейную філіжанку. «Ізідор!» — сказала яна ледзь ня плачучы. Ён абняў яе. «Ізідор, — спытала яна, — дзе ты быў так доўга?» Муж, як аглушаны, паставіў сваю філіжанку; ён ужо адвык быць жанатым, ён стаў перад кустом ружы, засунуўшы рукі ў кішэні порткаў. «Чаму ты ніколі не напісаў хаця б паштоўку?» — спытала яна. Ён моўчкі забраў у зьбянтэжаных дзяцей трапічны шалом, кароткім прывычным рухам надзеў яго на галаву, што павінна было запомніцца дзецям на ўсё іхнае жыцьцё: татка з трапічным шаломам і кабурой з пісталетам; усё ня толькі сапраўднае, але й крыху паношанае ад ужытку, і калі жонка сказала: «Ведаеш што, Ізідор, табе сапраўды нельга было так рабіць!», Ізідору ўжо было дастаткова цёплага вяртаньня дамоў, ён выцягнуў (зноў, я думаю, кароткім прывычным рухам) з кабуры пісталет і тры разы стрэліў у сярэдзіну мяккага, упрыгожанага ўзьбітай цукровай пенай тарта, што, як можна сабе ўявіць, было значным сьвінствам. «Ах, Ізідор!» — крыкнула жонка, бо яе пэньюар быў увесь заплюханы, і калі б нявінныя дзеці не былі сьведкамі, яна палічыла б гэты візыт, які, зрэшты, наўрад ці працягваўся больш за дзесяць хвілінаў, галюцынацыяй. Абкружаная сваімі пяцьцю дзяцьмі, падобная да Ніёбы, яна яшчэ заўважыла, як Ізідор, чалавек безадказны, спакойным крокам пайшоў праз садовыя весьнічкі, зь недарэчным трапічным шаломам на галаве. Пасьля таго шоку яна ніколі не магла глядзець на торт, ня згадваючы пра Ізідора, што рабіла яе вартай спагады; яна мела пару вачэй, а дакладней, каля трыццаці шасьці вачэй за сьведкаў, і ёй параілі падаць на развод. Але мужная жанчына ўсё яшчэ спадзявалася. Ёй было абсалютна ясна, хто вінаваты, і яна спадзявалася на раскаяньне, яна жыла цалкам дзеля сваіх пецярых дзяцей, якія паходзілі ад Ізідора, і яна яшчэ на год, як тая Пэнэлопа, выгнала маладога адваката, які наведваўся да яе не без асабістай зацікаўленасьці й падштурхоўваў яе да разводу. І сапраўды, калі праз год зноў быў дзень нараджэньня, Ізідор вярнуўся, сеў, прывітаўшыся, як заўсёды, адкасаў рукавы й дазволіў дзецям зноў пагуляць з трапічным шаломам, аднак гэтым разам іх радасьць ад прыходу таткі не працягвалася й тры хвіліны. «Ізідор, — сказала жонка, — дзе ты зноў быў?». Ён устаў, не страляючы, дзякуй богу, і не вырываючы ў нявінных дзяцей трапічны шалом, не, Ізідор толькі падняўся, зноў закасаў рукавы й пайшоў праз садовыя весьнічкі, каб ніколі не вярнуцца. Іск аб разводзе бедная жонка падпісала не бязь сьлёз; паколькі Ізідор не зьявіўся ў акрэсьлены законам час, аптэка ягоная была прададзеная, другі шлюб быў крыху скрытны, пацьверджаны пасьля заканчэньня часу, акрэсьленага законам, загсам, карацей, усё пацякло згодна з парадкам, што было вельмі важна для дзяцей. Адказу, дзе татка праводзіць рэшту свайго жыцьця, ніколі не было. Не было й ніводнай паштоўкі. Маці не хацела, каб дзеці пра гэта пыталіся; ёй жа ніколі нельга было пытацца пра гэта ў таткі.

Зыгфрыд Ленц

НОЧ У ГАТЭЛІ

Начны парцье правёў пальцамі з абгрызенымі пазногцямі па сьпіску, са спачуваньнем паціснуў плячыма, павярнуў сваё тулава ўлева, і тканіна ягонай форменай вопраткі небясьпечна напялася пад пахай.

— Гэта адзіная магчымасьць, — сказаў ён. — У такі позьні час вы нідзе не атрымаеце асобны пакой. Вядома, вы можаце папытацца ў іншых гатэлях. Але я ўжо цяпер магу вам сказаць, што, калі вы нічога ня знойдзеце й вернецеся, мы ня зможам дапамагчы вам. Бо вольны ложак у двухмясцовым пакоі, які вы — ня ведаю, зь якой прычыны — ня хочаце ўзяць, знойдзе ўжо да гэтай пары іншага.

— Добра, — сказаў Швам, — я вазьму ложак. Толькі я хацеў бы ведаць — і пэўна, вы гэта зразумееце — з кім мне давядзецца дзяліць пакой; не з асьцярожнасьці, барані Бог, не, бо мне няма чаго баяцца. Ці мой кампаньён — людзі, зь якімі правядзеш адну ноч, ужо называюцца кампаньёнамі — ужо там?

— Так, ён ужо там і сьпіць.

— Сьпіць, — паўтарыў Швам, папрасіў рэгістрацыйны блянк, запоўніў яго і ўручыў парцье; пасьля пайшоў наверх.

Убачыўшы дзьверы з названай яму лічбай, Швам міжволі прыцішыў крок, стаіў дыханьне з надзеяй пачуць слабы шум, які мог сыходзіць ад незнаёмца, і нахіліўся да дзіркі замка. У пакоі было цёмна. У гэты момант ён пачуў, што нехта падымаецца па лесьвіцы, і мусіў дзейнічаць. Безумоўна, ён мог пайсьці прэч, мауляў, памыліўся ў калідоры. Іншая магчымасьць заключалася ў тым, каб увайсьці ў пакой, у які ён накіраваны, і ў адным з ложкаў якога ўжо спаў мужчына.

Швам націснуў клямку. Ён зачыніў дзьверы й далянёю пачаў шукаць уключальнік. І раптам зьнерухомеў: побач — ён адразу зразумеў, што тут павінны стаяць ложкі — нехта сказаў прыглушаным, але энэргічным голасам:

— Стоп! Не запальвайце, прашу вас, сьвятло. Вы зрабілі б мне ласку, калі б пакінулі пакой у цемры.

— Вы чакалі мяне? — спалохана спытаўся Швам, але адказу не атрымаў. Замест гэтага незнаёмы сказаў:

— Не спатыкніцеся аб мае мыліцы й пільнуйце, каб ня ўпасьці на маю валізку, якая стаіць прыблізна пасярэдзіне пакоя. Я накірую вас да вашага ложка: прайдзіце тры крокі ўздоўж сьцяны, пасьля павярніцеся налева і, зрабіўшы яшчэ тры крокі, вы зможаце дакрануцца да сьпінкі ложка.

Швам паслухаўся: дайшоў да свайго ложка, распрануўся й сьлізгануў пад коўдру. Ён чуў, як той дыхае, і адчуваў, што не засьне.

— Увогуле, — сказаў ён нерашуча, — мяне завуць Швам.

— Ага, — сказаў той.

* * *

Выхрышчаны банкір Разэнблюм заручыў сына з дачкою нэафіта Кона.

— Заўсёды жадаў сабе такога зяця, — зьвяртаецца Кон да прыяцеляў. — Сымпатычнага хрысьціянскага юнака з добрага жыдоўскага роду.

* * *

— Пане Ліпа! — абураецца банкір. — Як вы насьмеліліся прызнацца ў каханьні маёй дачцы?! Вы ня маеце ані інтарэсу, ані пасады, ані нават грошай!

— Так... Але маю віды...

— Што? Віды? У такім разе пану патрэбная лярнэтка, а не мая дачка!

* * *

Да «караля цукру», знанага мульціміліянэра Бродзкага заявіўся аднаго дня малады жыд.

— Пане Бродзкі, маю для вас інтэрас, заробім адразу па трыста тысяч рублёў...

— Трыста тысяч рублёў, — заўважае Бродзкі, — гэта ладная сумка! Дужа ладная! Што за інтэрас?

— Чуў, што абяцалі вы сваёй старэйшай дачцы шасьцьсот тысяч пасагу, а я гатовы ўзяць яе за трыста тысяч.

* * *

У царскай Расеі былі нялюдзкія правілы, якія забаранялі жыдам жыць і нават знаходзіцца ў вялікіх местах. Тыя прадпісаньні ня тычыліся адно найбагацейшых купцоў, прамыслоўцаў дый выдатных спэцыялістаў.

Спраўнік у паліцэйскім участку бэсьціць жыда-камівояжора:

— Паводле якога права, ня маючы дазволу на знаходжаньне, бадзяесься па Пецярбургу?

— Нашто ваша мосьць падымае такую галгатню? — стрымлівае яго жыд. — Я ж прыехаў інкогніта.

* * *

У царскай арміі капрал экзамэнуе салдата жыда.

— Скажы мне, для чаго патрэбны карабін?

— Карабін? Для страляньня, барані Божа!

* * *

Агент зь Беластоку адведвае лодзьскага гуртаўніка.

— З вашага дазволу, гэта вось узоры розных тэкстыльных тавараў.

— Ня маю патрэбы.

— Прашу зірнуць толькі на гэтыя пекныя паркалі!

— Маю досыць на складзе.

— І пёры ёсьць добрыя...

— Пакінь мяне ў спакоі!

Паколькі дыялёг ня мае канца, раздражнёны купец выстаўляе нахабніка за дзьверы.

Праз колькі хвілінаў агент вяртаецца ў краму й кажа:

— Такім чынам, справы тэкстыльных тавараў агаварылі дарэшты. Цяпер, з дазволу шаноўнага пана, задэманструю ўзоры тавараў галянтарэйных.

* * *

Хаім, які лічыўся за чалавека музыкальнага, купіў білет да філярмоніі. Спазьніўся аднак на канцэрт і мусіць чакаць за дзьвярмі. Напружваючы слых, пытаецца ў білецёркі:

— Выбачайце, калі ласка, а што там зараз грае?

— Дзявятая сімфонія Бэтховэна.

— У-ва! — ускліквае зьмярцьвелы «мэляман». — Ужо восем сымфоній адыгралі.

* * *

Выпала так, што пад час антысэміцкіх хваляваньняў у Магілёве рэзьнік Хаім Рывэс пабіў аднаго з нападнікаў. Паліцыя арыштавала яго, і неўзабаве запальчывы жыд стаяў перад карным трыбуналам.

Судзьдзя, складаючы агульныя выдаткі, задае пытаньне:

— Ці служылі ў войску?

— Не, ваша вяльможнасьць.

Абаронца справядлівасьці кусьліва:

— А што ж рабілі ў тысяча дзевяцьсот пятым годзе?

— Выбачайце, ваша вяльможнасьць, а што тады было?

— Як гэта што? Расейска-японская вайна!

Рэзьнік, трохі счакаўшы:

— Выбачайце, а што ваша вяльможнасьць рабіла ў тысяча васемсот дзевяноста чацьвертым годзе?

— А што тады было? — дзівіцца судзьдзя.

— Як гэта што? Ваша вяльможнасьць ня ведае? Эпідэмія халеры...

Пераклад зроблены паводле выданьня: Horacy Safrin. Przy szabasowych świecach. — Łódź, 1976.

— Так.
— Вы прыехалі на кангрэс?
— Не. А вы?
— Не.
— Гандлёвыя справы?
— Не, не сказаў бы.

— У мяне, мабыць, самая дзіўная нагода, дзеля якой чалавек паехаў бы ў горад, — сказаў Швам.

На блізкай станцыі манэўраваў цягнік. Зямля трэслася, а ложкі, на якіх ляжалі мужчыны, вібравалі.

— Вы хочаце ўчыніць у горадзе самагубства? — спытаўся ён.

— Не, — адказаў Швам. — А што, я выглядаю на такога?

— Я ня ведаю, як вы выглядаеце, — сказаў той. — Цёмна ж.

Швам пачаў тлумачыць з баязьлівай радасьцю ў голасе.

— Божа барані, не. У мяне ёсьць сын, пане... (той не назваў свайго імя), малы хлапчук, дзеля яго я й прыехаў сюды.

— Ён у шпіталі?

— Чаму? Ён здаровы, крыху бледнаваты, што праўда, але ўвогуле здаровы. Я хацеў вам сказаць, чаму я тут, з вамі, у гэтым пакоі. Як я ўжо казаў, усё зьвязана з маіх хлопцам. Ён надзвычай уражлівы, як мімоза, ён рэагуе нават тады, калі на яго падае цень.

— Дык ён, значыцца, ўсё ж такі ў шпіталі.

— Не, — усклікнуў Швам, — я ж ужо сказаў, што здаровы ва ўсіх адносінах. Аднак ён знаходзіцца ў небясьпецы, у гэтага хлапчука крышталёвая душа, і таму ён падвергнуты гэтай небясьпецы.

— Чаму ён ня ўчыніць самагубства? — спытаў той.

— Паслухайце, дзіця, як ён, нясьмелае, у такім узросьце! Чаму вы так гаворыце. Не, мой хлапчук знаходзіцца ў небясьпецы вось чаму: кожнага ранку, ідучы ў школу — дарэчы, ён ходзіць туды адзін — дык вось, кожнага ранку ён павінен затрымацца ля чыгункі й пачакаць, калі пройдзе ранішні цягнік. Ён стаіць там, малеча, і махае рукою, махае моцна, дружалюбна й адчайна.

— Ну, і?

— Пасьля, — сказаў Швам, — ён ідзе ў школу, а калі вяртаецца дамоў, дык увесь растрэсены й анямелы, а часам дык і плача. Ён ня ў стане рабіць свае хатнія заданьні, ён ня можа гуляць, гаварыць, і гэтак ужо цягнецца месяцамі, кожны божы дзень. Хлопец дойдзе да ручкі.

— А што штурхае яго да такіх паводзінаў?

— Бачыце, — сказаў Швам, — гэта дзіўная справа. Хлопец махае, а паколькі ён выглядае такім маркотным, — ніхто з падарожных не махае яму ў адказ. І гэта ён бярэ так блізка да сэрца, што мы — мая жонка й я — вельмі баімся. Ён махае, а ніхто не махае яму ў адказ; безумоўна, нельга падарожных прымусіць да гэтага, і было б сьмешна й недарэчна выдаць нейкае распараджэньне адносна гэтага, але...

— І вы, пан Швам, хочаце дапамагчы сыну: сесьці ў ранішні цягнік, каб памахаць малому?

— Так, — сказаў Швам, — так.

— Мяне, — сказаў незнаёмы, — дзеці ўвогуле не калышуць. Я ненавіджу й пазьбягаю іх, бо праз іх я страціў жонку. Яна памерла падчас першых родаў.

— Спачуваю вам, — сказаў Швам і прыўзьняўся ў ложку, абапіраючыся на локці. Прыемная плынь пацякла па ягоным целе, ён адчуў, што цяпер мог бы заснуць.

Той сказаў:
— Вы едзеце ў Курцбах, ці ня так?
— Так.

— І ніякія думкі не прыходзяць вам у галаву ў сувязі з тым, што вы хочаце зрабіць? Кажучы шчыра — ці вы не саромеецеся, што ашукаеце свайго хлопца? Бо тое, што вы зьбіраецеся зрабіць — і вы мусіце гэта прызнаць — падман чыстай вады, ашуканства.

Швам сказаў з абурэньнем:

— Што вы сабе дазваляеце? Як вы да гэтага даўмеліся?!

Ён лёг, нацягнуў на галаву коўдру, нейкі час ляжаў і думаў, пасьля заснуў.

Прачнуўшыся раніцою, ён заўважыў, што быў у пакоі адзін. Паглядзеў на гадзіньнік і спалохаўся: да ад'езду ранішняга цягніка заставалася толькі пяць хвілінаў, і тое, што ён на яго пасьпее, было цалкам выключана.

Апоўдні — ён ня мог дазволіць сабе застацца ў горадзе яшчэ на адну ноч — Швам, прыгнечаны й расчараваны, вярнуўся дамоў.

Сын адчыніў яму дзьверы шчасьлівы й радасны. Ён з крыкам кінуўся да бацькі:

— Адзін памахаў, адзін махаў вельмі доўга.

— З мыліцамі? — запытаўся Швам.

— Так, з палкай. Урэшце ён прывязаў да палкі насоўку, высунуў яе праз вакно й трымаў, пакуль я мог бачыць.

Пэтэр Гандкэ

ЗЬМЕНЫ НА ПРАЦЯГУ ДНЯ

Пакуль я яшчэ адзін, я яшчэ адзін.
Пакуль я сярод знаёмых, я яшчэ знаемы.
Як толькі я апынуся сярод незнаёмых...

Як толькі я выходжу на вуліцу — на вуліцу выходзіць мінак.
Як толькі ўваходжу ў трамвай — у трамвай уваходзіць пасажыр.
Як толькі я заходжу ў ювэлірную краму — у ювэлірную краму заходзіць пан.
Як толькі я штурхаю ў супэрсаме вазок для пакупак — вазок для пакупак у супэрсаме штурхае пакупнік.
Як толькі я заходжу ва ўнівэрмаг — ва ўнівэрмаг заходзіць той, хто жадае купіць.

Пасьля я йду міма дзяцей — і дзеці бачаць дарослага, які йдзе міма іх.
Пасьля я пераступаю забароненую зону — і вартаўнік бачыць непажаданага, які пераступае забароненую зону.

Пасьля я бачу ў забароненай зоне дзяцей, якія ўцякаюць ад мяне, — і я раблюся вартаўніком, ад якога ўцякаюць дзеці, бо яны ў забароненай зоне непажаданыя.
Пасьля я сяджу ў прыёмных як прасіцель.
Пасьля я пішу сваё прозьвішча на капэрце як адпраўшчык.
Пасьля я запаўняю чэк як апантаны ад шчасьця заступнік.

Як толькі ў мяне пытаюцца пра «Чорную Дарогу» — я станаўлюся вытлумачвальнікам месцазнаходжаньня.
Як толькі я пасьля бачу неверагоднае — я раблюся сьведкам.
Як толькі я заходжу ў царкву — я раблюся авечкай.
Як толькі я пасьля, бачачы няшчасны выпадак, спыняюся — я раблюся цікаўным.
Як толькі я пасьля ня ведаю «Чорную Дарогу» — я зноў той адзін, які ня ведае «Чорную Дарогу».

Калі я пасьля ем — я магу ўжо сказаць: мы, спажыўнікі!
Калі ў мяне пасьля штосьці крадуць — я магу ўжо сказаць: мы, уласьнікі!
Калі я пасьля выказваю спачуваньне — я магу ўжо сказаць: мы, сваякі ў смутку!
Калі я пасьля разглядаю космас — я магу ўжо сказаць: мы, людзі!

Я чытаю раман у ілюстраваным часопісе — і я адзін зь мільёнаў.
Я не выконваю свае абавязкі перад начальствам — і я ўжо грамадзянін.
Я не ўцякаю, калі зьбіраецца натоўп — і я ўжо бунтар.
Я адрываюся ад раману й разглядаю прыгажуню насупраць мяне — і мы ўжо двое сярод мільёнаў.

Пасьля хтосьці не выходзіць зь цягніка — хтосьці? — Падарожны.
Пасьля хтосьці гаворыць без акцэнту — хтосьці? — Грамадзянін гэтай дзяржавы.
Пасьля хтосьці мае візаві — і становіцца візаві.
Пасьля хтосьці не гуляе ўжо больш сам з сабой — і становіцца праціўнікам.
Пасьля хтосьці ў пакоі становіцца старэйшым пакою.
Пасьля хтосьці вылазіць з куста ў парку і становіцца падазроным суб'ектам.
Пасьля хтосьці, пра каго ідзе гаворка, становіцца прадметам гаворкі.
Пасьля хтосьці апазнаны на здымку — становіцца Х-ам.
Пасьля хтосьці прахаджаецца па адвольнай мясцовасьці — хтосьці? — Турыст.

Калі потым перада мною гамус машына — я перашкода.
Пасьля аб мяне спатыкаюцца — і я станаўлюся целам.
Калі пасьля на мяне наступаюць — я штосьці мяккае.
Пасьля мяне ў нешта закручваюць — і я раблюся зьместам.
Пасьля распазнаюць, што па палявой дарозе прабег нехта босы, і што праўшун, здаецца, стрэліў, і што тут ляжаў адзін з групай крыві 0, і што я, мяркуючы па ўбогасьці выгляду, павінен быць чужынцам.
Як толькі мяне пасьля клічуць — пакліканы на вокліч не затрымліваецца.
Як толькі я пасьля знаходжуся даволі далёка ад назіральнікаў — аб'ект ужо толькі пункт.
Як толькі я пасьля ў якасьці назіральніка клічу кагосьці — я для пакліканага ўжо страх.

Пасьля, урэшце, я сустракаю знаёмага — і двое знаёмых сустракаюць адзін аднога.
Пасьля, урэшце, мяне пакідаюць аднаго — і адзін застаецца адзін.
Пасьля, урэшце, я адзін — і адзін ўжо сам-насам.
Пасьля, нарэшце, я сядаю да аднаго ў траву — і ўрэшце я другі.

Пераклаў зь нямецкай
Уладзіслаў Струміла

ПАЛЯТУХА

«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!

Аснову лясоў Новае Зэляндыі складаюць так званыя кауры (ня блытаць з малюскамі). Кауры (Agathis) — адзін з галоўных відаў прамысловае драўніны ў Паўдзённым паўшар'і. Гэтае дрэва сягае ў вышыню больш за трыццаць мэтраў і мае больш за дзесяць мэтраў у абхопе. Ёсьць кауры, якія стаяць шмат стагодзьдзяў, а на высьпе Карамандэль ёсьць дрэва-волат, якому даюць аж дзьве тысячы гадоў. Простыя й трывалыя камлі кауры здавён выкарыстоўваліся для будовы марскіх суднаў.

У нетрах кауравых лясоў, пад самымі вершалінамі магутных дрэваў жыве зьвер — лятун (Petauroidis volans). Гэта адзіная сумчатая форма лятучых вавёрак. Калі лятун пераскоквае з дрэва на дрэва, ён расстаўляе свае лапы, утвараючы прастакутнік з складкаў скуры, і лёгка пляніруе ў паветры. Свой палёт гэты немалы зьвер (да 50 см у даўжыню) карэктуе доўгім голым хвастом. Лятун мае доўгае мяккае футра розных афарбовак, але звычайна яно чорна-бурае, лятальная перапонка пакрытая жаўтавата-белымі плямкамі, а трыбушок наагул белы. Хвост чорны.

Актыўны лятун уначы, а дзень ён праводзіць у дрымоце. Па начох гэтая спрытная й хуткая істота дэманструе сапраўдныя дзівосы акрабатыкі. Каму пашчасьціла падгледзець летуна ўначы, той можа завагацца ў сваіх уяўленьнях пра фізычныя законы, настолькі лёгкім і грацыёзным здасца палёт бяскрылага зьвера.

Абарыгены-маоры ўжываюць мяса летуна, лічыцца, што яно вельмі смачнае. Але здабыць гэтую жывёліну на велізарнай вышыні яе жыхарства зусім няпроста. Вось чаму летуноў вельмі шмат у дрымучых лясох.

У адрозьненьне ад свайго новазэляндзкага брата, беларуская палятуха (Pteromis volans) — звычайны сысун з атраду грызуноў Rodentia. Але падабенства паміж імі надзвычайнае. Гэтаксама як і ў летуна, лапы палятухі злучаныя між сабою лятальнаю перапонкай, якая служыць ім як парашут. Але йснуюць паміж імі й істотныя адрозьненьні (апроч таго, вядома, што яны ўсё ж з розных атрадаў). Па-першае, палятуха ў тры разы меншая за летуна (усяго 16 см). Па-другое, яе хвост пушысты, як у вавёркі. Як і лятун, палятуха жыве пераважна ў высокіх старых лясох. Але ў Беларусі яна жыве ў лясох бярозавых, альбо — з абавязковым дамешкам бярозы. Яна гэтаксама сілкуецца ўначы, удзень адпачывае, а ўсю зіму наагул сьпіць. Перад зімой буравата-жоўтая ядвабная поўсьць палятухі робіцца срабрыста-сівая зь цёмнаю рабізною. У гэты час палятухі булуюць сабе шарападобныя гнёзды з сухога лісьця, кары, імху. Адразу з прыходам вясны тут нараджаюцца 2-4 дзіцяткі. Ужо на шосты тыдзень жыцьця яны зусім самастойныя, але ўсё ж праводзяць з маткай адну зіму.

Сілкуецца маленькая жывёла амаль выключна па-вэгетарыянску, пералятаючы з дрэва на дрэва ўсю летнюю ноч.

Паялтуха амаль ня мае ворагаў у прыродзе (летуны іх ня маюць наогул), ды й чалавек на яе не палюе: што возьмеш са зьвера, які ў два разы меншы за вавёрку і важыць усяго 100-120 грамаў? І тым ня менш, нягледзячы на свой шырачэзны арэал (ад Атлянтыкі да Ціхага акіяну ў паўночных краях), палятуха паўсюль стала рэдкасьцю. Прычына ў празьмернай высечцы старых лістоўных лясоў. Гэты зьвярок ужо даўно значыцца ў самых розных чырвоных кнігах.

У Беларусі да падзелаў Рэчы Паспалітай палятуха была самым звычайным паўсюдным відам. Але з XIX ст. яе колькасьць пачала рэзка зьмяншацца з той самай прычыны масавае высечкі лясоў на вываз. У 1920-я гады палятухі яшчэ вяліся ў закутках Віцебскай і Магілёўскай абласьцей, але за гады савецкае ўлады ім удалося выжыць толькі ў Лёзьненскім раёне.

На жаль, нашы дзеці ня могуць пабачыць гэтага зьвярка, як і шмат чаго іншага, што некалі было ў Беларусі.

H.S.



Здымак Алены Адамчык

Падпіска на «НАШУ НІВУ» — на кожнай пошце. Індэкс 63125

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Тамашу С. і іншым. Вершы сырыя. Калі вы спрабуеце свае сілы ў паэзіі, дык дайце сабе працу давесьці ўсё да ладу, перш чым дасылаць у рэдакцыю. Толькі тады можна вызначаць — добрыя вершы, ці кепскія. Калі ж вы дасылаеце чарнавікі, то ацэнка будзе толькі такая: нешта з гэтага можа атрымацца. А можа й не атрымацца.

Р.Р. з Баранавічаў. У апавяданьні магчымы цікавы сюжэт. У тым варыянце, які мы маем, ёсьць толькі ідэя, якую вы ўрэшце разгалінавалі, раздрабілі... Вершы чарнавыя.

Алесю Ш. зь Менску. «Партрэт» атрымаўся такі, як малююць на ўроках школьніцы: беленькі тварык, сінія вочкі, шчочкі, носік, вусны, як сунічкі... Але дзяўчынкі-падлеткі малююць прынцэсу, а не *драму*, таму пра іх ня скажаш, што яны сюсюкаюць.

В. з Наваполацку. Ёсьць сюжэты, але мова нішчымная, штампаваная (напрыклад, «твар як печаны яблык»), дзяжурная (езьдзіў на сваім старэнькім «рэно»; прапусьціўшы колькі чарачак кальвадасу; дзіўныя сваёй прыгажосьцю песьні...). «Аналітыкі» ад гэтага прападаюць зусім. Другое апавяданьне ратуе фактура. Паспрабуйце перапісаць яго бяз штампаў.

Дзьмітрыю Б. зь Менску. Дзякуй за пытаньні і ўвагу. 1. Старыя нумары «НН» (некаторыя) яшчэ можна атрымаць у рэдакцыі ў Менску. 2. Роспавед пра віленскія помнікі мы мяркуем працягваць пры часьцейшай пэрыядычнасьці. 3. Пэрыядычнасьць мусіць быць часьцейшая, бо гэта ўмова разьвіцьця газэты, большая аўдыторыя, больш аўтараў. Магчыма, «НН» стане тыднёвікам ужо налета. 4. З раману "Вядзьмарка і дождж» мы падкрэсьлена друкавалі самы цнатлівы ўрывак, цалкам раман не перакладаўся. «Боскую камэдыю» мы друкуем па меры яе перакладу, гэта жывая справа. Пра збор твораў Эдгара По мы пісалі — рыхтуецца, а не «выдадзены». Пакуль зробленая прыблізна трэць аб'ёму. 5. Што да правапісу, то нам патрэбны адзіны правапіс, і мы разам зь іншымі выданьнямі, якія пішуць тарашкевіцай, ня раз прапаноўвалі прадстаўнікам афіцыйнага правапісу правесьці нараду й прыняць адзіны кампрамісны варыянт. Але той бок маўчыць.

Фундатары «НН»:

МП «Адліга» (Віцебск) — 10 тыс. руб.

КФ «Белліткам» (Маладэчна) — 1 млн. руб.

Л.Стагановіч і Б.Даніловіч (ЗША) — $ 100

М.Банькоўскі-Цюліг (Швэйцарыя) — $ 50

Вялікі дзякуй.

НАША НІВА №7(25) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Заснавальнік і выдавец Павал Жук. Адрасы для допісаў: 220123 Менск, а/с 71 і 2041 Вільня, а/с 2082. Падпісны індэкс на Беларусі 63125, у Літве 67233. Рэдакцыя (Менск, Іванаўская 56 альбо Вільня, Жыгімонта 12/2): Алег Дзярновіч (адк. сакратар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар), Андрэй Антонаў (набор). Афсэтны друк. Фармат А3. Агульны наклад 20 тыс. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, пр. Скарыны, 79). Кошт паводле дамоўленасьці. Падпісана ў друк 25VII93 Замова 1225